Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 КРАСАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 79
(26437)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Радасць творчасці і стварэння

Паважаныя суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са Святам працы.

Дзень Першамая даўно ўвайшоў у наша жыццё, сімвалізуючы радасць творчасці і стварэння.

Беларуская зямля заўсёды славілася таленавітымі і адказнымі людзьмі. Сучаснае пакаленне дастойна прадаўжае слаўныя традыцыі сваіх продкаў.

Асновай матэрыяльных даброт і духоўнага багацця для кожнага чалавека была і застаецца плённая праца, якая з'яўляецца рухаючай сілай прагрэсу цывілізацыі. І сёння ад эфектыўнасці работы і самааддачы кожнага з нас залежыць будучае дзяцей і ўнукаў.

Сумесна мы пераадолеем усе перашкоды і дасягнём новых поспехаў у развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы, зробім яшчэ больш цудоўным наш агульны дом — родную Беларусь.

Жадаю вам міру, шчасця, моцнага здароўя і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У НАС ВЯЛІКАЯ ЦІКАВАСЦЬ ДА ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ ДЫЯЛОГА ПА ЛІНІІ БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАСАЮЗ»

У нашай краіны ёсць вялікая цікавасць да далейшага развіцця дыялога па лініі Беларусь — Еўрасаюз. Разам з тым, прынцыповая пазіцыя дзяржавы застаецца нязменнай: Беларусь даражыць сваімі галоўнымі партнёрамі — Расіяй і Еўрасаюзам і не мае намеру адмаўляцца ад супрацоўніцтва з адным, каб дагадзіць другому. Такую пазіцыю Беларусі выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, знаходзячыся 26-28 красавіка з візітам у Італьянскай Рэспубліцы і Дзяржаве Ватыкан.

Фота БЕЛТА.

Беларусь і Ватыкан задаволены развіццём двухбаковага супрацоўніцтва і зацікаўлены ў актывізацыі ўзаемадзеяння ў розных сферах. Гэта было пацверджана 27 красавіка ў Ватыкане ў ходзе гутаркі Прэзідэнта Беларусі з духоўным кіраўніцтвам Рымска-каталіцкай царквы. У першай палавіне дня Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Папам Рымскім Бенедзіктам XVI, пазней адбыліся перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з Дзяржсакратаром Яго Святасці Папы Кардыналам Тарчызіо Бертоне.

Размова Прэзідэнта і Пантыфіка праходзіла ў Папскай бібліятэцы Апостальскага палаца — афіцыйнай рэзідэнцыі Папы Рымскага ў Ватыкане. У парадным палацы Святога Дамаза Апостальскага палаца Ватыкана кіраўніка беларускай дзяржавы сустрэў Прэфект Святога Прастола і ганаровая варта роты швейцарскіх гвардзейцаў. Да Папскай бібліятэкі Прэзідэнт з членамі афіцыйнай дэлегацыі прайшоў праз анфіладу адзінацаці залаў.

Каля ўвахода ў бібліятэку ў Малой троннай зале Прэзідэнта сустрэў Папа Рымскі. Кіраўнік беларускай дзяржавы і Пантыфік абмяняліся кароткімі прывітаннямі, пасля чаго прадоўжылі гутарку ў Папскай бібліятэцы.

Аляксандр Лукашэнка, вітаючы Папу Рымскага Бенедзікта XVI, адзначыў, што вельмі рады гэтай сустрэчы. «Наша сустрэча зацягнулася, але нарэшце мы сустрэліся», — сказаў ён.

Гутарка Прэзідэнта і Пантыфіка доўжылася крыху больш, чым было запланавана пратаколам. У ходзе яе была закранута і тэма далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Рымска-каталіцкай царквой.

Пасля завяршэння сустрэчы Аляксандр Лукашэнка і Бенедзікт XVI абмяняліся падарункамі. Папа ўручыў памятны медаль з нагоды сустрэчы, у сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка падарыў абраз беларускага майстра.

Малодшы сын кіраўніка беларускай дзяржавы, які прысутнічаў на сустрэчы, таксама паднёс Пантыфіку свой падарунак — сярэбраную сувенірную манету «Крыж Ефрасінні Полацкай» і свой буквар. Прысутныя на гэтай сустрэчы адзначылі, што дапушчальная пратаколам прысутнасць на аўдыенцыі ў Папы Рымскага дзіцяці прыўнесла дадатковы пазітыў і асаблівую цеплыню ў гутарку і спадабалася Пантыфіку.

Развітваючыся з Папам Рымскім, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў сустрэцца ў наступны раз з Бенедзіктам XVI у Беларусі. «Калі Вы знойдзеце час, мы сустрэнемся на беларускай зямлі, калі на тое будзе воля Божая», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Затым Аляксандр Лукашэнка ў Апостальскім палацы сустрэўся з Дзяржсакратаром Яго Святасці Папы Бенедзіктам XVI Кардыналам Тарчызіо Бертоне.

Бакі выказалі ўзаемную зацікаўленасць у актывізацыі супрацоўніцтва ў такіх сферах, як навука, культура, архіўная і бібліятэчная справа, а таксама абмеркавалі падрабязнасці падпісання Беларуссю і Ватыканам пагаднення аб супрацоўніцтве.

Тарчызіо Бертоне выказаў задавальненне развіццём двухбаковых кантактаў паміж Беларуссю і Ватыканам і падзякаваў Прэзідэнту за садзейнічанне дзейнасці Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі.

У выніку праведзеных сустрэч былі абмеркаваны як перспектывы паглыблення супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Ватыканам, так і пытанні, якія датычацца міжканфесіянальнага і міжкультурнага дыялога, тэмы міжнароднага характару, звязаныя з захаваннем міру і развіццём прагрэсу чалавецтва, некаторыя ўнутраныя пытанні краіны, тэмы, якія датычацца дзейнасці каталіцкай царквы ў Беларусі.

У гэты ж дзень позна вечарам адбылася рабочая вячэра кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Італіі Сільвіо Берлусконі.

Гутарка доўжылася звыш трох гадзін — значна даўжэй, чым было запланавана, і мела вельмі канструктыўны характар.

Аляксандр Лукашэнка і Сільвіо Берлусконі адзначылі блізкасць пазіцый у вырашэнні пытанняў, звязаных з пераадоленнем наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, важнасці адказнай ролі ўрада ў рэагаванні не толькі на крызіс, але і ў падтрыманні правільнага эканамічнага і сацыяльнага асяроддзя ў дзяржаве.

Вялікая ўвага была ўдзелена таксама магчымасцям развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў. З італьянскага боку была выказана шчырая цікавасць да магчымасцяў інвеставання ў Беларусь. Гэта тэма была ініцыявана Сільвіо Берлусконі, і ў падчас сустрэчы быў перададзены цэлы пакет інвестпрапаноў італьянскаму ўраду.

Абмяркоўвалася міжнародная тэматыка, у тым ліку і ўдзел Беларусі ў ініцыятыве «Усходняе партнёрства».

«У нашай краіны ёсць вялікая цікавасць да далейшага развіцця дыялога па лініі Беларусь — Еўрасаюз, — сказаў Прэзідэнт. — Мы настойваем на спрашчэнні візавага рэжыму і змяншэнні кошту візаў для беларусаў, прапануем выгаднае супрацоўніцтва ў галіне інвестыцый, перспектыўныя праекты ў прамысловасці, энергетыцы і банкаўскай сферы, імкнёмся паўней і з выгадай для ўсіх выкарыстоўваць свой транзітны патэнцыял. Ёсць немалая цікавасць да супрацоўніцтва ў гуманітарнай і навуковай сферах. У Беларусі ўважліва вывучаецца вопыт еўрапейскай заканатворчай дзейнасці».

Аляксандр Лукашэнка і Сільвіо Берлусконі дамовіліся, што ў бліжэйшай перспектыве можа адбыцца візіт у адказ кіраўніка італьянскага ўрада ў Мінск. Да гэтага часу будзе прапрацавана пытанне, каб папярэдне адбылася паездка ў Беларусь групы буйных італьянскіх прадпрымальнікаў.

Італія ў 2008 годзе замацавалася ў дзясятцы асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі, заняўшы сярод краін па-за СНД восьмае месца па аб'ёме тавараабароту і дзясятае — па аб'ёме экспарту. Тавараабарот у 2008 годзе склаў $1,2 млрд, павялічыўшыся на 45 працэнтаў у параўнанні з 2007 годам, пры гэтым экспарт вырас на 73,8 працэнта да $320,5 млн, без уліку нафтапрадуктаў павялічыўшыся на 21,4 працэнта (да $217,9 млн.). Па выніках студзеня-лютага 2009 года экспарт тавараў склаў $18,54 млн (46,9 працэнта ад аб'ёму паставак за аналагічны перыяд 2008 года). Галоўная прычына — рэзкае скарачэнне Італіяй закупак беларускіх металаў і металапрадукцыі, якія складаюць аснову экспарту Беларусі ў гэту краіну (66 працэнтаў паставак без уліку нафтапрадуктаў). Тым не менш па шэрагу пазіцый забяспечаны рост. Пазітыўныя тэндэнцыі дасягнуты ў гандлі паслугамі.

У Беларусі зарэгістравана 81 прадпрыемства з італьянскімі інвестыцыямі, у тым ліку 48 сумесных і 33 замежныя. Аб'ём іх статутных фондаў склаў $10 млн. З 2002 па 2007 год з Італіі паступіла $100,1 млн інвестыцый, у тым ліку $7,3 млн прамых. У 2008 годзе італьянскія інвестыцыі ў Беларусь дасягнулі $4,7 млн, пры гэтым аб'ём прамых — $3,3 млн.

У аўторак, 28 красавіка, Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з Князем і Вялікім Магістрам Суверэннага Мальтыйскага ордэна фра Мэцью Фестынгам. Сустрэча праходзіла на віле Мальтыйскага Прыярата — рэзідэнцыі Суверэннага Ваеннага Мальтыйскага ордэна. Маючы статус экстэрытарыяльнасці, Ордэн мае зямельныя ўладанні ў Італіі, Аўстрыі і Чэхіі.

Мальтыйскі ордэн падтрымлівае дыпламатычныя адносіны са 100 дзяржавамі. У 2004 годзе ён адкрыў сваё пасольства і ў Беларусі — першай дзяржаве сярод краін СНД. З сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя Мальтыйскі ордэн актыўна займаецца дабрачыннай дзейнасцю ў Беларусі, аказваючы гуманітарную дапамогу розным медыцынскім установам краіны, а з 2002 года супрацоўнічае з Беларуссю і яшчэ па адным напрамку — арганізацыі стажыровак беларускіх урачоў ва ўніверсітэцкіх клініках Бельгіі. Цяпер на стадыі ўзгаднення знаходзіцца пытанне садзейнічання дзіцячым дамам сямейнага тыпу Мінскай вобласці, якія маглі б быць пад патранатам Мальтыйскага ордэна.

Звяртаючыся да фра Мэцью Фестынга, Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа падзякаваў Мальтыйскаму ордэну за шматгранную гуманітарную місію, істотную падтрымку па мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аздараўленні дзяцей, пераснашчэнні медыцынскіх устаноў, падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў.

Аляксандр Лукашэнка і Вялікі Магістр выказалі намер вызначыць і іншыя перспектыўныя сферы супрацоўніцтва. Як падкрэсліў Прэзідэнт, новыя формы і напрамкі ўзаемадзеяння Беларусі з Мальтыйскім ордэнам дадуць магчымасць яшчэ больш умацаваць сувязі рэспублікі з краінамі Захаду ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах.

«Нашы сувязі з Мальтыйскім ордэнам уносяць істотны ўклад у развіццё і ўмацаванне міжканфесіянальнага міру і згоды ў нашай краіне, — сказаў беларускі лідар. — Гэтыя сувязі дэманструюць паважлівыя адносіны да свабоды веравызнання, умацоўваюць пазіцыі беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне».

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што адносіны паміж Беларуссю і Мальтыйскім ордэнам будуць развівацца на аснове ўзаемапавагі, прыхільнасці да агульных хрысціянскіх каштоўнасцяў. Прэзідэнт таксама дадаў, што Беларусь і Мальтыйскі ордэн маюць даўнія гістарычныя сувязі: першае аддзяленне Ордэна было заснавана ў Беларусі ў канцы XIV стагоддзя. 30 красавіка спаўняецца 13 гадоў з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносінаў паміж Беларуссю і Мальтыйскім ордэнам, які вёў актыўную дабрачынную дзейнасць у нашай краіне.

У прысутнасці кіраўніка дзяржавы і Вялікага Магістра былі падпісаны два дакументы: Пагадненне паміж Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Беларусі і Паштовай адміністрацыяй Мальтыйскага ордэна аб абмене паштовымі адпраўленнямі, а таксама Мемарандум паміж Мінскім аблвыканкамам і Пасольствам Мальтыйскага ордэна ў Беларусі аб супрацоўніцтве ў гуманітарнай сферы, уключаючы гуманітарную дапамогу. Як адзначыў Прэзідэнт, падпісанне гэтых дакументаў з'яўляецца першым крокам па фарміраванні дагаворна-прававой базы двухбаковых адносінаў.

Затым прайшло афіцыйнае снеданне ў гонар Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад імя Князя і Вялікага Магістра Суверэннага Мальтыйскага ордэна фра Мэцью Фестынга, на якім таксама прысутнічаў Дзяржсакратар Яго Святасці Папы Бенедзікта XVI Кардынал Тарчызіо Бертоне.

Перад вылетам у Мінск Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з беларускімі і італьянскімі журналістамі і падвёў вынікі візіту.

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка выказаў гатоўнасць правесці ў Беларусі сустрэчу Папы Рымскага Бенедзікта XVI і Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Аб гэтым ішла размова ў час сустрэчы Прэзідэнта з Пантыфікам.

«Я сказаў на сустрэчы, што сёння ёсць унікальны шанц збліжыць пазіцыі, каб Папа Рымскі і Патрыярх маглі сустрэцца і абмеркаваць агульныя праблемы. Калі такая сустрэча адбудзецца, то няхай яна будзе ў Беларусі, таму што гэта не толькі цэнтр Еўропы, але і краіна, дзе суіснуюць дзве канфесіі — праваслаўе і каталіцызм», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Папа Рымскі ведае аб гэтай ідэі. «Я бачыў яго зацікаўленасць, — адзначыў Прэзідэнт, — і ён мне сказаў: Гасподзь, магчыма, адкрые гэтыя дзверы, і мы ў хуткім часе сустрэнемся».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што і Папа Рымскі, і Дзяржсакратар Яго Святасці Кардынал Тарчызіо Бертоне поўнасцю ведаюць сітуацыю і гатовы садзейнічаць правядзенню гэтай сустрэчы.

У той жа час Прэзідэнт падкрэсліў, што ён не схільны лічыць візіт у Ватыкан «прарывам у нейкім напрамку». «У гэтым выпадку мы не мыслім ваеннымі катэгорыямі. Мы ажыццяўляем тое, што было запланавана даўно: яшчэ былы Папа мяне двойчы запрашаў прыехаць у Ватыкан. Я з вялікім шкадаваннем успамінаю той шанц, які ўпусціў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Успамінаючы гутарку з Бенедзіктам XVI, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што былі абмеркаваны пытанні ўзаемаадносінаў праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, а таксама становішча Беларусі ў свеце. «Час прайшоў імгненна. Папа — цудоўны, добры і прыстойны чалавек, з ім вельмі прыемна размаўляць», — дадаў Прэзідэнт. Ён расказаў таксама Бенедзікту XVI аб сваёй сустрэчы з Патрыярхам Кірылам, на што кіраўнік Рымска-каталіцкай царквы заўважыў, што гэта яго добры сябар.

Гаворачы пра размову з прэм'ер-міністрам Італіі, Аляксандр Лукашэнка не выключыў, што Сільвіо Берлусконі можа наведаць Беларусь ужо гэтай восенню.

«Сільвіо Берлусконі сказаў, што гатоў у бліжэйшы час наведаць Беларусь і прадоўжыць пачатую размову. Думаю, гэта адбудзецца ўжо восенню, але мы загадзя аб гэтым дамовімся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, на сустрэчы з кіраўніком італьянскага ўрада былі абмеркаваны многія праблемныя пытанні, у тым ліку ўплыў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу на эканомікі краін, эканамічныя праблемы ў цэлым, інвестыцыйнае супрацоўніцтва, а таксама сітуацыя ў сувязі з расійска-грузінскім канфліктам.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў італьянскаму боку за тую пазіцыю, якую ён займае адносна Беларусі. «Яны для сябе адкрываюць новую Беларусь», — дадаў ён.

Закранаючы пытанне аб тым, хто прадставіць Беларусь на майскім саміце ў Празе, Прэзідэнт сказаў, што гэта будзе вызначана ў бліжэйшы час. Пры гэтым ён папрасіў не надаваць асаблівага значэння гэтаму пытанню.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

На слыху

Парсюкі сталі рэзервуарам для смяротнага «кактэйля»?

Ці набудзе эпідэмія свінога грыпу маштабы пандэміі? Гэта пытанне хвалюе сёння абсалютна ўсіх. Тым больш што літаральна за ліченыя дні ўспышка свінога грыпу, зарэгістраваная ў Мексіцы, пераўтварылася ў эпідэмію і пачала распаўсюджвацца па розных кантынентах. Па звестках на 29 красавіка, захваробленыя на свіны грып былі зарэгістраваныя ўжо ў Вялікабрытаніі, Ізраілі, Новай Зеландыі, Канадзе, Іспаніі і Германіі. Але найбольш трывожная сітуацыя назіраецца ў Мексіцы і Злучаных Штатах Амерыкі. У ЗША пацверджаны ўжо 64 выпадкі захворвання людзей на свіны грып: у зоне дзеяння віруса аказаліся штаты Каліфорнія, Тэхас, Агаё, Мічыган і Канзас. У Мексіцы колькасць смяротных ахвяраў новага віруса грыпу перавысіла ўжо 160 чалавек, а шпіталізаваныя з сімптомамі хваробы больш за 2,5 тысячы хворых. На экстраннай нарадзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя павысіла ўзровень пагрозы пандэміі свінога грыпу з 3 да 4, а ўсяго шкала складаецца з шасці стадый.

— Пандэмію, у адрозненне ад эпідэмій грыпу, без якіх не абыходзіцца ніводны эпідсезон, выклікае вірус грыпу з абсалютна новай антыгеннай структурай, які не распазнае імунная сістэма чалавека. І вірус грыпу птушак разглядаўся ў якасці толькі аднаго з верагодных прэтэндэнтаў на будучую пандэмію, — патлумачыла журналісту «Звязды» **кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе Наталля ГРЫБКОВА.** — Аднак на грып хварэюць не толькі птушкі, але і парсюкі. Звычайныя свойскія парсюкі аднолькава адчувальныя як да птушыных, так і да чалавечых вірусаў грыпу, і гэта робіць іх своеасаблівай «прабіркай», у якой можа ўтварыцца смяротны для чалавека «кактэйль». Калі жывёліна інфіцыруецца адначасова і чалавечым, і птушыным вірусамі грыпу, паміж двума вірусамі адбываецца абмен генетычным матэрыялам і такім чынам нараджаецца новы смяротны штам. І як толькі вірусу ўдаецца пераадолець відавы бар'ер і ён пачынае перадавацца ад чалавека да чалавека, перад чалавецтвам абавязкова паўстае пагроза пандэміі. Дарэчы, знакамітая «іспанка», якая выклікала пандэмію ў 1918 годзе, была выклікана менавіта свіным вірусам грыпу. Вірус, за якім сёння пільна сочаць эпідэміёлагі ўсіх краін, з'яўляецца своеасаблівым гібрыдам віруса грыпу А (H1N1), камбінацыя антыгенаў якога раней не сустракалася ў вірусаў грыпу, што выклікалі захворванні ў людзей і парсюкоў. Праўда, пакуль у спецыялістаў няма тлумачэнняў, чаму ў Мексіцы так шмат цяжкіх формаў захворвання людзей на свіны грып, а за межамі гэтай краіны каліфарнійскі грып (менавіта там назвалі новы штам) працякае ў значна больш лёгкіх формах і пакуль без смяротных вынікаў. Да таго ж пераважная большасць захварэлых на каліфарнійскі грып — гэта людзі ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў, хоць звычайна самымі лёгкімі ахвярамі грыпу становяцца дзеці і немаладыя людзі. Такім чынам абсалютна відавочна, што ўласцівасці новай разнавіднасці свінога грыпу яшчэ да канца не вывучаны, таму недаацэньваць небяспеку зусім не варта. Асабліва ўлічваючы, што ў сучасным свеце вірус распаўсюджваецца з хуткасцю звышгукавога самалёта...

ДА ВЕДАМА:

Сімптомы каліфарнійскага грыпу практычна не адрозніваюцца ад сімптомаў звычайнага грыпу. Захворванне праяўляецца ліхаманкай, галаўным болем, болем у мышцах, павышэннем тэмпературы цела і рэзкай слабасцю. Трэба мець на ўвазе, што грып не лечыцца антыбіётыкамі. Пры ўзнікненні сімптомаў любога падобнага на грып захворвання Міністэрства аховы здароўя Беларусі раіць беларусам неадкладна звяртацца па медыцынскую дапамогу.

Між іншым, цяпер у сталічным аэрапорце робяцца ўзмоцненыя захады па папярэджванні пранікнення свінога грыпу на тэрыторыю Беларусі. Кожны самалёт сустракае прадстаўнік карантыннай службы, якому экіпаж судна паведамляе аб сітуацыі на борце, ці ёсць у салоне самалёта хворыя з характэрнымі сімптомамі рэспіраторнага віруснага захворвання. Узмоцнены эпідкантроль таксама на чыгунцы і на пагранічных пераходах. Да таго ж Беларусь увяла часовую забарону на ўвоз жывёлагадоўчай прадукцыі і кармоў для парсюкоў і птушак з краін, дзе быў выяўлены вірус свінога грыпу. Галоўным дзяржаўным санітарным урачом Беларусі падпісана пастанова «Аб мерапрыемствах па павышэнні гатоўнасці да пандэміі грыпу». У прынцыпе, пагроза птушынага грыпу і пагроза SARS, якія ўзніклі намнога раней, прымусілі эпідэміёлагаў старанна прадумаць усю сістэму папярэджання распаўсюджання небяспечнай інфекцыі. Аднак спецыялісты прызнаюць, што калі ўсё пойдзе па пандэмічным сцэнарыі, то супрацьстаяць пранікненню высокапатагеннага віруса грыпу будзе ўсё ж такі нерэальна. Таму галоўная задача медыкаў будзе заключацца ў хуткай ізаляцыі хворых людзей, каб не дапусціць новыя выпадкі інфіцыравання. Як будзе развівацца далей сітуацыя, ніхто прагназаваць не бярэцца, аднак надзея, што пандэміі не будзе і на гэты раз, усё ж такі захоўваецца. Да таго ж і ўмовы сёння несупастаўныя з тымі, што былі падчас пандэміі 1918 года, калі ў свеце ішла вайна і адсутнічалі сучасныя антывірусныя прэпараты...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У КІЕВЕ ЗАБЛАКАВАЛІ САМАЛЁТ З ХВОРАЙ АМЕРЫКАНКАЙ НА БОРЦЕ



У кіеўскім міжнародным аэрапорце «Барыспаль» учора быў заблакаваны самалёт, што прыляцеў з Нью-Ёрка, на борце якога знаходзіцца чалавек з падазрэннем на свіны грып.

Як распавёў галоўны санітарны ўрач Украіны Мікалай Карніенка, сярод пасажыраў ёсць грамадзянка ЗША, якая дрэнна сябе адчувае, у яе баліць галава. Пра яе самаадчуванне пілоты рэйса паведамілі на зямлю пры падлёце да аэрапорта. На борце самалёта таксама былі заблакаваны 184 пасажыры і дзевяць членаў экіпажа.

ЛІТОЎСКІЯ ЎЛАДЫ ЗЭКАНОМЯЦЬ НА ХВОРЫХ 30 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Сойм Літвы знізіў памер выплат, на якія маюць права працаўнікі, якія ўзялі бальнічны, паведамляе Delfi.lt. Адпаведныя папраўкі ў Закон аб сацыяльным страхаванні па хваробе ўхвалілі 69 з 72 дэпутатаў, што ўзялі ўдзел у галасаванні.

Улады рэспублікі разлічваюць, што гэтая мера дапаможа зэканоміць у 2009 годзе 77 мільёнаў літаў (каля 29,5 мільёна долараў). Дагэтуль у Літве дзейнічаў парадак, у адпаведнасці з якім у першыя два дні хваробы супрацоўнік атрымлівае ад працадаўцы 80-100 працэнтаў ад зарплаты, а з трэцяга дня выплаты ажыццяўляе ўжо Фонд сацыяльнага страхавання (у памеры 85 працэнтаў ад зарплаты). Па новых правілах, у першыя два дні хваробы выплаты будуць ажыццяўляцца ў ранейшым рэжыме.

У перыяд з трэцяга па сёмы дзень Фонд сацыяльнага страхавання будзе выплачваць хвораму 40 працэнтаў ад зарплаты, а пачынаючы з восьмага дня — 80 працэнтаў. Урад раней прапаноўваў наогул спыніць выплаты ў першыя тры дні хваробы, аднак ад гэтай прапановы ўлады ў выніку адмовіліся. Калі прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус ухваліць гэты законапраект, то новы парадак выплат пачне дзейнічаць ужо з 1 мая.

У ЛАТВІІ ВЫРАШЫЛІ ЛІКВІДАВАЦЬ МІНІСТЭРСТВА ПА СПРАВАХ СЯМ'І

Урад Латвіі на пасяджэнні 28 красавіка вырашыў рэарганізаваць Міністэрства па справах дзяцей, сям'і і грамадскай інтэграцыі. Пра гэта паведамляе DELFI. Функцыі гэтага ведамства перадаюцца міністэрствам дабрабыту, юстыцыі і адукацыі.

Раней латвійскі прэм'ер Валдыс Даброўскіс, каментуючы планы па ліквідацыі міністэрства, адзначыў, што гэта дазволіць скараціць бюджэтныя выдаткі (дзякуючы скарачэнню бюракратычнага апарату).

Нагадаем, што кіраўніцтва Латвіі ва ўмовах эканамічнага крызісу ініцыявала рэформу дзяржаўнага кіравання, якая акрамя іншага дазволіць скараціць колькасць дзяржслужачых у краіне.

Плануецца рэарганізаваць усе дзяржаўныя агенцтвы, істотна абмежаваць іх выдаткі і штат супрацоўнікаў. Долю жыхароў Латвіі, занятых у сферы дзяржаўнага кіравання, плануецца скараціць з 14 да 8-10 працэнтаў.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 825,00
▼ 1 еўра	3 728,72
1 латвійскі лат	5 249,95
1 літоўскі літ	1 078,59
1 чэшская крона	139,05
1 польскі злоты	834,19
▲ 1 расійскі рубель	84,96
1 украінская грыўня	350,06

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,2491
10 UAH	41,5095
1000 BYR	11,7405
EUR	43,8389

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ОРГАНИЗАЦИЯ РЕАЛИЗУЕТ
НЕФТЕПРОДУКТЫ
Дт, Н-80, Аи-92.
Возможна доставка по РБ.
Тел.: 219 71 75,
8 029 639 69 93, 8 029 6821 821.
Лицензия № 09100/0248236 от 03.10.2006 г.УНП 190664272

БЕЛАРУСБАНК
ОАО «АСБ Беларусбанк» с 4 мая 2009 года
СНИЖАЕТ ПРОЦЕНТНЫЕ СТАВКИ ПО ВНОВЬ ВЫДАВАЕМЫМ НАСЕЛЕНИЮ КРЕДИТАМ В БЕЛОРУССКИХ РУБЛЯХ:
- на потребительские нужды сроком до трех лет – до 23 процентов годовых,
- на потребительские нужды гражданам, постоянно проживающим и работающим в населенных пунктах с численностью населения до 20 тыс. человек, – до 21 процента годовых и увеличивает срок пользования кредитом до пяти лет.
Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте www.belarusbank.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.УНП 100325912.

БЕЛАРУСБАНК
ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК» ИНФОРМИРУЕТ
о продлении до 31 декабря 2009 года срока размещения облигаций ОАО «АСБ Беларусбанк» для физических лиц 39-40 выпусков, номинированных в долларах США, и 41-42 выпусков, номинированных в евро.
Изменения утверждены Наблюдательным советом ОАО «АСБ Беларусбанк» 22 апреля 2009 года, протокол № 9 и зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 29 апреля 2009 года.
В части первой пункта 2.5 Проспектов эмиссии облигаций 39, 40, 41, 42 выпусков ОАО «АСБ Беларусбанк» слова «по 30.04.2009» заменить словами «по 31.12.2009».
Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте http://www.belarusbank.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

БЕЛАРУСБАНК
В честь 65-летия освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков ОАО «АСБ Беларусбанк» проводит акцию для ветеранов и инвалидов Великой Отечественной войны, бывших узников фашистских концлагерей
С 1 мая 2009 года ОАО «АСБ Беларусбанк» снижает в два раза процентные ставки по действующим кредитным договорам на потребительские нужды в белорусских рублях,
заключенным с ветеранами и инвалидами Великой Отечественной войны, бывшими узниками фашистских концлагерей. Снижение процентных ставок будет производиться путем заключения дополнительного соглашения к действующим до 01.05.2009 кредитным договорам при предъявлении кредитополучателями соответствующих удостоверений (свидетельств).
ОАО «АСБ Беларусбанк» также вводит целевой потребительский кредит в белорусских рублях по низким процентным ставкам
для ветеранов и инвалидов Великой Отечественной войны, перечисленных в статьях 2 и 4 Закона Республики Беларусь от 17.04.1992 № 1594-XII «О ветеранах», бывших узников фашистских концлагерей (гражданам, на которых распространяются меры социальной защиты, предусмотренные статьей 24 данного Закона).
Кредит выдается:
- сроком до 5 лет;
- с уплатой 14 % годовых за фактическое время пользования кредитом;
- в сумме не более 5 млн. рублей исходя из платежеспособности кредитополучателя;
- на приобретение домашнего имущества отечественного производства;
- в безналичном порядке, путем перечисления денежных средств по представленным счетам-фактурам;
- при предъявлении кредитополучателем соответствующего удостоверения (свидетельства);
- при получении (переводе) кредитополучателем пенсии в учреждении банка и оформлении постоянно действующего платежного поручения на удержание ежемесячных платежей по кредиту и процентам за пользование им из пенсии.
Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте www.belarusbank.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

«У НАС ВЯЛІКАЯ ЦІКАВАСЦЬ ДА ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ ДЫЯЛОГА ПА ЛІНІІ БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАСАЮЗ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў Прэзідэнта, «калі некаму нязручна, што там будзе Лукашэнка, значыць яго там не будзе».

У той жа час кіраўнік беларускай дзяржавы дадаў, што Сільвіо Берлусконі спадзяецца на сустрэчу з ім у Празе: «Учора, развітваючыся, Берлусконі сказаў: «Я вельмі спадзяюся ўбачыць Вас у Празе — як і многія іншыя кіраўнікі. Вы не думайце, што ў нас такія адносіны да Беларусі, як гэта часта гучыць у СМІ. Мы — дасведчаныя людзі і крыху больш ведаем і разумеем, што адбываецца ў Беларусі».

Адказваючы на пытанне італьянскіх журналістаў, што Аляксандр Лукашэнка параіў бы Сільвіо Берлусконі, Прэзідэнт адзначыў, што прэм'ер-міністр Італіі не мае патрэбы ні ў чыіх парадах. «Гэта патрыярх у знешняй палітыцы ў Еўропе і ва ўсім свеце. Яму не патрэбны парады, і я не збіраюся яму нічога раіць. Наадварот, я сам спытаў ў яго парад па некаторых пытаннях».

Італьянскія журналісты пацікавіліся ў Прэзідэнта, як у Беларусі маюць намер вырашаць праблемы, звязаныя з усынаўленнем беларускіх дзяцей італьянскімі грамадзянамі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не бачыць ніякіх праблем у гэтым пытанні. Паводле яго слоў, гэта тэма абмяркоўвалася і на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Італіі Сільвіо Берлусконі. «Яго здзівіла: якія праблемы могуць быць у гэтым пытанні. Мы проста ўнутры Беларусі зрабілі больш жорсткім заканадаўства па ўсынаўленні», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Мы хочам, каб кожнае ўсыноўленае дзіця адчувала сябе нармальным грамадзянінам. Мы вызначылі адказнага за гэты працэс — міністра адукацыі. У нас тры дзясяткі дзяцей, якія гатовы да ўсынаўлення, і ёсць сем'і ў Італіі, гатовыя іх прыняць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што «Тарчызіо Бертоне гарантаваў аўтарытэтам усёй каталіцкай царквы, што дзеці будуць жыць у дастойных умовах».

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава вельмі ўважліва і пільна сочыць за тым, у якіх умовах знаходзяцца ўсыноўленыя дзеці не толькі ў Італіі, але і ў іншых дзяржавах, паколькі вядомы сумныя выпадкі, калі і беларускія, і расійскія дзеці траплялі не ў лепшае асяроддзе. «Мы хацелі б поўнай яснасці і адкрытасці, і пасольства будзе кантраляваць становішча гэтых дзяцей».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што беларусы будуць рады, калі дастойныя італьянскія сем'і захочуць усынаўляць дзяцей і прымаць іх на аздараўленне. «Праблем сёння з усынаўленнем няма».

На працягу ўсяго часу пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС Італія пастаянна прымае на аздараўленне беларускіх дзяцей. Так, у 2007 годзе ў гэтай краіне прайшлі аздараўленне 21,5 тыс. беларускіх дзяцей, у 2008 годзе — 19,7 тыс. Па гэтых паказчыках Італія займае першае месца сярод замежных краін — партнёраў Беларусі. Акрамя таго, італьянскія дабрачынныя арганізацыі ажыццяўляюць праекты па дастаўцы ў Беларусь грузаў з гуманітарнай дапамогай і медыкаментамі, рамонту і мадэрнізацыі школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў і сацыяльных устаноў, будаўніцтву новых паліклінік і іх аснашчэнні медыцынскім абсталяваннем, прафесійным навучанні дзяцей-сірот прырытэтным для нашай краіны спецыяльнасцям, дзяцей з асаблівасцямі псіхічнага развіцця. Толькі ў 2008 годзе з Італіі ў Беларусь паступіла гуманітарнай дапамогі на агульную суму амаль $2,7 млн.

Цікавіла журналістаў і магчымасць прызнання Беларуссю незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гэта пытанне сёння абмяркоўваецца дэпутатамі беларускага парламента, аднак сярод іх няма поўнага адзінства думак. І ўрад, і Міністэрства замежных спраў цяпер плённа працуюць з дэпутацкім корпусам, каб дасягнуць у гэтым пытанні большага адзінства.

Адказваючы на пытанне італьянскіх журналістаў, якія рэформы раяць правесці ў Беларусі лідары заходнееўрапейскіх краін, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы ведаем без усялякіх просьбаў, што рабіць і ў якім напрамку рэфармаваць наша грамадскае, палітычнае і эканамічнае жыццё».

Закранаючы праведзеную сустрэчу з Вялікім Магістрам Мэцью Фестынгам, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на ёй увага была ўдзелена сумесным праграмам Беларусі з Мальтыйскім ордэнам у гуманітарным плане. Прэзідэнт падзякаваў за каласальную дапамогу па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, падтрымку на міжнароднай арэне. Паводле яго слоў, краіны дамовіліся выпрацаваць шэраг напрамкаў супрацоўніцтва — ад гуманітарнага да інвестыцый і бізнэсу.

Дзелячыся асабістымі ўражаннямі аб візіце, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што едзе з Італіі з добрым настроем і надзеяй яшчэ не адзін раз сюды вярнуцца. Ён таксама дадаў, што ў Беларусі гатовы прыняць грамадзян Італіі, журналістаў, каб, убачыўшы нашу краіну, яны «нарэшце сумленна і адкрыта расказалі, чым жыве Беларусь».

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Ізраіля з Днём незалежнасці

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса з нацыянальным святам — Днём незалежнасці. Беларускі лідар выказаў упэўненасць у далейшым развіцці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін.

Прэзідэнт Беларусі выказаў спачуванні родным і блізкім народнай артысткі СССР Кацярыны Максімавай

У сувязі са смерцю выдатнай расійскай балерыны, народнай артысткі СССР Кацярыны Максімавай Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні яе родным і блізкім.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ ПЕРАХОДЗІЦЬ АД РЭАБІЛІТАЦЫІ ПАЦЯРПЕЛЫХ ТЭРЫТОРЫЙ ДА ІХ АКТЫЎНАГА АДРАДЖЭННЯ

Беларусь пераходзіць да новага этапа вырашэння чарнобыльскіх праблем — ад рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый да іх актыўнага адраджэння і развіцця. Пры гэтым з абавязковым захаваннем усіх неабходных мераў па радыяцыйнай абароне насельніцтва. Аб гэтым 25 красавіка заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання рэгіёнаў, якія пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС.

Аляксандр Лукашэнка наведаў гарадскі пасёлак Камарын Брагінскага раёна, дзе азнаёміўся з ходам веснавых палявых работ.

«Мы павінны перастаць скардзіцца і плакацца і пачаць новы перыяд — аднаўлення тэрыторый, якія пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС. Нам неабходна прыкласці максімум намаганняў, каб адрадзіць гэты край», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на тым, што пытанням нумар адзін застаецца бяспека грамадзян. «Спяшацца тут не трэба. Калі мы бачым, што аднаўляць гэтыя землі нельга, то гэтага рабіць не трэба», — сказаў ён.

У той жа час Прэзідэнт паставіў задачу ўзмацніць кантроль за чысцінёй прадуктаў, што вырабляюцца на гэтай зямлі. «Рызыкаваць бяспекай людзей не трэба, але і залішне палохаць іх таксама не трэба», — адзначыў Прэзідэнт.

Як лічыць Прэзідэнт, добрым паказчыкам таго, што адраджаць гэты край усё ж неабходна, з'яўляецца прыток насельніцтва: у мінулым годзе ў гэты рэгіён прыехала на паўтысячы людзей больш, чым выехала, прычым асноўную масу складае моладзь ад 15 да 29 гадоў.

Кіраўнік дзяржавы лічыць мэтазгодным накіраваць усе грашовыя сродкі, эканомленыя ад адмены льгот, на аднаўленне чарнобыльскіх рэгіёнаў. Эканомленыя ад адмены льгот сродкі складаюць прыкладна Br240 млрд.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што ў мінулым годзе, нягледзячы на адмену вялікай колькасці льгот, дзяржава эрасходавала на іх каля Br500 млрд.

Як далажыў Прэзідэнту міністр па надзвычайных сітуацыях Энвер Барыеў, за 23 гады з моманту аварыі радыяцыйная абстаноўка ў рэгіёне значна палепшылася, і гэта тэндэнцыя захоўваецца.

Пазней на цэнтральнай плошчы Камарына адбыўся мітынг-рэквіем, прысвечаны 23-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Як адзначыў Прэзідэнт, матэрыяльны ўрон у выніку гэтай трагедыі супастаўны са стратамі Вялікай Айчыннай вайны. 619 беларускіх вёсак знішчылі фашысты, а ў выніку чарнобыльскай катастрофы краіна страціла 485 паселішчаў.

Прэзідэнт выказаў сардэчную ўдзячнасць людзям, якія стойка вытрымалі ўсе выпрабаванні наступстваў тэхнагеннай катастрофы.

Аляксандр Лукашэнка запаліў Вечны агонь каля помніка ў гонар воінаў-вызваліцеляў, пагутарыў з мясцовымі жыхарамі. Ад імя кіраўніка дзяржавы ў падарунак жыхарам Камарына быў перададзены новы пасажырскі аўтобус МАЗ.

Потым Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў.

Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў, што цяпер ад рэабілітацыі забруджаных зямель мы пераходзім да іх адраджэння. І на гэтыя мэты дзяржава абавязкова знойдзе неабходныя сродкі. Ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу мэтазгодна стварацьнавыя вытворчасці, мадэрнізаваць старыя. Менавіта таму на гэтыя мэты фінансаванне скарачацца не будзе, таксама як на ахову здароўя і адукацыю.

Прэзідэнт па просьбе журналістаў пракаментаваў заявы, якія прагучалі ад высокапастаўленых расійскіх чыноўнікаў, аб тым, што Беларусь адчувае цяжкасці ў сувязі з неабходнасцю абслугоўваць новыя знешнія пазыкі. Аляксандр Лукашэнка не лічыць, што крэдытная нагрузка на беларускую дзяржаву становіцца пагражальнай. «Па сусветных стандартах, 25 працэнтаў ад ВУП — гэта той парог, які дзяржава не павінна пераступаць па крэдытах. У нас сёння менш як 8 працэнтаў. Вось і адказ на пытанне».

«Мы не ўпалі ў бездань крызісу, утрымаліся на краю. Галоўнае сёння — захаваць дынаміку росту».

«За апошнія паўтара года Расійская Федэрацыя за кошт павышэння цаны на газ і ўвядзення пошліны на нафту, парушаючы дамоўленасці, выцягнула з краіны больш як $10 млрд, а нам далі $2 млрд пад даволі вялікі працэнт, якога ў свеце ўжо няма».

Журналісты пацікавіліся таксама думкай Прэзідэнта адносна таго, што трэнера гомельскіх хакеістаў, якія перамаглі прэзідэнцкую каманду, Яўгена Лебедзева збіраліся за гэта звольніць. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што вельмі задаволены гульнёй гомельскай абласной хакейнай каманды на Другіх рэспубліканскіх спаборніцтвах па хакеі сярод аматараў, і ён больш за ўсіх радаваўся поспеху гамяльчан, хоць яго каманда прайграла. «Паверце, што лепшага выніку для хакея і балельшчыкаў не прыдумаеш. Некаторыя думаюць, што, маўляў, Прэзідэнт у любым выпадку выйграе. Гэта поўнае глупства. Я вам скажу шчыра, што напярэдадні нашай аматарскай сустрэчы з гамяльчанамі мне паступіла інфармацыя, што некаторыя спрабуюць іх праінструктаваць, як ім трэба гуляць. Таму я папрасіў, каб перадалі трэнерам гомельскай каманды: калі будзеце гуляць у паддаўкі, то пойдзеце пяшком у Гомель. Малайцы гамяльчане. І трэнер гомельскай каманды Яўген Лебедзеў таксама маладзец». Прэзідэнт лічыць, што Яўген Лебедзеў павінен застацца на пасадзе галоўнага трэнера жлобінскага «Металурга».

Пакідаючы Брагінскі раён, Аляксандр Лукашэнка паабяцаў яго жыхарам, што праз некалькі месяцаў ён зноў наведае гэтыя месцы, каб дэталёва пазнаёміцца з сітуацыяй у Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

За тры месяцы нарадзілася 26,9 тысячы дзяцей

Паводле апошніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, на 1 красавіка колькасць насельніцтва нашай краіны склала 9665,8 тысячы чалавек і ў параўнанні з адпаведнай леташняй датай скарацілася на 15,2 тысячы чалавек.

Сёлета ў першым квартале ў рэспубліцы нарадзілася 26,9 тысячы дзяцей, што на 1,6 тысячы чалавек больш, чым за мінулагоднія студзень-сакавік, памерла 35,9 тысячы чалавек, ці на 0,9 тысячы чалавек больш. Колькасць зарэгістраваных шлюбаў павялічылася на 4,9%, а разводаў скарацілася на 1,5%. За згаданы перыяд у рэспубліку прыбыло 4435 чалавек, выбыла 1605, міграцыйны прырост склаў 2830 чалавек.

Ігар ГРЫШЫН.

Транспарт на святы

Праца гарадскіх аўтобусных маршрутаў будзе арганізавана: 1 і 3 мая — па графіку нядзельных дзён, 2 мая — па графіку суботніх. Тралейбусныя і трамвайныя маршруты будуць працаваць: 1 і 2 мая — па графіку суботніх, 3 мая — па графіку нядзельных дзён. Праца прыгарадных аўтобусных маршрутаў прадугледжана па наступным графіку: 30 красавіка і 8 мая — як па пятніцах, 1—2 і 9 мая — як па суботах, 3 і 10 мая — як па нядзелях.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Хлопчык выпаў з 5 паверха

28 красавіка каля 20 гадзін у Слаўгарадзе з балкона жылога дома выпала 3-гадовае дзіця. Няшчасны выпадак здарыўся з прычыны неасцярожнасці. Хлопчык Арсень цяпер у Слаўгарадскай бальніцы: у яго пераломы бядра і ключыцы, а таксама чэрапна-мазгавая траўма. Медыкі сёння ацэньваюць стан малога як сярэдняй цяжкасці і мяркуюць перавезці яго ў Магілёў да траўматолагаў. «Хлопчык мае патрэбу ў сур'ёзным лячэнні, але, дасць Бог, усё абыдзецца», — кажуць слаўгарадскія ўрачы.

Алена КАЗЛОВА.

На майскія святы пахаладае

На гэтым тыдні сапраўднае цяпло ненадоўга пакіне тэрыторыю нашай краіны, саступіўшы месца свежым паўночным вятрам, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагназаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Таму 30 красавіка ў паўночна-ўсходніх раёнах, а 1 мая ўжо на ўсёй тэрыторыі краіны пахаладае. Тэмпература паветра ўдзень у пятніцу толькі 11—17, а ў ноч на 2 мая чакаюцца месцамі замаразкі да мінус 1—3 градусаў. 2 мая ўдзень будзе крыху цяплей — 13—19 цяпла. Тэмпература паветра ў нядзелю і панядзелак уначы 0—7 цяпла, уначы 3 мая месцамі замаразкі да мінус 1—2 градусаў, удзень — плюс 16—22 градусаў. Усе гэтыя дні ападкаў не прадбачыцца. Толькі ў аўторак удзень у заходніх раёнах Беларусі чакаюцца дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ў аўторак удзень 18—24 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Будаваць агульную інфармацыйную прастору

13-я Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі» распачне сваю работу ў дзень прафесійнага свята журналістаў, 5 мая, у Нацыянальным выставачным цэнтры па вуліцы Я. Купалы, 27. Адкрыццё яе запланавана на 12 гадзін. Сёлета праграма яе мерапрыемства пройдзе пад лозунгам «СМІ — для роднай зямлі».

Як сказала ўчора першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч, мерапрыемства, вядома ж, не стане нейкім своеасаблівым нядобрым тузінам, але найперш — яшчэ адным крокам на шляху стварэння адзінай медыйнай прасторы, якая павінна дапамагаць у вырашэнні вострых праблем, што паўстаюць сёння ў свеце.

У гэтым штогадовым медыяфоруме возьмуць удзел больш як 70 экспанентаў з дзесяці краін: тут, акрамя беларускіх СМІ, будуць шырока прадэманстраваны выданні з Расіі, Украіны, Латвіі, Францыі, Кітая, іншых краін, а таксама выданні беларускай дыяспары. 5 мая пройдзе цырымонія ўзнагароджання пераможцаў V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая ліцера». Як паведаміла Лілія Ананіч, 380 удзельнікаў спаборнічаюць тут па 24 намінацыях. «Камусьці ўдасца пацвердзіць ранейшы свой высокі статус, нехта, мабыць, яго страціць, будуць і нечаканасці», — паабяцала першы намеснік міністра інфармацыі. Тым больш, што паводле слоў Ліліі Станіслаўны, медыйная прастора Беларусі актыўна развіваецца. І ўжо з 8 лютага гэтага года, калі ўступіў у сілу новы закон аб сродках масавай інфармацыі, у краіне зарэгістраваны 17 новых выданняў (14 недзяржаўных СМІ і 3 дзяржаўныя), так што канкурэнцыя ўзрастае.

Сёння мы можам глядзець каля сотні тэлевізійных каналаў з усяго свету, сказала Л. Ананіч. Што датычыцца афіцыйнага функцыянавання ў Беларусі расійскіх тэлеканалаў, то беларускі бок яшчэ год таму ініцыяваў падпісанне міжурадавага пагаднення, якое рэгулявала б двухбаковыя адносіны ў сферы распаўсюджання СМІ. Да гэтага часу паміж нашымі краінамі існуе толькі міжведамаснае пагадненне ў сферы друку (яно было падпісана яшчэ ў 1999 годзе), але няма ніводнага дакумента, які датычыцца электронных СМІ. Таму летась беларускім бокам быў падрыхтаваны адпаведны праект, які быў накіраваны для ўзгаднення расійскім калегам, але адтуль да гэтага часу не дадзена ніякага адказу — ні станоўчага, ні адмоўнага. «Праўда, апошнім часам у іх з'явіўся намер сур'ёзна абмеркаваць гэтае пытанне, — сказала Лілія Ананіч. — Тут ёсць некалькі шляхоў вырашэння пытання — разгледзець беларускі варыянт пагаднення, расійскі (калі ён будзе), або прыняць сумесны дакумент. Са свайго боку Беларусь будзе рабіць захады, каб паскорыць вырашэнне гэтага пытання».

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі паведаміла таксама, што ў рамках выставы «СМІ Беларусі» ў Нацыянальнай бібліятэцы будзе працаваць IV Беларускі інфармацыйны форум. Яго тэма: «СМІ ў перыяд глабальнага эканамічнага крызісу». Форум пройдзе пры падтрымцы офіса АБСЕ ў Мінску, Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. На яго ўжо акрэдытавалася 400 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Францыі.

Спадзяёмся, што і вы, паважаныя чытачы, наведаеце выставу. У аўторак, 5 мая, адразу ж пасля ўрачыстага адкрыцця, адбудзецца прэзентацыя нашай газеты. Вас чакаюць кансультацыі ўрачоў-спецыялістаў, творчыя сустрэчы, гульнявыя конкурсныя праграмы з уручэннем прызоў, выступленні музычных калектываў і яшчэ шмат чаго цікавага. Прыходзьце! Чакаем вас.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Крывашэеву Ю.В. у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ Валянціны Парфёнаўны.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне начальніку галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Крывашэеву Ю.В. у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ Валянціны Парфёнаўны.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць з выпадку смерці дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання ПЕЧАНЬКОВА Уладзіміра Пятровіча і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Абзац

■ Урад Беларусі зацвердзіў бюджэт пражыткавага мінімуму ў цэнах сакавіка 2009 года ў разліку на адзін месяц. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 533 ад 25 красавіка гэтага года. Перыяд дзеяння гэтага сацыяльнага нарматыву — з 1 мая па 31 ліпеня 2009 года. Бюджэт пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва з мая складзе Br243 тыс. 570 (з 1 лютага па 30 красавіка 2009 года гэты нарматыў роўны Br234 тыс. 370). Для працаздольнага насельніцтва БПМ вызначаны ў памеры Br261 тыс. 320, для пенсіянераў — Br219 тыс. 140, для студэнтаў — Br262 тыс. 140, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў — Br297 тыс. 70, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br215 тыс. 160.

■ Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі вызначаны памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў у цэнах сакавіка гэтага года для 18 сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Гэтыя нарматывы будуць дзейнічаць з 1 мая па 31 ліпеня 2009 года. Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 мая гэтага года складзе Br376 тыс. 920 у разліку на месяц (з 1 лютага па 30 красавіка — Br363 тыс. 180, з 1 лістапада 2008 года па 31 студзеня 2009-га — Br346 тыс. 190). МПБ сям'і з чатырох чалавек павялічыўся на 3,8 працэнта.

■ У Беларусі з мая гэтага года на 3,9 працэнта ўзрастуць памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Гэта абумоўлена зацвярджэннем новага бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (гэты нарматыў з мая па ліпень 2009 года складае Br243 тыс. 570). Такім чынам, з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім 3-гадовага ўзросту складзе Br194 тыс. 860, старэйшых за 3 гады — Br73 тыс. 70. Аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці дасягне Br1 млн. 217 тыс. 850, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей беларускія сем'і будуць атрымліваць Br1 млн. 704 тыс. 990. Аднаразовая дапамога жанчыне, якая стала на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці пры нараджэнні першага і другога дзіцяці, складзе з мая гэтага года Br243 тыс. 570.

■ Дзяржаўны мытны камітэт Беларусі прапануе знізіць норму бяспошліннага ўвозу тавараў фізічнымі асобамі з 1 тыс. еўра да 200 еўра. Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні ДМК Сяргей Барысюк у час online канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

■ У РУП «Белпошта» праінфармавалі, што 2, 4, 5, 6, 7 і 8 мая — працоўныя дні для аддзялення паштовай сувязі, а 1, 3 і 9 мая будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні.

■ Брытанскія вучоныя вызначылі, што энергазберагальныя лямпы могуць быць шкодныя для здароўя. Паводле звестак Брытанскай асацыяцыі дэрматолагаў, ад лямпачак новага пакалення могуць пацярпець, перш за ўсё, людзі з павышанай святлоадчувальнасцю скуры, бо флуарысцэнтныя лямпачкі выпраменьваюць больш інтэнсіўны свет, чым звычайныя. Выкарыстанне энергазберагальных лямпаў можа абвастрыць захворванні скуры, якія ўжо маюцца ў чалавека, і прывесці да раку скуры, а таксама выклікаць мігрэнь і галавакружэнне ў людзей, якія хварэюць на эпілепсію. Занепакоенасць вучоных звязана з тым, што згодна з энергазберагальнай праграмай, якая прапанавана брытанскім урадам, да 2011 года плануецца цалкам спыніць выкарыстанне высокаэнергетычных лямпачак і перайсці на флуарысцэнтныя.

Поўны абзац

■ Міндраў Егіпта заявіў аб намеры знішчыць усё пагалоўе свіней у краіне ў сувязі з пагрозай свінога грыпу. Па звестках міністэрства, у пераважна мусульманскім Егіпце налічваецца каля 300 000 свіней. Пераважная большасць жыхароў у Егіпце прытрымліваецца ісламу і не ўжывае ў ежу свініну, аднак свіней разводзяць прадстаўнікі копцкай меншасці, якія прытрымліваюцца хрысціянства.

■ 27-гадовага новазеландца Цімаці Чэмпкіна прыгаварылі да шасці месяцаў турмы за тое, што ён задзіраў спадніцы незнаёмым жанчынам. Чакаючы зялёнага святла святлафора, каб перайсці вуліцу, мужчына задраў спадніцу ў 21-гадовай дзяўчыны на вачах у паліцэйскіх, якія знаходзіліся за некалькі метраў ад яго. Па словах дзяржаўнага абвінаваўцы, калі Чэмпкіна арыштавалі, ён прызнаўся, што «пастаянна займаўся падобнымі рэчамі».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У сувязі са святамі наступны нумар «Звязды» выйдзе 5 мая.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 29 мая 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день подачи заявлений – **25.05.2009 года** до 15.50.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б)документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

Победители аукциона обязаны: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы). Возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и изготовлением документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма расходов составляет 7 миллионов рублей.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1	район ул. Слепокурова № 8 по генплану	0,1200	740100000001004844	10 856 000	977 000
Лот № 2	район ул. Слепокурова № 9 по генплану	0,1200	740100000001004845	10 856 000	977 000
Лот № 3	район ул. Слепокурова № 17 по генплану	0,1200	740100000001004855	10 856 000	977 000
Лот № 4	район ул. Слепокурова № 18 по генплану	0,1200	740100000001004857	10 856 000	977 000
Лот № 5	район ул. Слепокурова № 19 по генплану	0,1200	740100000001004856	10 856 000	977 000

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. В радиусе 300 м имеются сети водопровода.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

3 июня 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в государственной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляются:

Предмет аукциона, местоположение недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Характеристика недвижимого имущества	Информация о земельном участке для обслуживания, продаваемого недвижимого имущества. Условия использования земельного участка
Лот № 1: Капитальное строение (клуб) (инв. № 640/С-21364), расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 133, находящееся в республиканской собственности	129973601 (в том числе: недвижимое имущество – 93137251, право аренды земельного участка – 36836350) сумма задатка – 12000000 Начальная цена недвижимого имущества снижена на 50 %	Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, полы дощатые. Общая площадь – 888,3 кв.м. Год постройки – 1933	Срок аренды земельного участка – 40 лет, площадь – 0,2389 га. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне канализационного коллектора. Земельный участок отведен для обслуживания и эксплуатации строения клуба с холодной пристройкой
Лот № 2: Капитальное строение (учебный корпус) (инв. № 640/С-21366), расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 133, находящееся в республиканской собственности	216659307 (в том числе: недвижимое имущество – 150821477, право аренды земельного участка – 65837830) сумма задатка – 20000000 Начальная цена недвижимого имущества снижена на 50 %	Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная, полы дощатые, плиточные, ДСП. Общая площадь – 1131,8 кв.м. Год постройки – 1933	Срок аренды земельного участка – 38 лет, площадь – 0,4457 га. Земельный участок отведен для обслуживания и эксплуатации учебного корпуса
Продавец: Производственное республиканское унитарное предприятие «1993-я центральная инженерная ремонтная база», расположенное по адресу: Минская область, г Слуцк, ул. Социалистическая, 133, тел. (8-01795) 48242, 42805			
Арендодатель земельных участков: Слуцкий районный исполнительный комитет			
Сумма задатка по лотам 1-2 перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**			
Лот № 3: Здание специализированное для образования и воспитания (здание начальной школы) (инв. № 621/С-13941), расположенное по адресу: Минская область, Несвижский район, д. Еськовичи, находящееся в собственности Несвижского района	35127691 (в том числе: недвижимое имущество – 34512251, право аренды земельного участка – 615440) сумма задатка – 3500000	Здание начальной школы одноэтажное с крыльцом, сараем, уборной, асфальтированным покрытием (10 кв.м.), ж/б покрытием (17 кв.м.) и забором. Фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы дощатые. Общая площадь – 260,5 кв.м. Год постройки – 1973. Не используется с 2005 г.	Срок аренды земельного участка – 51 год, площадь – 0,5928 га. Условия использования земельного участка: для размещения объектов производственного назначения
Продавец: Отдел образования Несвижского районного исполнительного комитета, расположенный по адресу: Минская область, г. Несвиж, ул. Советская, д. 1, тел. 8 (01770) 55 592			
Арендодатель земельного участка: Несвижский районный исполнительный комитет			
Сумма задатка по лоту 3 перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**			

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорус

КРЫЗІС КРЫЗІСАМ, А СЕЯЦЬ ТРЭБА

Як вядома, галоўны веснавы клопат вясковага працаўніка — гэта клопат пра сяўбу. Кажуць, як пасееш, так і пажнеш. Добра памятаюць пра гэта і ў гаспадарцы «Ракаў-агра», якую мы не так даўно наведалі: тут прыкладалі ўсе намаганні для таго, каб укласціся з сяўбой у аптымальныя тэрміны. А пры гэтым хваляваліся: тыя ж аптымальныя тэрміны ніяк не стасаваліся з сёлетнім халодным надвор'ем, з начнымі маразамі, што выдаліся на апошнюю дэкаду красавіка. Гэтыя маразы вельмі лёгка маглі б пашкодзіць кволыя парасткі, калі б тыя праклюнуліся. Тым не менш сяўба ў ТАА «Ракаў-агра» ішла поўным ходам. Прычым тут былі задзейнічаны сучасныя пасяўныя агрэгаты, якія адначасова ўзрыхлялі зямлю, укладвалі ў яе зярняты і прыкочвалі ўтвораныя радкі...

— Глядзіце, якое акуратнае поле атрымліваецца — зямля роўная, як стол, — гаварыў кіраўнік гаспадаркі Станіслаў Кандратовіч. — Крызіс крызісам, а сеяць трэба.

А пры гэтым ён паскардзіўся: сёлета ўпершыню пусцілі па полі сеялку айчыннай вытворчасці, якую выпусцілі на Брэсцкім электрамеханічным заводзе — ды вось бяда: ужо амаль адразу «паляцела» муфта. А гэта — незапланаваны рамонт, а значыць, і затрымка ў працы, страта тых жа аптымальных тэрмінаў. Аднак, нягледзячы на гэткі не зусім удалы «пуск» брэсцкага агрэгата, Станіслаў Іосіфавіч моцна не наракаў на завадчан: «Вельмі добрая сеялка атрымалася, трэба толькі крыху дапрацаваць яе. Вось маюць цяпер сельскія працаўнікі не толькі свой добры трактар, але і добрую высокапрадукцыйную сеялку — усё айчыннае, і ў некалькі разоў таннейшае, чым замежнае...

Сёлетняя пасяўная ў «Ракаў-агра» для Станіслава Іосіфавіча, па сутнасці, другая. Ён немалы час кіраваў адной з гаспадарак у Гродзенскай вобласці, ды аднойчы не зусім сышоўся з раённым кіраўніцтвам у поглядах на метады, так бы мовіць, вядзення сельскагаспадарчай справы. Давялося папрацаваць крыху ў іншым месцы, ужо зусім не звязаным з гэтай самай справай. Але зямля ўсё-такі настойліва паклікала да сябе зноў, апынуўся ў выніку ў «Ракаў-агра», дзе, паводле слоў аднаго са спецыялістаў гаспадаркі, не ведае спакою сам і ўсіх іншых добра варушыць. Ёсць для гэтага і свайго роду падстава: не зусім добрая спадчына дасталася Станіславу Іосіфавічу — з немалымі даўгамі.

— Нічога, пакрысе разбяромся з даўгамі, ужо ў мінулым годзе істотна зменшылі іх; зменім усё ў лепшы бок. Тэхніка ёсць, людзі да справы цягнуцца. Будзе добрая дысцыпліна — будзе прадукцыя — будуць і грошы, — гаварыў ён. — Паглядзіце, якія выдатныя ў нас азімыя. Добра падрыхтавалі зямлю да веснавой сяўбы: арганіку, мінеральныя ўгнаенні ўнеслі, у мінулым годзе 1100 гектараў апрацавалі ад пырніку — гэтага самага злоснага ворага ўраджаю, нямала плошчаў вызвалілі ад камення...

Гаспадарка «Ракаў-агра» — адна з найбольш буйных у Валожынскім раёне, мае каля 5100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, з іх 4500 — ворыва. Зямля ў ёй — па ўрадлівасці, па бальнасці — не самая лепшая, пры гэтым добра нашпігавана тым жа каменнем, якое пастаянна выцягваюць тут з палёў дзясяткамі тон. Спецыялізуюцца ў гаспадарцы на традыцыйных кірунках — вырошчванні збожжавых ды вытворчасці малака і мяса; у яе склад уваходзіць таксама спіртзавод. На тэрыторыі гаспадаркі знаходзяцца пасёлак Ракаў і 16 вёсак (цэнтральная сядзіба гаспадаркі размяшчаецца ў вёсцы Талька і будзе прыбываць на Інстытут культуры. Электрацягнік **Талька — Мінск-Пасажырскі на 10.34** адмяняецца на ўчастку Асіповічы — Талька і будзе прыбываць на Інстытут культуры.

12, 18, 26 мая адмяняюцца цягнікі: №148 Калінінград — Масква з Калінінграда ў 16.27, прыбыццём у Мінск у 2.58, з Мінска ў 3.24; №147 Масква — Калінінград адпраўленнем з Масквы ў 18.55 13, 19, 27 мая, прыбыццём у Мінск у 4.56, адпраўленнем з Мінска ў 5.15.

Сяргей РАСОЛЬКА.

тэхнікі (МВАВТ) — звернем увагу на яе цяперашнюю назву: ТАА «МВАВТ Ракаў-агра». Безумоўна, гэта вельмі дабратворна адбілася на ўсім стане яе спраў. Вось што расказаў прадстаўнік мінскага аб'яднання Яўген Нікіцюк:

— Аб'яднанне за ўвесь гэты час уклала ў гаспадарку больш за 7,5 мільярда рублёў. Наш генеральны дырэктар Аляксандр Лявонцьевіч Панасюк успрыняў адпаведны ўказ Прэзідэнта краіны як яго асабістае даручэнне. Курыруе гэту гаспадарку намеснік генеральнага дырэктара Леанід Аркадзьевіч Кадушкевіч. З прыходам сюды нашай дапамогі тут нямала чаго змянілася. Так, толькі ў канцы мінулага года для гаспадаркі былі набытыя за сродкі аб'яднання тры МАЗы з прычэпамі, 8 трактароў, унікальная ўстаноўка «Раса» — раскідвальнік мінеральных угнаенняў. Словам, падрыхтоўка да гэтай пасяўной была вельмі грунтоўнай, хоць як быццам і пачынаўся крызіс. Цяперашнія вынікі гаспадаркі паказваюць, наколькі эфектыўнай была гэта звязка горада з вёскай. А галоўнае — людзі павесялелі.

Да слоў Яўгена Нікіцюка варта дадаць: усё гэта ніколькі не прыніжае адпаведных намаганняў цяперашняга кіраўніцтва гаспадаркі; дасягнутыя ў ёй вынікі (у прыватнасці за апошні год), па сутнасці, даказваюць: укладзеныя ў гаспадарку сродкі не прапалі марна.

Звернемся да асобных з гэтых вынікаў. Тут у мінулым годзе ўзялі на 900 з лішкам тон больш збожжавых (атрымалі за гэта нават падзяку з аблвыканкама); павялічылі з 3620 кілаграмаў (у 2007 годзе) да 4384 кілаграмаў надоі малака; дасягаюць 740 грамаў штосутачнага прырашчэння ў вазе жывёлы на адкорме. «Яшчэ тры гады таму прыбаўленне ў вазе ў нас было ў межах 210—230 грамаў, — гаварыў загадчык жывёлагадоўчага комплексу Віталь Гарасюк, — а ў цэлым вага жывёлы, якую здавалі на мясакамбінаты, нават да 300 кілаграмаў не даходзіла — цяпер здаём не менш за 460—480. Поўнасцю забяспечваем комплекс сваімі кармамі, а раней былі прывазныя. Задача на найбліжэйшы час — выйсці па штосутачным прыбаўленні ў вазе жывёлы да 900 грамаў»...

Варта дадаць: у «Ракаў-агра» пры гэтым заклапочаны тым, каб знізіць сабекошт ялавічыны. «Вось узводзім сваю млынавую гаспадарку, — паказваў Станіслаў Кандратовіч, — абсталяванне ўжо ёсць, восенню плануем увесці. Словам, будзем вырабляць свае камбікармы. Калі параўноўваць іх з тымі, што цяпер купляем, па 150 рублёў на адным кілаграме эканоміць будзем, гэта больш за 30 працэнтаў. Адпаведна, будзем мець зусім іншую рэнтабельнасць мяса»... А яшчэ ў планах кіраўніка давесці з цягам часу колькасць жывёлы на адкорме з цяперашніх 3100 галоў да 4 тысяч.

Сяўба для кіраўніцтва гаспадаркі складае цяпер найпершы клопат, але не забывае яно цікавіцца і тым, як ідзе ў ёй узвядзенне аграгарадка. А будаўніцтва ў ёй разгорнута ну проста маштабнае: тут, у прыватнасці, узводзяцца 18 дамоў катэджнага тыпу і адзін шматкватэрны дом. «Нам патрэбны добрыя працоўныя рукі — адпаведна, мы павінны прапанаваць людзям, якія прыйдуць у гаспадарку, добрае, дыхтоўнае жыллё. А каля тых жа катэджных дамоў — па 20 сотак зямлі; хлеўчыкі, дзе можна вырошчваць сваю жывёлу. Амаль побач уся так званая інфраструктура — што яшчэ чалавеку трэба?» — гаварыў Станіслаў Кандратовіч.

У гаспадарцы пры гэтым яўна зрабілі стаўку на моладзь. Гэта добра заўважна ўжо па тым, што пераважна менавіта маладыя кіруюць тут той жа новай тэхнікай; маладых яшчэ не закранула такая негатыўная з'ява, як п'янства, на барацьбу з якім у гаспадарцы прыцягваюць як міліцыю, так і святароў. Аднак скажам крыху пра тую ж інфраструктуру. На тэрыторыі гаспадаркі дзейнічае клуб, знаходзяцца дом быту з яго адпаведнымі паслугамі і спартыўна-аздараўленчым комплексам, дзіцячы садок і іншыя аб'екты сацыяльнага прызначэння. У гэтым годзе плануецца пабудаваць таксама лазню. Кіраўнік гаспадаркі пазнаёміў нас з загадчыцай клуба Алесяй Недапекінай, якая атрымала ў мінулым годзе за сваю працу прэзідэнцкую прэмію. За што менавіта? Вось што яна расказала. У клубе дзейнічаюць народныя вакальна-інструментальныя ансамблі — дарослы «Гасцінец» і дзіцячы «Вянок». Пры гэтым, напрыклад, «Вянок» заваёўваў Гран-пры на рэспубліканскіх конкурсах «Напеў зямлі маёй», што праходзіў у Мар'інай Горцы, «Памежжа» (у Астраўцы). Дом культуры са сваім ансамблем выйшлі ў фінал праекта тэлебачання «Песні маёй краіны». Зразумела, самадзейныя артысты нярэдка выступаюць перад працаўнікамі гаспадаркі. Дарэчы, Алеся Недапекіна падчас гутаркі настойліва паўтарала: «Гэта добра, што ваша газета выходзіць на нашай, беларускай мове; няўхільна захоўвайце нашу родную мову і надалей». «Цяпер у многіх, калі не ў большасці, на першым плане грошы, а духоўнага вельмі часта не хапае. Выхаванню гэтага духоўнага пачатку вельмі добра служаць і царква з касцёлам, якія размешчаны на тэрыторыі гаспадаркі і са святарамі якіх у нас наладжаны добрыя кантакты», — падводзіў вынік гэтай гутаркі Станіслаў Кандратовіч.

Гэты свайго роду сацыяльны план гаспадаркі можна дапоўніць і такім фактам: у ёй добра клапоцяцца пра сваіх працаўнікоў, а таксама ветэранаў працы, дапамагаючы ім апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі, даючы пэўныя льготы. (Падчас наведвання намі гаспадаркі тут весела аб'ява, згодна з якой яе працаўнікі і ветэраны маглі купіць у ёй збожжа па льготнай цане.)

Але вернемся да спраў вытворчых. На час наведвання гаспадаркі тут сеялі яравыя, падсявалі па азімых канюшыну, рыхтаваліся да сяўбы кукурузы. «Мяркуем выйсці сёлета на значна вышэйшую ўраджайнасць, чым у мінулым годзе, у якім мы несвоечасова падкармілі азімыя, а ў выніку не атрымалі таго, што намячалі. Я ўпэўнены, што і на гэтых не вельмі багатых землях можна здымаць неблагія ўраджаі — да 60—70 цэнтнераў з гектара (у мінулым годзе мы мелі на асобных участках па 50 цэнтнераў). Вядома, каб дасягнуць гэтага, трэба настойліва працаваць», — гаварыў падчас экскурсіі па палях Станіслаў Кандратовіч. А яшчэ ён падкрэсліваў:

— На 100 працэнтаў згодны з Прэзідэнтам краіны ў тым, што мы прадукты харчавання павінны мець максімальна свае. У нас няма нафты і газу, бананы не растуць, але ж збожжа, малако і мяса можам мець сваё. Мы можам купляць тое, чаго ў нас нельга вырасціць, але, напэўна, не павінны купляць пшаніцу. Вядома, для ўсяго гэтага рукі трэба прыкласці. І добра прыкласці. Вось, кажуць, пачаўся ў нас вясенне-палявы сезон. А ён, гэты сезон, скончыцца для сельскага працаўніка нездзе толькі на пачатку лістапада...

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 190560123.

На здымках:

1. Кіраўнік гаспадаркі **Станіслаў КАНДРАТОВІЧ**.

2. Маладому механізатару **Віталію ТРАЦЬЯКУ** даверана сучасная высокадакладная сеялка для падсеву кармавых культур.

3. Будуецца новая вуліца, якую ў гаспадарцы назвалі Паркавай.

4. Аператар жывёлагадоўчага комплексу **Вольга СВІРСКАЯ**.

5. — Тут мы плануем усталяваць млын для вытворчасці камбікармоў, — кажа начальнік жывёлагадоўчага комплексу **Віталь ГАРАСЮК**.

6. Аператар па адкорме цялят **Іна РАМАНОЎСКАЯ** разам са сваімі падапечнымі.

7. На адным з участкаў спіртзавода. За тэхналагічным працэсам сочыць аператар **Жанна ВЯЛІЧКА**.

ЗМЯНЕННІ Ў РАСКЛАДЗЕ РУХУ ЧЫГУНКІ

4 мая ў сувязі з правядзеннем пуцявых работ электрацягнік **Мінск, Інстытут культуры — Асіповічы** на **11.45** будзе ісці да станцыі Пухавічы, а электрычка **Асіповічы — Мінск** на **12.53** адмяняецца на ўчастку Асіповічы — Пухавічы. Электрацягнік **Мінск — Асіповічы** на **13.17** будзе ісці да станцыі Талька, а электрычка **Асіповічы — Мінск** адпраўленнем на **15.59** адмяняецца на ўчастку Асіповічы — Талька. **6 мая** электрычка **Асіповічы — Мінск-Пасажырскі** на **10.31** адмяняецца на ўчастку Асіповічы —

КУПАЛА
VIENNA INSURANCE GROUP

Совместное белорусско-австрийское Закрытое акционерное страховое общество «КУПАЛА» тел. 200 80 27 GSM 682 80 27, 707 80 27, факс 2008013 220004, Минск, ул. Немига, 40 www.kupala.by e-mail: office@kupala.by

Бухгалтерский баланс СБА ЗАСО «Купала» за 2008 год

тыс. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	1 413 327,1	Источники собственных средств — всего	3 983 362,3
Нематериальные активы	18 392,3	В том числе: уставный фонд	2 805 532,3
Финансовые вложения — всего	8 970,6	резервный фонд	193 482,0
В том числе: инвестиции в дочерние общества		добавочный фонд	807 171,1
инвестиции в другие организации		фонд накопления	1 602,4
облигации и другие долговые обязательства		фонд потребления	41 831,3
прочие финансовые вложения	8 970,6	целевое финансирование	
Доля перестраховщиков в страховых резервах	480 535,9	нераспределенная прибыль прошлых лет	
Дебиторы — всего	619 259,9	нераспределенная прибыль отчетного года	133 743,2
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	279 026,6	Страховые резервы и фонды — всего	3 073 689,5
депо премий по рискам, принятым в перестрахование		В том числе: страховые резервы	2 739 296,4
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	340 233,3	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	334 393,1
Прочие активы — всего	5 283 407,4	гарантийные фонды	
В том числе: незавершенное строительство		Кредиторы — всего	766 841,4
материальные ценности и затраты	109 081,8	В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	53 094,7
денежные средства	5 174 325,6	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	
собственные акции (доли)		депо премий по рискам, переданным в перестрахование	
прочие активы		заемные средства	461 571,0
Непокрытые убытки прошлых лет		кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	252 175,7
Непокрытые убытки отчетного года		Прочие пассивы	
БАЛАНС	**7 823 893,2**	**БАЛАНС**	**7 823 893,2**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ СБА ЗАСО «Купала» за 2008 год

тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	010	
Страховые выплаты	020	
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	
Отчисления в гарантийный фонд	040	
Расходы на ведение дела	041	
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	
II. Страхование иное, чем страхование жизни Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	6 203 160,1
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-704 606,4
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	3 490 236,2
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	240 723,7
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	208 535,8
Расходы на ведение дела	120	2 460 329,3
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	168 353,9
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	101 288,7
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	-352 758,7
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II Операционные доходы	140	372 991,0
Операционные расходы	145	5 020,9
Внереализационные доходы	150	293 549,7
Внереализационные расходы	155	34 445,9
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	133 743,2

Аудитор — Общество с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит», лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0416620 от 14.11.2005 г. выдана Министерством финансов РБ, полагает, что бухгалтерская отчетность СБА ЗАСО «Купала», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение СБА ЗАСО «Купала» на 01.01.2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г., при этом совершенные СБА ЗАСО «Купала» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Працяг тэмы

НЕЛЕГАЛЬНЫ ПЕРАВОЗЧЫК НЕПЕРАМОЖНЫ?

Наш карэспандэнт пабывала ў рэйдзе з транспартнай інспекцыяй

Пасля артыкула «Хто ж нас выганіць? Мы пусцілі карані на вакзале», апублікаванага ў нашай газеце 25 сакавіка гэтага года, Міністэрства транспарту даслала ў рэдакцыю ліст (які мы таксама друкавалі 22 красавіка пад назвай «Тэрміналам» па нелегалах»). Ён заканчваўся запрашэннем у рэйд па выяўленні нелегальных перавозчыкаў на міжгародніх, так званых нерэгулярных маршрутах — «у мэтах максімальна аб'ектыўнага асвятлення» на старонках газеты. Дагэтуль, на мой погляд, мы і былі аб'ектыўнымі, праверылі ўсё на ўласным вопыце: першы раз па неабходнасці, другі — у якасці эксперыменту я спакусілася на прапановы «бамбілаў» на Маскоўскім аўтавакзале і паехала з імі па маршрутах «Мінск — Лепель» і «Лепель — Бешанковічы». Ні квіткоў, ні касавых апаратаў, ні падпарадкавання правілам дарожнага руху, ні бяспекі, ні гарантый з аднаго боку. І зразумела, ні праверак, ні штрафаў, ні падаткаў.

Тэма тым часам мяне настолькі зацягнула, што, знаходзячыся непадалёк, не магу абмінуць Маскоўскі вакзал і не паглядзець, што змянілася з моманту выхаду артыкулаў і рэагавання Міністэрства транспарту. За калонай хаваецца ўсяго адзін (раней іх быў натоўп) прадпрымальнік, прычым, як сведчаць нумары на яго мікрааўтобусе, прыпаркаваным побач на стаянцы, афіцыйна аформлены. На мой зацікаўлены позірк ён ніяк не рэагуе і не прапануе мне паездку ні ў Віцебск, ні ў Лепель. Або мне не шанцуе, або штосьці ўсё ж мяняецца, і гэта прыемна.

З транспартнай інспекцыяй узгадняем час рэйду — выбіраем самы пік дзейнасці перавозчыкаў: другая палова пятніцы перад Вялікаднем. Месца таксама мне прапануюць бойкае — стаянка на вуліцы Бабруйскай насупраць чыгуначнага вакзала — месца адпраўлення на Гродна і ўсе больш-менш значныя пункты Гродзенскай вобласці (Навагрудак, Ліду, Слонім), а таксама Салігорск і Слуцк, дзе, дарэчы, існуе, бадай, самая буйная і разрэкламаваная кампанія, якая даўно стала асноўным перавозчыкам у Салігорску — «Дзясятачка». У «Дзясятачкі», як паказала потым праверка, усё зусім не на дзясятачку, але аб усім па парадку.

На аўтамабілі Дзяржаўтаінспекцыі разам са спецыялістам аддзела кантролю транспартнай інспекцыі па г. Мінску і Мінскай вобласці Міністэрства транспарту і камунікацый Мікалаем Каланцовым мы пад'язджаем на стаянку на згаданай вуліцы Бабруйскай. Сярод натоўпу кіроўцаў назіраецца лёгкая разгубленасць. Інспектара Каланцова большасць кіроўцаў, афіцыйных і неафіцыйных, ведае. Пачынаем з крайняга мікрааўтобуса — ён і належыць перавозчыку, які не зарэгістраваны як прадпрымальнік і, адпаведна, не мае ні ліцэнзіі, ні права на перавозку пасажыраў. У салоне, тым не менш, шэсць дадаткова ўсталяваных сядзенняў (усяго 14) і поўны камплект пасажыраў, якія вось-вось павінны адправіцца ў Гродна. Пры з'яўленні інспектараў на дапамогу нелегалу прыходзіць калега, дакладней, падбягае і прапануе свае дакументы, інспектар так і адрэкамендуе яго мне: «Гэта наш афіцыйны перавозчык, спадар Малец, гатовы даць справаздачу ў любы момант». Спадару Мальцу даюць зразумець, што правяць яго будуць у парадку чаргі. Пакуль жа складаюць акт на нелегальнага перавозчыка. Уладзімір, а менавіта так ён назваўся, па прычыне хваробы быў вымушаны звольніцца з працы, ні інваліднасці, ні пенсіі не атрымаў, з той пары пакрыўджаны літаральна на ўсіх. Штомесяц яго выплата па крэдыце на мікрааўтобус — 900 тысяч. Акрамя таго, трэба сям'ю карміць, жонку і сына. З гэтага месца звычайна ва ўсіх парушальнікаў пачынаюцца адны і тыя ж слязлівыя гісторыі кшталту таго, што «жонка ў анкалагічным аддзяленні і дзядуля на вакзале хворы ляжыць». Яны перастаюць уражваць, калі чуеш іх ад кожнага. Яшчэ адзін папулярны адказ пытанням на пытанне: «Я што, красці пайшоў?» Пытаю, чаму Уладзімір не афармляецца як прыватны прадпрымальнік. «А вы ведаеце, колькі каштуе пераабсталяваць мікрааўтобус? Дванаццаць тысяч доларaў. У вас ёсць такія грошы? У мяне — няма». Далей ідзе наша спрэчка наконт бяспекі паездкі з такімі, як ён, перавозчыкамі. Уладзімір пераконвае мяне, што факт наяўнасці за спінай пасажыраў прымушае ездзіць гэтак жа асцярожна, як быццам бы ў машыне ўласныя дзеці. І я гатовая яму верыць, вось толькі папярэдні мой вопыт сведчыць пра адваротнае. Нават наяўнасць маёй трохгадовай дачкі за спінай кіроўцы ніколькі не бянтэжыла апошняга і ні ў якім разе не была яму перашкодай ехаць з хуткасцю 120.

Складаннем акта транспартнай інспекцыяй Уладзімір не тое што не спалоханы, наадварот, дэманструе поўнае раўнадушша, бо ведае, як сябе паводзіць, як і тое, што застанецца беспакараным. Ён адмаўляецца падпісваць дакумент, увогуле на ўсе пытанні інспектара адказвае: «Пасведчання кіроўцы з сабой няма, пішы што хочаш». І сапраўды, шанцаў яго пакараць няшмат. Складзены акт транспартная інспекцыя накіроўвае ў падатковую інспекцыю па месцы жыхарства парушальніка. І аштрафаваны ён будзе толькі ў выпадку, калі падатковыя інспектары ажыццявяць так званую падсадку і засведчаць факт камерцыйнай дзейнасці. Максімальны штраф — дзве базавыя велічыні.

На афіцыйнае пераабсталяванне мікрааўтобуса грошай не знайшлося, затое шэсць дадатковых месцаў уладальнік мікрааўтобуса ўсталяваў самастойна. І, развітаўшыся з транспартнай інспекцыяй не першы і не апошні раз, з упэўненасцю ва ўласнай невінаватасці і беспакаранасці, Уладзімір сеў у мікрааўтобус, пасажыры якога, як памятаем, чакалі паездкі ў Гродна. Ад'ехаўшы сотню метраў ад стаянкі, мікрааўтобус быў зноў спынены — на гэты раз супрацоўнік ДАІ, які працаваў з намі, складае акт аб незаконным пераабсталяванні транспартнага сродку і ўстаноўцы дадатковых сядзенняў. Афармленне зацягваецца хвілін на 40. Тут відаць, што Уладзімір пачаў нервова курыць, хадзіць узад-уперад і тэлефанаваць, трэба думаць, патрэбным людзям. На гэты раз штраф яго чакае рэальны. Мяркую, што і пасажыры былі не надта ўзрадаваныя такой затрымцы, толькі, як заўважаюць інспектары, калі б затрымка здарылася з рэйсавым аўтобусам, закідалі б скаргамі ўсе інстанцыі, а тут і не падумаюць, ды і скардзіцца ім, па сутнасці, няма на каго.

Пакуль ДАІшнік заняты, мы падыходзім да мікрааўтобусаў салігорскага напрамку. Патрабаваць дакументы не мае сэнсу, без даішніка кіроўцы нахабнічаюць і міла жартуюць, што едуць з дзяўчатамі на прыроду. Пасажыры кіроўцаў пакрываюць заўсёды — не было выпадкаў, каб хтосьці прызнаўся, куды і якім чынам едзе. Адна дзяўчына адкрыта абураецца, маўляў, заўсёды ездзілі проста так, а сёння раптам трэба запаўняць паперкі. Такой бессэнсоўна тлумачыць, што «паперкі» кіроўцы абавязаны запаўняць заўсёды, у мэтах яе ж уласнай бяспекі.

Салігорскія кіроўцы, якіх «забяспечвае» пасажырамі вышэйзгаданая дыспетчарская кампанія «Дзясятачка» (пасажыру трэба толькі патэлефанаваць дыспетчару і запісацца на пэўны час адпраўлення з Мінска), таксама не ўсе працуюць легальна. Нелегалы разлічваюцца з дыспетчарамі так званым чорным налам — ніхто не панясе страту. Рух мікрааўтобусаў у салігорскім напрамку, пэўна, адладжаны з вайсковай дакладнасцю, а тое, што куды часцей, чым на вакзале — дакладна. Нелегальныя кіроўцы, карыстаючыся занятасцю супрацоўніка ДАІ, робяць выгляд, што транспартную інспекцыю не заўважаюць, — зачыняюць дзверы і едуць. Звычайна за такімі падчас праверак даводзіцца наладжваць сапраўдныя пагоні на міліцэйскіх машынах. Але не ў гэты раз: наш даішнік, паспрабаваўшы дагнаць аднаго з такіх уцекачоў, ад гэтай задумы хутка адмаўляецца.

Высвятляецца, што Бабруйская — не адзіны пункт прыватных перавозчыкаў на вакзале. Побач са станцыяй «Дружная» месца адпраўлення ў брэсцкім кірунку. Тут і аўтобусаў не так шмат — мы знаходзім усяго тры. За рулём — дужыя мужчыны з самымі сур'ёзнымі намерамі. Адзін з іх афіцыйны перавозчык, астатнія хуценька інструктуюць пасажыраў, праўда, «суседкі» і «пляменніцы» не могуць назваць нават прозвішча «свояка». Нелегалаў таксама чакае складанне актаў транспартнай інспекцыяй.

Фота Пятра ФАМІНА.

Бліжэй да шасці гадзін вечара двары дамоў на вуліцы Бабруйскай запаўняюцца мікрааўтобусамі, прычым нумарныя знакі выдаюць прыналежнасць да аднаго рэгіёну — Гродзенскай вобласці. Міграцыя ў гэтым напрамку, як расказваюць інспектары, асабліва актыўная. Але праверка страчвае ўсялякі сэнс — супрацоўнік ДАІ па неадкладных службовых справах адбывае роўна ў 16.45. На адну толькі транспартную інспекцыю кіроўцы рэагуюць або цалкам раўнадушна, або занадта раздражнёна, прычым у абодвух выпадках дакументы патрабаваць бессэнсоўна. У дварах кіроўцы не столькі хаваюцца, колькі проста чакаюць свайго часу. На стаянцы на Бабруйскай у гэты час кіпіць жыццё — яна амаль цалкам застаўленая мікрааўтобусамі, іх дзясяткі.

Мне расказваюць, што ў Германіі, калі маршрутны аўтобус раптам заязджае ў горад, які не пазначаны ў яго пуцявым лісце, ён тут жа дастаўляецца на штрафную стаянку. І застаецца там да той пары, пакуль вадзіцель не апладыруе штраф у 2,5 тысячы еўра і дадаткова кожны дзень знаходжання на гэтай стаянцы. Бяспечнасць пасажыра там — на першым месцы. Прычым праверыць можа любы паліцэйскі, які выконвае функцыі нагляду даішніка. На гэтым нярэдка пападаюцца нашы кіроўцы па прычыне няведання нямецкіх законаў, расслабленыя нашай бесшабашнасцю. Адзінае, за што штрафуюць нашы даішнікі нелегалаў — усталяванне дадатковых сядзенняў. Астатняе іх не надта цікавіць. Мне задаюць рытарычнае пытанне: як змагацца з нелегаламі? У сённяшніх умовах, мне здаецца, барацьба не мае вялікага сэнсу. Да кожнага перавозчыка не прыставіш транспартнага інспектара з даішнікам, ды і што для іх мізэрны штраф? Хоць дзеля справядлівасці трэба прызнаць, што праверкі даюць свой плён. Працяглая барацьба з некаторымі нелегаламі прымушае іх атрымліваць ліцэнзіі і ўпарадкоўваць сваю дзейнасць згодна з заканадаўствам. І прыкладаў легальнай дзейнасці дастаткова — гэта не толькі салігорская «Дзясятачка» і магілёўскія «Дзве сталіцы», ёсць шэраг невялікіх прыватных кампаній накшталт слонімскай «Мроя Тур». Але цалкам відавочна і іншае — пасажырскія перавозкі — сфера, дзе круцяцца вялікія грошы, падаткаў з якіх дзяржава сёння не даатрымлівае на мільёны рублёў. І ніякія праверкі не прымусяць цалкам яе легалізаваць, пакуль няма адпаведных законаў. Чаму б не павучыцца ў Германіі?

Алена АЎЧЫННІКАВА.

БЕЛАРУСЫ ЗАПРАГАЮЦЬ ПАВОЛІ...

СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАРЭСПАНДЭНТ «ЗВЯЗДЫ» ПЕРАДАЕ СА ШВЕЙЦАРЫІ

Сёлетні 73-і чэмпіянат свету па хакеі, які праходзіць у швейцарскіх гарадах Берне і Цюрыху, для беларускай каманды можна ўжо лічыць паспяховым. Як-ніяк, а падначаленыя Глена Хэнлана з першай спробы змаглі прабіцца ў другі раўнд сусветнага форуму.

Большасць фанатаў прыбылі з Беларусі ў Швейцарыю на аўтамабілях, і кожны з іх наўрад ці ўяўляў сабе, што можна адматаць дзве тысячы кіламетраў і быць сведкамі нядаўдалай гульні нацыянальнай зборнай — ні ў якім разе! Чаго толькі варты «марш-кідок» на колах аўто бацькі і дзеда беларускага форварда «Таронта» Міхаіла Грабоўскага!

Цюрых сустрэў нас без асаблівага энтузіязму. На германа-швейцарскай мяжы, нягледзячы на агульнасць еўрасаюзаўскай зоны, беларускі пашпарт быў адпаведным чынам правераны на яго прыдатнасць і сапраўднасць візы. У дадатак да праезду па швейцарскіх аўтабанах і звычайных дарогах на ўвесь перыяд знаходжання неабходна выкласці 30 еўра за дарожную страхоўку. Дзіўна, але яе ў такім жа аб'ёме афармляюць нават веласіпедыстам. Пра хакей тут мала што нагадвала, хоць гэтае слова, сказанае ў адрас мясцовых мытнікаў і паліцэйскіх, дзейнічала безадмоўна. Машыну ніхто не шманаў, не правяраў на наяўнасць беларускага сала, каўбасы і кансерваў, якія ў краіны Шэнгенскага пагаднення правозіць забаронена. Адразу кінуўся ў вочы вялікі кантраст: халаднаваты вечар і квітнеючыя дрэвы, у тым ліку і садовыя...

Відавочна, што хакей у жыцці жыхароў Цюрыха займае значна меншае месца, чым садаводства, бо ў горадзе практычна не сустрэць адпаведных рэкламных шчытоў і расцяжак. Яно і зразумела — нацыянальная зборная Швейцарыі выступае ў Берне. А значыць, сталіцы і ўся ўвага. Праўда, гэтыя абставіны ніякім чынам не паўплывалі на напаўненне прэс-цэнтра журналістамі. Многія з іх, як высветлілася, ужо не першы раз у гэтай альпійскай краіне з падобнай мэтай. Апошні чэмпіянат свету Швейцарыя прымала ў 1998 годзе.

ГУЛЬНЯ ПЕРШАЯ

Стартавы матч з канадцамі наўрад ці ў каго з нас асацыяваўся з пераможным трыумфам. Роданачальнікі хакея нават без вялікай долі значна мацнейшых гульцоў, якія цяпер задзейнічаны ў матчах плей-оф Кубка Стэнлі, выглядаюць на парадак вышэй за ўсіх удзельнікаў нашай групы «А», што яны даказалі ў заключнай сустрэчы папярэдняга раўнда са славакамі, перайграўшы іх з лікам 7:3. Тым не менш, паводле пасляматчавага каментарыя галоўнага трэнера беларусаў Глена Хэнлана, хакеісты тры тыдні мэтанакіравана рыхтаваліся да суседнага першынства, у той час як канадцы на лёдзе не стаялі. Пэўна, што Хэнлан такім чынам зрабіў рэверанс у адрас сваіх землякоў, бо пасля леташняга паражэння ў фінале чэмпіянату свету ад расіян «Кляновыя лісты» пакляліся вярнуць сабе чэмпіёнскі тытул любой цаной. А як жа гэта зрабіць без належнай падрыхтоўкі?! Ды і паражэнне беларусаў з лікам 1:6 наўрад ці можна спісаць толькі на фактар страху перад грозным супернікам.

У складзе беларусаў нямала навічкоў, якім яшчэ рана цягацца з такімі грандамі, як канадцы, падкрэслівае Хэнлан, тым не менш, зрабіў высновы ён, гульня супраць сваіх жа землякоў дала нямала інфармацыі для далейшых дзеянняў. Але яшчэ раз нагадаў, што супрацьстаяць 20 прадстаўнікам НХЛ — для любой зборнай, што гуляюць цяпер у Цюрыху і Берне — задача няпростая. Зрэшты, у зборнай Канады ў складзе толькі адзін «неэнхаэлавец» — паўабаронца чарапавецкай «Паўночсталі» Джоэл Квяткоўскі.

ГУЛЬНЯ ДРУГАЯ

Матч супраць славакаў разглядаўся як ключавы. Славацкая зборная, якая пачала свой самастойны хакейны шлях з 1994 года, сёння не ў фаварытах. У леташнім чэмпіянаце свету нашы супернікі ледзь вынеслі ногі, каб застацца ў хакейнай эліце.

За апошнія гады баланс сустрэч беларусаў і славакаў быў роўным. На анагагічным турніры-2006 у Рызе нашы выйгралі 2:1, узяўшы такім чынам рэванш з такім лікам за паражэнне годам раней у Аўстрыі.

Цяпер жа чакалася прынцыповая дуэль двух супернікаў прыкладна роўных па класу за прынцыповае 2-е месца ў групе. На наша шчасце, удача намаганнямі ўсёй каманды, асабліва Андрэя Мезіна і Алега Антоненкі, была на нашым баку. Па пенальці мы выйгралі 2:1. Можна не сумнявацца, што беларускаму галкіперу апладзіраваў увесь магнітагорскі «Металург», колеры якога беларус цяпер абараняе. Не менш кампліментаў, напэўна, дасталося і форварду ФК МУС з падмаскоўнай Балашыхі Алегу Антоненку, які змог запар рэалізаваць два буліты, што ў хакеі нячастая з'ява.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі настаўнік беларусаў Глен Хэнлан прызнаўся, што ён вельмі задаволены перамогай. Відавочна, што трэнерскі штаб дарэмна патрабаваў у гульцоў у папярэдняй гульні выйграць у канадцаў. Патрэбна было проста згуляць у сваю сілу . Што датычыцца выйгранай сустрэчы ў славакаў, то пазаночнаамерыканскі трэнер выказаў вялікую ўдзячнасць за самаадданасць не толькі гульцам, але і беларускім балельшчыкам. Некалькі дзясяткаў беларусаў не ўступалі ў эмоцыях славацкім фанам. Калі закончу трэнерскую кар'еру, не без долі гумару сказаў канадзец, абавязкова прыеду ў Беларусь у якасці балельшчыка.

МАТЧ ТРЭЦІ

Пасля папярэдняга паражэння венграў ад канадцаў з разгромным лікам 0:9 магло падацца, што беларусаў чакае лёгкая прагулка. Зрэшты, пачатак сустрэчы даў у гэтым упэўненасць. За хуткай шайбай Аляксея Калюжнага хацелася галявога працягу. Аказваецца, што чаканні могуць быць адны, а вынік — іншы. Венгерская зборная, у складзе якой няма ніводнага гульца не толькі Нацыянальнай хакейнай лігі, але і расійскага чэмпіянату, — моцны арэшак. Хоць на сёння яна ў сусветным рэйтынгу займае толькі 20-ю пазіцыю, і апошні раз выступала ў дывізіёне мацнейшых у далёкім 1937 годзе, паказаўшы лепшы вынік за ўсю гісторыю хакея — 5-е месца. Тым не менш у стартавым пядынку венгры саступілі славакам 3:4 усяго за 13 секундаў да фінальнай сірэны. А тут яшчэ велізарная падтрымка некалькіх тысяч венгерскіх фанаў. Тым не менш гэтага было мала, каб фартуна да іх павярнулася тварам. На гэты раз яна ўсміхнулася беларусам. Галы напрыканцы сустрэчы Аляксея Угарава і Міхаіла Грабоўскага паставілі ў паядынку рысу — 3:1.

У размове з журналістамі Глен Хэнлан падкрэсліў, што гульня з венграмі для яго падначаленых з самага пачатку насіла прынцыповы характар. У суперніка была вялікая матывацыя — ім патрэбна была толькі перамога. Таму давялося даволі няпроста. На кон, па вялікім рахунку, былі пакладзены не толькі выхад у кваліфікацыйны раўнд, сказаў канадскі трэнер, але і выбары сталіцы чэмпіянату-2014. На яго правядзенне, як вядома, прэтэндуюць і беларусы, і венгры. Цяпер, трэба меркаваць, Мінск яшчэ на крок прыблізіўся да запаветнай мары.

Карэспандэнту «Звязды» адразу пасля заканчэння сустрэчы беларусаў з венграмі ўдалося пагутарыць з Андрэем Мезіным і Міхаілам Грабоўскім. Андрэй Мезін падкрэсліў, што нават у самых экстрэмальных сітуацыях трымае руку на пульсе і не паддаецца эмоцыям, нават калі яны ў зале перапаўняюць душы балельшчыкаў і гульцоў. Паводле меркавання галкіпера, задача беларускай каманды — прабіцца ў васьмёрку мацнейшых.

Міхаіл Грабоўскі, які пакуль з'яўляецца лепшым бамбардзірам беларускай каманды па сістэме гол+пас (4 балы), прызнаўся, што ў матчы з канадцамі яму давялося паіншаму паглядзець у вочы сваім аднаклубнікам з «Таронта» Луку Шону і Іану Уайту — як супернікам. Але ж гэта дробязі ў параўнанні з тым, падкрэсліў Грабоўскі, што беларускай камандзе ўдалося паспяхова прайсці папярэдні этап хакейнага турніру. А яшчэ Міхаіл выказаў словы ўдзячнасці ўсім беларускім балельшчыкам, якія горача падтрымліваюць беларускую каманду ў зале Цюрых-Клатэн у хакейнай амуніцыі. І гэта пры тым, што білет на месцы не за варотамі каштуе каля 100 долараў ЗША. А хакейны свіцар з гербам Беларусі цягне на цэлых 100 еўра. Так віват беларускім балельшчыкам!

Можна не сумнявацца, што патрыятычныя пачуцці беларускіх фанаў і журналістаў спатрэбяцца на другім этапе турніру, які пройдзе таксама на гэтай жа хакейнай арэне ў Цюрыху. Для нашай каманды ўжо вядомы расклад гульняў. 30.04. (16.15 па мясцовым часе) — з пераможцай учарашняга матча Нарвегія — Фінляндыя; 02.05. (20.15) — з прайграўшай камандай матча Фінляндыя — Чэхія; 03.05. (20.15) — з пераможцай матча (Фінляндыя — Чэхія).

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Швейцарыя, Цюрых.

На слыху

ЛЯСНЫ ПАЖАР. І НЕ ТОЛЬКІ...

Якое стаіць надвор'е, нікому казаць і не трэба. Таму важна быць вельмі пільнымі пры абыходжанні з агнём, чаго, на жаль, не разумеюць многія людзі. Відавочна, з-за нейкага недагляду той агонь і прыйшоў лесам з суседняй Украіны ў наш Мілашэвіцкі лясгас, што ў Лельчыцкім раёне.

Падрабязнасці здарэння мы даведаліся ў галоўнага ляснічага Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Сяргея Кашалевіча па мабільнай сувязі, бо ён якраз у той момант знаходзіўся на пажары, якія пачаўся ў другой палове дня 27 красавіка і ў ноч на 28-ае чысло быў лакалізаваны сіламі лясной аховы і раённым аддзелам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У тушэнні яго былі задзейнічаны больш за сто чалавек, тры пажарныя аўтамабілі, тры трактары.

Але гэтага было недастаткова, бо лес гарэў на плошчы каля пяцісот гектараў. Таму дадаткова былі прыцягнуты новыя сілы, цяжкая тэхніка, сучасныя сродкі тушэння агню і недапушчэння выхаду яго за агараджальныя палосы. На час перадачы інфармацыі аб гэтым здарэнні работы працягваліся.

А наогул за мінулыя выхадныя дні на Гомельшчыне адбылося 25 пажараў. У адным з іх у Добрушы загінуў 44-гадовы мужчына. У вёсцы Замошша Лельчыцкага раёна быў пашкоджаны дом і агнём знішчаны хлеў і 25 вулляў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЦЁПЛЫЯ ВЫХАДНЫЯ ДНІ — ГАРАЧЫЯ БУДНІ ДЛЯ ПАЖАРНЫХ

25 красавіка ў вёсцы Ізбужар Касцюковіцкага раёна на пажары загінуў 80-гадовы мужчына. Гаспадар дома спрабаваў выратаваць ад агню кароў. Ён забег у пуню, а вярнуцца не здолеў.

27 красавіка раніцай пажар здарыўся на лецішчы ў вёсцы Мяжысеткі Магілёўскага раёна. Гаспадар сам замяніў газавы балон і праверыў шчыльнасць далучэння з дапамогай адкрытага агню. 60-гадовы мужчына абпаліў 20 % паверхні цела і цяпер знаходзіцца ў бальніцы.

27 красавіка ў вёсцы Любаны Слаўгарадскага раёна загаръўся цялятнік. Выратавальнікам разам з работнікамі сельскай гаспадаркі давялося эвакуіраваць 170 цялятаў.

— Пажарная сітуацыя ў вобласці застаецца складанай у сувязі з сухім і цёплым надвор'ем, — пракаментаваў прэс-сакратар Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Юрый Мятліцкі. — Пажарныя выязджалі на самавольны падпал сухой раслінасці ўжо 179 разоў! З прычыны падпалаў травы адбылося 26 пажараў, у выніку якіх былі пашкоджаны альбо зусім згарэлі 14 дамоў і 45 гаспадарчых пабудоў.

Ілона ІВАНОВА.

Страховые полисы ЗАСО «Кентавр» по добровольному виду страхования серии КЕ № 0069132, 0069133, 0069248—0069253, 0069354, 0069363 (форма 2 РН) считать недействительными.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, в том числе: **ЛОТ № 2** – арочное сооружение с лесопильной рамой (501,8 кв.м) по адресу: Узденский р-н, пос. Смолзавод. Нач. цена 71 713 770 бел. руб.; **ЛОТ № 3** – цех сборного железобетона с подстанцией и пропарочной камерой (921,7 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 25 199 910 бел. руб.; **ЛОТ № 4** – склад заполнителей (202,8 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 13 531 860 бел. руб. Начальные цены лотов снижены на 20 %. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.04.2008 г. Аукцион состоится **19.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.05.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

Совместного открытого акционерного общества «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика»

12 мая 2009 года в 10.00 в административно-хозяйственном здании СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика», расположенном по адресу: город Минск, улица Володько, 6, состоится внеочередное общее собрание акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:

1. О реорганизации СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика» путем выделения структурного хозрасчетного подразделения и создания на его базе нового хозяйственного общества.

2. Об определении состава учредителей нового хозяйственного общества и распределении их долей в уставном фонде нового хозяйственного общества.

Начало регистрации акционеров в 9 часов 30 минут.
При себе иметь документы, удостоверяющие личность и полномочия.

Наблюдательный совет
СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум — наша косметика».

УНН 100092830

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ ЗАСУЛЬСКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА СТОЛБЦОВСКОГО Р-НА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов пл. 0,2191 га, расположенного по адресу: Столбцовский р-н, д. Засулье, ул. Социалистическая, 30. Начальная цена 237 120 бел. руб. Задаток — 20 000 бел. руб. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации в сумме 1 238 458 бел. руб. Все желающие могут ознакомиться с земельным участком и документацией на него. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **02.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.05.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже: **ЛОТа № 1** – здание блочного склада (1252,9 кв.м) по адресу: Воложинский р-н, д. Городьки. Пл. зем. уч. 0,1647 га. Нач. цена 186 240 890 бел. руб. с НДС; **ЛОТа № 2** – здание склада «Модуль» (878,5 кв.м) по адресу: Воложинский р-н, д. Городьки. Пл. зем. уч. 0,1177 га. Нач. цена 165 000 000 бел. руб. с НДС; **ЛОТа № 3** – здание магазина № 124 (73,8 кв.м) по адресу: Воложинский р-н, г.п. Ивенец, ул. Я. Купалы. Пл. зем. уч. 0,0354 га. Нач. цена 13 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете Звязда от 15.08.2008 г. Аукцион состоится **19.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.05.2008 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже автомобиля КАМАЗ – 43105 (1984 г.в.) с гидроманипулятором и прицепом-роспуском. Нач. цена снижена на 20 % – 15 128 704 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете Звязда от 17.01.2009 г. Аукцион состоится **19.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.05.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ ОСТРОШИЦКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Логойском районе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Наличие инженерных сетей	Наличие ограничений в использовании земель	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по документации (бел. рублей)
1	д. Лобунщина, уч. № 4, 623286304101000042	0,2500	в непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения	водоохранная зона ручья	2 579 720	250 000	1 290 600 (по каждому лоту)
2	д. Лобунщина, уч. № 5, 623286304101000043	0,2500			2 579 720	250 000	
3	д. Чуденичи, 623286308101000197	0,1572		—	3 157 220	310 000	1 280 470 (по каждому лоту)
4	д. Чуденичи, 623286308101000201	0,1510		охранная зона ЛЭП напр. свыше 1000 вольт (0,0243 га)	3 032 700	300 000	
5	д. Чуденичи, 623286308101000198	0,1502		охранная зона ЛЭП напр. свыше 1000 вольт (0,0210 га)	3 032 700	300 000	
6	д. Чуденичи, 623286308101000199	0,1496		охранная зона ЛЭП напр. свыше 1000 вольт (0,0178 га)	3 004 580	300 000	
7	д. Метличино, уч. № 4, 623286305101000038	0,1518	сети электроснабжения	водоохранная зона реки Веснянка	863 290	85 000	1 290 600

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **02.06.2009 г.** в 15.00 по адресу: Логойский р-н, аг. Острошицы, Острошицкий сельисполком. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.05.2009 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

на право заключения договоров аренды земельных участков под строительство объектов придорожного сервиса и туризма

№ лота	Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель)	Характеристика земельного участка	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Право заключения договора аренды земельного участка, расположенного по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, возле д. Стоки, У-1, кадастровый номер 425282000001000002. Арендодатель – Свислочский районный исполнительный комитет	0,1047 га, в том числе: 0,0727 га – прочие лесопокрытые земли, 0,0320 га – прочие неиспользуемые земли; **ограничения в использовании земель по перечню № 1:** размещение в водоохранных зонах и прибрежных полосах водных объектов – 0,1047 га	0,1047	51	Для строительства объекта туризма – дома охотника	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - возмещение победителем аукциона потерь лесохозяйственного производства, связанных с изъятием участка земель лесного фонда для нужд, не связанных с ведением лесного хозяйства, путем перечисления на транзитный счет Управления государственного казначейства, открытый для инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь, по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 02 (код платежа 05202) 1 652 800 рублей; - заключение победителем аукциона со Свислочским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Свислочского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - осуществление победителем аукциона строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	7 475	747
2	Право заключения договора аренды земельного участка, расположенного по адресу: Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. Волковича, на автомобильной дороге Р-41 Слоним-Мосты-Скидель-граница Литовской Республики (Поречье), кадастровый номер 424050100003000039. Арендодатель – Мостовский районный исполнительный комитет	0,1625 га, в том числе: 0,1337 га – под древесно-кустарниковой растительностью, 0,0288 га – под улицами, площадями и др. местами общего пользования; **ограничения в использовании земли по перечню № 7:** расположение в охранной зоне коммунальных водопроводов и канализации – 0,0059 га	0,1625	50	Для строительства объекта придорожного сервиса – пункта питания	- в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, и не позднее 2 последующих рабочих дней заключить договор аренды с райисполкомом; - в двухмесячный срок со дня принятия решения о предоставлении земельного участка зарегистрировать возникновение права аренды этого участка в Мостовском бюро Волковысского филиала РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; - приступить к проектированию объекта после выполнения вышеперечисленных условий, и получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ; - осуществить разработку строительного проекта в срок, не превышающий 2 лет со дня получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ; - приступить к строительству объекта после разработки, утверждения и экспертизы строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - при необходимости строительства инженерных сетей к объекту придорожного сервиса оформить материалы предварительного согласования места размещения земельных участков для строительства этих сетей	3 759 756	375 975
3	Право заключения договора аренды земельного участка, расположенного по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, Подоросский с/с, южнее деревни Подороск, У-9, на 98 км автомобильной дороги Р-44 Гродно-Ружаны-Ивацевичи, кадастровый номер 420883700001000001. Арендодатель – Волковысский районный исполнительный комитет	1,0006 га, в том числе: 0,7406 га – пахотные земли, 0,2600 га – прочие земли	1,0006	50	Для строительства объекта придорожного сервиса – автомобильной заправочной станции с пунктом питания	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - возмещение победителем аукциона убытков и упущенной выгоды ГСУП «Подороск» в сумме 751 946 рублей, причиненных изъятием земельного участка; - использование победителем аукциона снимаемого плодородного слоя почвы для благоустройства прилегающей территории; - заключение победителем аукциона с Волковысским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Волковысского райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на него; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Волковысского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - осуществление победителем аукциона строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	443 161	44 316
4	Право заключения договора аренды земельных участков, расположенных по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, район д. Песчаны в зоне Августовского канала, У-1 кадастровый номер 422000000009003887 У-2 кадастровый номер 422000000009003889. Арендодатель – Гродненский районный исполнительный комитет	4,6514 га, в том числе: прочие земли — 3,1654 га, под лесопосадками — 0,5445 га, под дорогами — 0,1013 га, под древесно-кустарниковой растительностью — 0,5940 га, под каналами и канавами — 0,0802 га, земли общего пользования — 0,0151 га, пески - 0,1509 га **У-1 площадью 4,0315 га, ограничения в использовании земель по перечню № 1** в водоохранных зонах водных объектов – 4,0315, **по перечню № 6** в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 вольт – 0,0947 га. **У-2 площадью 0,6199 га, ограничения в использовании земель по перечню № 1** в водоохранных зонах водных объектов	4,6514	51	Для строительства объекта туризма – «Рыбацкая деревня»	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - возмещение победителем аукциона потерь лесохозяйственного производства, связанных с изъятием земель лесного фонда для нужд, не связанных с ведением лесного хозяйства, путем перечисления на транзитный счет Управления государственного казначейства, открытый для инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь, по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 02 (код платежа 05202) 19 638 800 рублей; - заключение победителем аукциона с Гродненским райисполкомом договора аренды земельных участков и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельных участков государственной регистрации права на земельные участки; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Гродненского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - осуществление победителем аукциона строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	65 974 264	6 597 420

1. Аукцион состоится **4 июня 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Заключительная регистрация участников **4 июня 2009 года с 8.30 до 10.30.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Организатор аукциона – Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: (0152) 74 53 86, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней).

3. **Последний день приема документов** на участие в аукционе – **2 июня 2009 года до 13.00 часов, кабинет 6.**

4. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица.

5. К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора аукциона;

- **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность;

- **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона: р/с № 3642900000187 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 752. Получатель – Фонд «Гроднооблимущество», УНП 500044549.

7. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

8. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка.

9. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

ПОЯС ЯК ПОВЯЗЬ

Слуцкія паясы: прыемна паглядзець, але хочацца валодаць

Тэрмін экспанавання ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі слуцкіх паясоў з калекцыі расійскага Гістарычнага музея прадоўжаны яшчэ на год — да мая 2010 года. Так дамовіліся расійскі і беларускі бакі. Вядома ж, рашэнне можна лічыць радасным для нас, пры гэтым канстатаваўшы, што сенсацыі ўсё-такі не адбылося. Таму што самым лепшым варыянтам для Беларусі быў бы той, які дазволіў бы мець гэтае ўвасабленне нашай гісторыі ў сябе на радзіме пастаянна, з ласкі расійскага боку. Гэта значыць ва ўласнасці. І захады для гэтага рабіліся некалькі апошніх гадоў, калі вяліся перамовы на даволі высокім узроўні.

ШЛЯХІ ЗНАКАМІТЫХ КАЛЕКЦЫЙ

Нашы суседзі багатыя на цуды беларускага тканства са слуцкай радзівілаўскай «персіярні». У розных расійскіх музеях захоўваюцца паўсотні паясоў са Слуцка. Ёсць яны ў Літве, Украіне. Імі захапляюцца, іх берагуць, нават лічаць часткай сваёй гісторыі.

Пра каштоўнасць слуцкіх паясоў не трэба распавядаць тым, хто імі валодае сёння. Нават у тыя часы, калі паясы выкарыстоўваліся па прызначэнні, яны каштавалі да тысячы залатых і іх маглі дазволіць сабе толькі самая багатая шляхта і магнаты. Найбольш дарагімі былі «літыя» паясы — са срэбнай ці залатой ніткай. Адзін пояс пераварочваўся рознымі бакамі ў залежнасці ад абставінаў: штодзённага выкарыстання, з нагоды ўрачыстасці ці жалобы... Вырабы былі сапраўды ўнікальныя — адзін майстар за год мог выткаць не больш за дзесяць паясоў, а мануфактура пад кіраўніцтвам Яна Маджарскага (турэцкага арменіна, які ўсходнім вырабам надаў асаблівы мясцовы каларыт і непаўторнасць) за год выпускала каля двух соцень.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і заняпаду вытворчасці ў Слуцку паясы асабліва цаніліся. З сярэдзіны XIX стагоддзя слуцкія паясы сталі прыцягваць увагу калекцыянераў, у тым ліку расійскіх. Былі свае калекцыі і ў Беларусі.

Вядома, што ў Беларусі захавалася некалькі адзінак паясоў. Нашы галоўныя музеі могуць пахваліцца хіба тым, што маюць у сваіх калекцыях фрагменты слуцкіх паясоў. Атрымаць у сваю калекцыю цэлы пояс — такая мара жывіла беларускіх музейшчыкаў з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Першая і апошняя выстава слуцкіх паясоў у Мінску адбылася ў 1927 годзе ў Беларускім дзяржаўным музеі (зараз Нацыянальны музей гісторыі і культуры). На ёй былі выстаўлены толькі фрагменты, таму што цэлых паясоў у калекцыі музея не было.

Затое цудоўная калекцыя беларускіх культурных каштоўнасцяў, дзе былі і слуцкія паясы, была сабраная ў Вільнюсе ў Беларускім музеі Івана Луцкевіча. Яе лёс склаўся трагічна пасля 1939 года: было ліквідавана Беларускае навуковае таварыства ў Вільнюсе, яго члены арыштаваныя. Пасля вайны Беларускі музей быў зачынены, а яго фонды расфарміраваныя.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі ўласнасцю беларускага народа стала радзівілаўская калекцыя слуцкіх паясоў з 32 экзэмпляраў, якія былі перададзеныя ў Дзяржаўную карціннную галерэю. Але пасля вайны сляды гэтай калекцыі не знойдзены. І зараз няма ніводнага цэлага экзэмпляра слуцкага пояса ў тым жа Нацыянальным мастацкім музеі, дзе размешчана выстава слуцкіх паясоў, якія прыехалі з Расіі.

СЭРЦУ ДОРАГА

Беларусь рабіла адчайныя спробы вяртання на радзіму каштоўнасцяў, якія за стагоддзі толькі выраслі ў цане (сёння слуцкія паясы могуць каштаваць да 100 тысяч долараў). Калі дбаць пра культурны скарб краіны, то важна мець магчымасць сказаць: гэта наша і па паходжанні, і па вызначэнні, і па прыналежнасці. Але заявіць свае правы на тое, што нехта лічыць сваім, не так проста.

Што датычыцца калекцыі расійскага Гістарычнага музея, то яе паходжанне не выклікае сумненняў — калекцыянер Шчукін у 1900-я гады на ніжагародскім кірмашы прыйшоў, захапіўся, набыў. Збіральнік рупліва складаў сваю калекцыю, купляючы рарытэты, потым падараваў яе, завяшчаў.

Найбольш прымальным варыянтам Уладзімір Пракапцоў, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея, лічыў абмен з Гістарычным музеем Расіі: яны нам слуцкія паясы, мы ім — каштоўнасці з нашай калекцыі, якія значныя для расійскай культуры. У нашым музеі вельмі спадзяваліся на тое, што здолеюць дамовіцца. І калі міністр культуры Расійскай Федэрацыі разам са сваім беларускім калегам Уладзімірам Мацвейчуком прыйшлі ў музей, то іх увагу скіроўвалі на творы Шышкіна, Хрущкага. Аднак...

«Сапраўдныя рарытэты, ад якіх ніхто не адмовіцца», — з такімі словамі расійскі міністр культуры Аляксандр Аўдзееў аглядаў выстаўленыя ў Нацыянальным музеі Беларусі слуцкія паясы з калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Расіі.

І ўсё-такі надзея яшчэ не памірае. Пакуль ёсць асобы, якія зацікаўленыя ў вяртанні таго, што страчана ў варунках часу. Зразумела, можна спадзявацца на цуды. Але варта паспрабаваць знайсці слуцкія паясы са сваёй былой калекцыі, сляды якой згубіліся падчас вайны.

Намеснік дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Надзея Усава:

— Ходзіць легенда (на падставе ўспамінаў), што слуцкія паясы, якія знаходзіліся ў нашым музеі, падчас вайны былі схаваныя тут у драўляным хляве супрацоўнікамі музея, але праз некалькі месяцаў іх знайшлі немцы і вывезлі. У нас ёсць фотаздымкі тых паясоў — на дэкаднай выставе ў Маскве 40-га года, і ёсць каталог гэтай выставы, дзе паказаны радзівілаўскі збор з Нясвіжа. Цікавасць да гэтых паясоў ніколі не знікае, таму што гэта сапраўды нацыянальны скарб, які трэба шукаць. І мы можам паказаць, якія паясы мелі некалі ў сваёй калекцыі, і даказаць гэта. Мы збіраемся выдаць дыск з нашым генеральным партнёрам, у якім будуць падрыхтаваныя ўсе дакументы пра тое, як збіраліся экспанаты ў наш музей, як рабавалася калекцыя ў гады вайны, як аднаўлялася, што ў нас у выніку ёсць. Пастараемся вызначыць, што мы будзем шукаць. Каб у камісіі «Вяртанне» былі нейкія дакументы для доказаў, важна, каб такі дыск быў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Аляксандр АЎДЗЕЕЎ, міністр культуры РФ:

— Калі мы зараз замест таго, каб адно аднаму паказваць максімальна поўна музейныя экспанаты, пачнём высвятляць, адкуль які музейны экспанат паходзіць, і пачнём мяняць у метрыцы бацькоў і ўласніка, замест культурнага супрацоўніцтва пачнуцца працэсы, якія дадуць зарабіць адвакатам, пракурорам і суддзям, але не вырашаць праблемы, і толькі ўскладняць нашы адносіны. Так склалася, што цэлая зала рускага мастацтва з'яўляецца ўласнасцю Беларусі. Так склалася, што рускі выдатны калекцыянер быў зачараваны і ўражаны прыгажосцю слуцкіх паясоў, і ён іх збіраў у Расіі. У нас ёсць цэлы музей Пушкіна заходнееўрапейскага мастацтва, у якім знаходзяцца ўнікальныя творы французскіх імпрэсіяністаў ці галандскага жывапісу. Але калі мы пачнём зараз высвятляць, адкуль гэта ўсё паходзіць, то замест супрацоўніцтва атрымаецца вялікая дыскусія. Што датычыцца слуцкіх паясоў, то адкажу адразу: нашым музеям, дзе гэтыя паясы знаходзяцца (а яны ў асноўным сканцэнтраваныя ў Гістарычным музеі), дадзена ўстаноўка паказваць іх хоць вечна беларускім братам. Вы хочаце мець у сябе экспазіцыю — вы яе маеце. Хочаце падоўжыць на год, на два — калі ласка. Хочаце ўзяць іншыя паясы, трымаць іх і паказваць хоць пяць гадоў — калі ласка. У гэтым выпадку няма сэнсу вышукваць, чыя гэта ўласнасць і што запісана ў пашпарце. Галоўнае, каб гэта было даступна на ўсёй прасторы Саюзнай дзяржавы. Такі падыход — сучасны, па ім ідуць усе цывілізаваныя краіны. Хачу нагадаць: калі мы зараз раскупорым гэтую скрыню Пандоры і задаволім адну просьбу, то імгненна з'явяцца сустрэчныя просьбы. Калі Савецкі Саюз спыніў існаванне, то гэтых просьбаў было мільён. Потым мы ўсё ўтрэслі на падставе новага разумнага міжнароднага права, якое дзейнічае на тэрыторыі СНД. Я вельмі люблю слуцкія паясы, гэта сапраўды цудоўны твор мастацтва. І калі беларускім братам хочацца, каб яны знаходзіліся ў гэтым музеі, яны будуць знаходзіцца ў ім столькі, колькі вы палічыце патрэбным. Калі перамовы вядуцца наконт дэманстрацыі іншых каштоўнасцяў, то яны павінны быць кароткімі і скончыцца станоўчым вынікам. Таму што мы абсалютна не перашкаджаем, каб экспанаты з расійскіх музеяў дэманстраваліся ў беларускіх музеях. І наадварот. Я паглядзеў выставу ў вашым Нацыянальным музеі, у вас цудоўныя працы, якія любы расійскі музей возьме і будзе экспанаваць.

МАЛІТВА ЛЕСІ БЕЛАРУСКІ

Упершыню імя беларускай паэтэсы Лесі Беларускі стала вядомае ў 1997 годзе, пасля публікацыі ў часопісе «Полымя» (№12) нізкі яе «лагерных» вершаў «Малітва да Калымы». Публікацыю рыхтавалі тры чалавекі: Васіль Малагуша, Ала Канапелька і Валянціна Коўтун. У 2003 годзе творы Лесі Беларускі ўвайшлі ў зборнік «Краса і сіла: Анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя». Яшчэ пазней Леся Беларуска была названая адкрыццём XX стагоддзя, у друку з'явіліся выказванні, што на яе радзіме, у Маладзечне, ёй трэба паставіць помнік. Сталі з'яўляцца кнігі ўспамінаў, даследаванні яе біяграфіі... І разам з тым прагучалі першыя выказванні пра тое, што Леся Беларуска — гэта літаратурная містыфікацыя. «Звязда» звярнулася да чалавека, які меў дачыненне да першай публікацыі вершаў Лесі Беларускі, — пісьменніцы Валянціны КОЎТУН, каб пачуць яе меркаванні на гэты конт.

— Апошнім часам на старонках розных выданняў, у радыёперадачах, на творчых сустрэчах усё часцей гучыць імя Лесі Беларускі, выклікаючы нават дыскусіі. Вы, Валянціна Міхайлаўна, былі далучаны да першай публікацыі «Малітвы да Калымы» ў часопісе «Полымя». Таму цікава пачуць Вашы згадкі пра тагачасныя падзеі.

— Пра Беларуску ўпершыню пачула я ў дзевяностыя, падчас актыўнага росту ў рэспубліцы жаночага руху, да якога далучылася са сваімі каляжанкамі і я, заснаваўшы Усебеларускі (пазней Міжнародны) жаночы фонд Святой Ефрасінні Полацкай. Якраз на адзін з форумаў фонду Мая Тодараўна Кляшторная і прывяла былога вязня лагера «Эльген» Васіля Малагушу, які расказаў пра свае сустрэчы на Калыме з прыгажуняй-беларускай, якая добра складала і спявала вершы. Суровыя лагерныя ўмовы не спрыялі захаванню рукапісаў, а без паэтычнай спадчыны, нават пры наяўнасці выключнай біяграфіі, як вядома, паэта не бывае. Праўда, некалькі рускамоўных невыразных радкоў Лесі былі прачытаны мной у адным з выданняў грамадскага аб'яднання ахвяраў рэпрэсій, прынесеным той жа Маяй Тодараўнай. Але прачытанае не зрабіла на мяне станоўчага ўражання. Аднак прайшло колькі часу, і запісаныя па маёй просьбе ад Малагушы Алай Канапелькаю адметная біяграфія беларускай «калымчанкі», спецыфічная лексіка, каларытныя дэталі лагернага побыту, геаграфічныя назвы ўсё ж распачалі ў маёй душы сваю «ядзерную» рэакцыю і настолькі моцна паўплывалі на творчае ўяўленне, што амаль выбухова, ці не на працягу двух-трох тыдняў, «Малітва да Калымы» была завершана і прапанавана для публікацыі ў «Полымі».

Толькі цяпер, пачытаўшы «Круты маршрут» Яўгеніі Гінзбург, разумею, што кніга гэтая пэўным чынам паўплывала на створаную Васілём Малагушам біяграфію Лесі Беларускі. Аднак сёння я глыбока ўдзячная Васілю Андрэевічу за тэму, за наратыўнае ў нашай літаратуры незвычайнай постаці. І хоць вершы пад іменем Лесі Беларускі створаны маімі творчымі пакутамі, але сааўтарам тут выступае сам час, тыя бурныя дзевяностыя, якія запатрабавалі «Малітвы да Калымы».

Зрэшты, кожны паэт, кожны творца — толькі праваднік ідэй сваёй эпохі, той, па словах Ліны Кастэнкі, «інструмент, у якім жыве душа народа». І гэта асабліва паказальна ў гісторыі ўзнікнення «Малітвы да Калымы», першыя вершы якой былі напісаны ў дзевяностыя, а апошнія — ужо ў нашы дні. Таму кожны з чытачоў павінен сам для сябе вырашыць, ці з'яўляецца Леся Беларуска адным з маіх псеўданімаў, ці гэта — самастойная літаратурная з'ява...

— У некаторых выданнях ёсць згадкі пра тое, што разам з Ларысай Марозавай, беларускай паэтэсай, якая распачала і скончыла сваю творчую дзейнасць у Калыме пад псеўданімам Лесі Беларускі, адбывалі пакаранне Яўгенія Гінзбург і беларуская пісьменніца Ядзвіга Бяганская.

— Яўгенія Гінзбург пра Лесю Беларуску не згадвае. Бяганская таксама. Апошняе нядаўна мне пацвердзіла пісьменніца Алена Васілевіч, якая сябравала з Бяганскай. Яны і не могуць згадваць. Я яшчэ тады, калі ўпершыню ўбачыла біяграфію Беларускі, зразумела, што яна ўтрымлівае немалую долю вымыслу. Я ўпэўненая, што Васіль Малагуша сустракаў там беларусак і прыгожых, і таленавітых, і быў закаханы ў іх, і захапляўся імі, і слухаў іх песні, і некаторыя з іх былі паэтэсамі. І ён утварыў у сваёй свядомасці такі калектыўны вобраз.

— А канкрэтнага чалавека — Ларысы Марозавай — не было?

— Я ў гэтым не сумняваюся. Ніхто з «дзяцей» лейтэнанта Шмідта не змог знайсці яе слядоў. Ды гэта і немагчыма. Але тут важна не тое, існавала такая асоба альбо не. Час распарадзіўся так, што Малагуша знайшоў мяне, я ўбачыла, што біяграфія трохі прыхарошаная, але я тады шчыра паверыла ў існаванне Лесі Беларускі. У той жа самы час я трапіла ў аварыю. Мы разам з Лінай Кастэнкай і Крысцінай Лялько паехалі на возера Свіцязь і ледзь не загінулі. Больш за тое, у мяне былі падставы думаць, што аварыя была не выпадковай. Я апынулася ў шокавым стане. Тады я і напісала гэтую падборку. Я тады толькі прыйшла да Бога, і гэта адлюстравалася ў паэтыцы вершаў: «Цвік забівае хтосьці ў ногі мне...» Я цалкам растварылася ў вобразе Лесі. Добра, што я тады не чытала «Круты маршрут» Гінзбург, бо зразумела б, што такой жанчыны не было. І нічога не напісала б. Але ў мяне быў толькі ўзнёслы настрой, аповеды Малагушы і бачанне гэтых снягоў, сцюжы, ветру, гэтых няшчасных жанчын... І мая нядаўняя аварыя. Такім чынам з'явілася публікацыя, аўтарамі якой былі тры чалавекі. Вершы — мае, імя «Леся Беларуска» належыць Малагушу, а біяграфію напісала Ала Канапелька. Па-сутнасці, Ала дапамагла мне ўвайсці ў тэму, яна дала мне фактуру, якая мяне падштурхнула. Бо сама я не шукала б яе. Атрымаўся калектыўны помнік. Некалькі вершаў, якія не ўвайшлі ў «Полымя», я надрукавала ў зборніках Міжнароднага жаночага фонду імя Ефрасінні Полацкай «Жанчына. Планета. Будучыня».

— Ва ўсіх публікацыях вершы былі падпісаны іменем Лесі Беларускі?

— Так. Я пра гэта нават не задумвалася. Я б і далей пра гэта маўчала, калі б раптам, праз дзесяць гадоў, не падняўся вакол імя Лесі Беларускі шум, які мне вельмі не спадабаўся. Сталі з'яўляцца публікацыі, даследаванні, знайшліся нават яе «пляменнікі»... Некаторыя з гэтых рэчаў мяне забаўлялі, некаторыя — радавалі, аднак мяне не магло не ўразіць жаданне некаторых на гэтым спекуляваць. Адным з тых, хто разумеў ісціну, быў Алег Лойка. Ён проста ўчытаўся ў стылістыку вершаў. У тое, што там напісана і як. Ці магло быць такое пяро ў 30-40-я гады? І такія тэмы? Лойка тады выказаў думку: калі б Лесі Беларускі не было, то яе трэба было б прыдумаць.

— Які ж далейшы лёс Лесі Беларускі?

— Гэта — новы, прысвечаны лёсу рэпрэсіраванай беларускай інтэлігенцыі, але ўжо празаічны твор, магчыма, раман пад назваю «Над садам Іарданскім». А вось ці ўзнікнуць новыя паэтычныя творы «Малітвы...», пакажа час.

— У такім выпадку, ці з'явіцца «Малітва да Калымы» асобным выданнем?

— Якраз гэтым я цяпер і займаюся. Аднак падрыхтоўка кнігі — а гэта каля сямідзесяці вершаў — патрабуе немалых творчых высілкаў. І, вядома, нямала часу. Туды ўвойдуць вершы, якія былі надрукаваныя ў зборніку Фонду ў 1997 годзе і якія мала каму вядомыя, і тыя, што былі ў «Полымі», і некалькі новых.

— Гэта будуць вершы пад іменем...

— Лесі Беларускі. Па-сутнасці, я ўжо не аддзяляю сябе ад Лесі Беларускі.

— А Валянціна Коўтун?

— Будзе невялічкі ўступ, у якім вельмі сцісла будзе пададзена сутнасць.

— Значная творчая падзея мае свае філасофскія вытокі і светапоглядныя азначэнні. А ў гэтым выпадку?

— Касмічны рух развіцця чалавецтва паўстае перад маім унутраным зрокам у бясконцасці супрацьстаяння святла і цемры. І ў цэнтры палае Укрыжаванне, што стала знакавым. Як для 30-х гадоў эпохі прыходу Хрыста, калі распачалася новая эра чалавецтва. Так і для тых трыццатых «гулагаўскіх», што праз многія стагоддзі завастрылі сутычку багаборчага ўкладу з хрысціянскімі асновамі чалавечага духу. Калі на адным з бакоў спрадвечнай барыкады грамадскага існавання — носьбіты Слова Божага і веры. На другім — разнастайныя шматкутнікі і свастыкі. У гэтым сэнсе Леся Беларуска — сімвал тых мужных беларускіх жанчын-пакутніц, што паўсюль — і ў калымскіх ільдах, і на іншых жорсткіх лесапавалах гісторыі — захавалі ў сабе мрою праз свабоду, зберагліі дарагі сэрцу вобраз Беларусі і веру ў перамогу духоўнага святла. У гэтай сувязі важна разумець... *«Малітва да Калымы» — метафарычна абагулены паэтычны помнік усім вядомым і невядомым паэтэсам, што так і не змаглі данесці свае галасы да айчыны... Помнік тым лагерным пакутніцам, якія з матчынай песняй у вуснах загінулі на вогненным крыжы незабыўных 30-х... Але — не змоўклі...*

Таму заўжды буду захоўваць у сэрцы ўдзячнасць да ўкраінскага паэта Васіля Малагушы і Алы Канапелькі за тэматычную і маральную падтрымку.

Запісала Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Леся БЕЛАРУСКА. Малітва да Калымы

У лесе

Невядомая для свету паэтэса,
дрэў паўночных гладжу я кару
казачнага лагернага лесу...
І з ахвярамі сякеры гавару.
Стойкай шахты стане дрэва-цуда,
альбо домам,
альбо мачтай карабля...
Ці тым самым нашумелым
навабудам,
дзе свiтала маладосць мая.

«Цёплая Даліна», 1946

У лагерным бараку

Пішу і крэслю... Не, усё — не так!
«Не сатвары куміра», — помню гэта.
Я апяваю лагерны барак,
а сопку называю цэнтрам свету!
Ноч. Дзверцы печы-бочкі адчыню.
Гараць! Гараць...
Святло ліюць мне дровы.
Бярвенні пад паэмы заганю,
а потым узвяду на іх і словы.
Смалой сасновай
мой прапахне верш.
Пачатак свету бачу я нанова.
Сляза жаночая...
Сляза была найперш.
І з той слязой пакутліваю — Слова!
З параненай душой няветлы свет.
Сяброўкі спяць, і брыгадзір Алена
(куміра сатварыў усё ж паэт...)
... спіць у цянётах зла —
ўвесь боль «Эльгена.»
А над тайгою выспявае гнеў
і пагражае катам ён трывожна.
Цвік забівае хтосьці ў ногі мне.
І ў галаву...
І выцягнуць не можна.
Напоўніць сэрца
мне трывожны звон.
Мы ўсе ў цвіках наскрозь —
і я, і строфы!
Укрыжаваны лёс людзей спакон.
І ўся тайга —
як грозная Галгофа.

«Цёплая Даліна» 1946

Пурга

Разышлася пурга.
Крышыць межы і лёд.
Рве нябёсы на шматы з размаху.
У тайгу я іду. Мой бушлат —
уразлёт!
Я нагадваю птушку без страху.
Я — у неба крычу:
— Ты ламай, ты крышы
гэту цвердзь, да якой мы прыкуты.
Па ўсіх «зонах калючых»
мой боль заглушы...
І бясконцы пякельнай — пакуты.
Сунімала адчай. Цераз сілу жыла.
Адгарэла калымскаю одай.
Каб зарою світальнаю
Воля ўзышла
.... над адзінствам людзей.
І — народаў.

Магадан, 1938

В дополнение к объявлению, напечатанному в выпуске газеты от 21.04.2009 г. № 74,
ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что дата проведения внеочередного совместного общего собрания акционеров ОАО «Минскоблхлебопродукт» и членов СПК «Большие Новоселки» по вопросам реорганизации изменена с 30 апреля 2009 года
на 15 мая 2009 года.
Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».
Тел. 224 19 17. УНП 600013173

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Кадастровый номер, месторасположение земельного участка	Целевое назначение, площадь (га)	Условия продажи	Наличие инженерных коммуникаций, ограничений в использовании участка	Срок аренды (лет)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Аукцион проводится 1 июня 2009 года в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 34. Последний день приема документов 26 мая 2009 года							
1	122550100002000301 Брестская обл., Жабинковский район, г. Жабинка, ул. Мира	Строительство автозаправочной станции 1,1979 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Возмещение потерь в размере 999 700 руб.	Электричество Ограничений не выявлено	99	71 830 000	7 183 000
2	122582404602000011 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ракитницкий сельсовет, 0,2 км западнее д. Федьковичи около автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)-Минск-граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство автозаправочной станции с комплексом услуг 1,5001 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в срок, не превышающий 2 года. Возмещение потерь в размере 47 896 170 руб. Возмещение убытков в сумме 12 788 643 руб.	Ограничение использования площади 0,0568 га в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи	99	10 000 000	1 000 000
3	122550100002000278 Брестская обл., г. Жабинка, ул. Короткина	Строительство объекта производства 3,1972 га	В течение 1 года разработать документацию и осуществить строительство в сроки до 2 лет	Электричество, имеются ограничения по использованию 0,7882 га в связи с линией электропередачи 10кВ	50	100 000 000	10 000 000
4	122582003102000016 Брестская обл., Жабинковский р-н, Озятский с/с, 0,5 км южнее д. Озяты	Строительство охотничьей усадьбы 0,7958 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Возмещение потерь лесохозяйственного производства в размере 20 200 120 руб.	Нет	25	16 500 000	1 650 000
5	122581500002000021 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский сельсовет, 38 км (право) автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)-Минск-граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство объекта придорожного сервиса 2,2905 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Возмещение убытков в размере 202 136 000 руб.	Электричество Ограничения по использованию 0,0985 га в связи с линией электропередачи до 1000 В	99	50 000 000	5 000 000
6	122581500002000020 Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский сельсовет, 40 км (лево) автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)-Минск-граница Российской Федерации (Редьки)	Строительство объекта придорожного сервиса 1,2709 га	Разработка строительного проекта и строительство объекта в сроки, определенные ПСД	Электричество Ограничения по использованию 0,0261 га в связи с линией электропередачи до 1000 В и 0,1076 га в связи с кабельной линией связи	99	50 000 000	5 000 000
7	122550100002000280 Брестская область, г. Жабинка, ул. Каменецкая	Строительство логистического комплекса с объектом торговли 2,1994 га	В течение 1 года разработать документацию и осуществить строительство в сроки до 2 лет. Ориентировочный размер возмещаемых убытков 762 033 000 руб.	Ограничения по использованию 0,0193 га из-за кабельной линии электросвязи, 0,0128 га – линии электропередачи до 1000 В, 0,1351 га – санитарно-защитной полосы водопроводов	99	220 000 000	22 000 000

Продавец и организатор аукционных торгов – Жабинковский райисполком. Аукционы проводятся по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 34.

Для участия в аукционе предоставляются: заявление по установленной форме; заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3641600850051 в РКЦ № 2 г. Жабинка филиала ОАО «Белагропромбанк» — Брестское областное управление, МФО 150501401, УНН 200038492, получатель платежа – Жабинковский райисполком;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Участник аукциона, выигравший торги: подписывает протокол аукциона в день проведения торгов; не позднее 10 рабочих дней с момента вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возмещает расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона; не позднее 12 рабочих дней с момента вступления в силу решения о предоставлении земельного участка подписывает договор купли-продажи объекта с продавцом.

Плата за объект и возмещение расходов осуществляются по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка.

Открытый аукцион будет считаться состоявшимся, если в нем приняло участие не менее двух участников по каждому участку.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: 225101, г. Жабинка, ул. Кирова, 65, каб. 35, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с момента опубликования извещения.

Контактные телефоны в г. Жабинка: по вопросам организации и проведения аукциона – (8-01641) 2-36-78; по вопросам ознакомления с документацией, коммуникациями и осмотра в натуре земельного участка – (8-01641) 2-32-77.

Казкі для дарослых

Метамарфозы кахання

Паша заўсёды любіў Жанну. А Жанна ніколі не любіла Пашу... Яшчэ ў старэйшай групе дзіцячага садка, куды іх вадзілі разам, ён заляцаўся да яе амаль што «па-дарасламу», імкнучыся пацалаваць заўсёды, калі выпадаў зручны момант... Непрыступная Жанка кожны раз крывіла свой прыгожы тварык і адпіхвала яго — часам так моцна, што ён літаральна адлятаў ад яе і няўклюдна плюхаўся ў гару цацак. Пашу было балюча. Ён моцна пакутаваў — не ад падзення на мяккае месца, а ад нераздзеленага кахання. І вечарам, калі бацькі прыходзілі на «разбор» дзяцей, на поўным сур'ёзе, плачучы горкімі слязамі, скардзіўся Жанкінай маме, што ўсе астатнія дзяўчынкі з групы з ім цалуюцца, а Жанка — не...

Потым, як гэта часта здараецца, яны пайшлі ў адну школу і нават у адзін клас. Паша не супакойваўся і не стамляўся дэманстраваць Жанцы свае пачуцці — аддаваў ёй маміны бутэрброды, купляў у сталоўцы пірожныя і, натуральна, дазваляў спісваць. Жанка вучылася так сабе, у залежнасці ад настрою. Яна ніколі не вызначалася ўседлівасцю, да таго ж рана зведала, што такое спепяляючая моц прыгажосці. Хлопчыкі бегалі за ёю натоўпамі, і ўсе старанні Пашы вылучыцца ў гэтым натоўпе не прыводзілі да жаданага выніку — яна па-ранейшаму ігнаравала яго.

Пасля трэцяга класа іх павезлі «на прыроду», і ён паспрачаўся з іншымі хлопчыкамі (так, каб Жанна пачула), што пераплыве возера і вернецца назад за пятнаццаць хвілін... Туды яшчэ так-сяк дабраўся, а назад — духу не хапіла. Так і сядзеў на беразе, пакуль выратавальнікі не падплылі на сваёй лодцы... Пасля пятага класа яны пайшлі ў паход, і Паша зноў вырашыў вылучыцца. Калі група ўжо вярталася з лесу, ён схаваўся ў кустоўніку. Думаў, праз пяць хвілін яго адсутнасць заўважаць, пачнуць хвалявацца, шукаць... Класны кіраўнік спахапілася толькі ў электрычцы. А ён, праседзеўшы з паўгадзіны ў кустах і не дачакаўшыся машынабных пошукаў, вырашыў нарэшце вылезці і дагнаць клас. Але пераблытаў сцежкі, пайшоў углыб і канчаткова заблукаў... Выйшаў з лесу гадзіны праз дзве з супрацьлеглага боку, калі сонца ўжо садзілася. Дайшоў да вёскі, якая, на шчасце, была непадалёк, і ў першага чалавека, які сустрэўся, папрасіў патэлефанаваць дадому... Класнай тады ўляпілі строгую вымову, бацькоў выклікалі ў школу... Жанка ж, калі ўбачыла яго, пакруціла пальчыкам ля скроні: маўляў, з-за цябе, дурня, такі пярэпалах нарабіўся...

У сёмым класе ён цвёрда вырашыў, што жыць далей без яе не варта. Проста немагчыма жыць, і ўсё. Пакінуў на стале развітальную запіску, падняўся на пяты паверх, вылез на дах, падышоў да краю, глянуў уніз... Дзень быў сонечны, у двары гулялі дзеці, на лавачках сядзелі мамы і бабулі... Паша яскрава ўявіў сабе, як шмякаецца аб зямлю, як усе яны збягаюцца да яго, як рэзка мяняецца ў іх настрой... І падумаў: навошта псаваць людзям такі цудоўны дзень?.. Адрываць ад спраў, прымушаць хвалявацца?.. Пастаяў яшчэ крыху, палюбаваўся дваром і вярнуўся назад.

З таго часу ён змяніўся. Дакладней, яго нібыта падмянілі. Ён адасобіўся ад класа і ўвогуле... Паглыбіўся ў вучобу, запісаўся ў спартыўную секцыю. Ён браў вяршыню за вяршыняй, удзельнічаў у алімпіядах, у навуковых канферэнцыях, у спартыўных спаборніцтвах. А па вечарах падпрацоўваў грузчыкам у суседнім гастраноме.

Калі ў апошнім, адзінаццатым класе, ён з'явіўся 1 верасня на лінейку — высокі, загарэлы, у беласнежнай кашулі з вузенькім чорным гальштукам — усе дзяўчаты ледзь не страцілі прытомнасць. Нават Жанна, не пазнаўшы яго, здзіўлена выгнула свае тоненькія броўкі... Трыумф доўжыўся роўна пяць секунд. «А, Паша, гэта ты, — ветлівая ўсмешка, раўнадушны позірк пранізалі яго наскрозь. — Кажуць, да нас новенькага перавялі. Выпадкова не бачыў?».

...Пасля школы ён паступіў у ваеннае вучылішча, скончыў яго з адзнакай, служыў спачатку пад Пецярбургам, потым быў накіраваны ў адну з «гарачых кропак», у разведроту... Аднойчы атрымаў пісьмо ад сябра, дзе той падрабязна расказваў, як склаўся лёс былых аднакласнікаў, у тым ліку і Жанны: маўляў, вывучылася на цырульніка, выйшла замуж за бізнэсмена, старэйшага за яе гадоў на дваццаць, нарадзіла хлопчыка. Цяпер сядзіць дома, нічым не займаецца, а каб не звар'яцець ад нуды, час ад часу стрыжэ суседскіх сабачак... Да ліста быў прыкладзены фотаздымак з сустрэчы. Жанна сядзела, як заўсёды, у цэнтры, прыгожая і чужая, у доўгай белай сукенцы, з чырвонымі ружамі ў руках.

Ён паклаў гэты здымак у нагрудную кішэню і доўга насіў з сабой, разглядваючы ў рэдкія хвіліны адпачынку... З «гарачай кропкі» Пашу перавялі служыць на радзіму, павысілі ў званні, выдзелілі службовае жыллё, а разам з ім і службовую машыну... Ён рэдка бываў дома, таму што

Рэзананс

«СПАДАРЫНЯ... ДАЗВОЛЬЦЕ ЁЙ ЗАСТАЦЦА!
(«Звязда» 8 красавіка 2009 г.)

ХАЦЕЦЬ — МАЛА

Моўная праблема ў Беларусі хвалюе, мусіць, кожнага... Прынамсі, з беларусаў. Таму ў артыкуле «Спадарыня... Дазвольце ёй застацца» я знайшоў свае ж думкі, свае ж развагі — толькі ўжо на паперы. Дзякуй аўтару.

А вось яго апанентам добрых слоў я сказаць не магу. Ну, спадара Шылу яшчэ можна сяк-так апраўдаць, а вось спадарыню Ждановіч... Яна, бачыце, ужо не разумее, што такое зніжкі, адсоткі, кіроўцы, для яе словы спадар і спадарыня ледзь не мацюкамі гучаць. Мову беларускую яна і наогул прыгаварыла, да таго ж пагражае, прычым, што цікава, за іншых, што на «Звязду» падпіскі не будзе.

Вось гэтым яна нагадала мне аднаго з жыхароў нашага райцэнтра. Кажуць, стары ён дужа быў і ўсё пераживаў: «І як гэта — я памру, і што ж тады з маім Іўем стане?!» Памёр, а Іўе як стаяла, так і стаіць.

Так і з падпіскаю на «Звязду» нічога не здарыцца.

Нават больш скажу: я на «Звязду», таксама не падпішуся — у тым выпадку, калі яна, крый Божа, двухмоўнай стане альбо калі не будзе ў ёй «...Народа на провадзе», «Простых рэчаў», «Простай мовы», конкурсу «Хто каго?», сканвордаў...

Але ж без гэтага, згадзіцеся, ужо і «Звязда» не «Звязда»...

Асобна хачу расказаць, як прыйшлі да мяне словы спадар і спадарыня (дарэчы, асобны дзякуй Рыгору Барадуліну за цудоўны верш!). Дык вось, пачуў я іх напрыканцы 80-х. Да таго спадабаліся... Дай, думаю, недзе сказану.

А я тады на вяселлях часта музыкам быў. То па сцэнарыі — маладыя, значыць, распісаліся, павянчаліся, прыехалі дамоў, з усёй дружынай паселі за сталы. Сват «рэч» сказаў (прапанаваў выпіць за маладых — таму і рэч). Потым некага з бацькоў госці ўважліва слухалі. І яшчэ некага. А пасля трэцяй, як водзіцца, гаварыць пачыналі ўсе, але вось слухаць ахвотных, лічы, не было.

І тады да людзей выходзіў я, галёкаў у мікрафон:

— Добры вечар, шаноўнае спадарства!..

Рэакцыя?

Мёртвых з косамі, ну зразумела ж, за сталамі не было, а вось цішыня — прычым мёртвая — гарантавалася: госці пазіралі на мяне, адно на аднаго. А я, скарыстаўшы паўзу, пачынаў жартаваць, уцягваць бяседнікаў у нейкія конкурсы, у гульні, раскручваў на правакацыі — пачыналася сапраўднае вяселле. Таму што ўсім сапраўды было весела.

Думаю: а калі б я тады звяртаўся інакш? Каб казаў, напрыклад, дарагія сябры, альбо дарагія таварышы? Што пачуў бы ў адказ?..

Так што не трэба паспешлівых высноў. У нашых людзей сапраўды вельмі моцная генетычная памяць. І асобныя словы, і мова ў цэлым можа вярнуцца, калі мы, людзі Беларусі, сапраўды гэтага захочам. І будзем для гэтага хоць нешта рабіць.

А. ЛІПЕНЬ, *Іўеўскі раён.*

НА МАЛАДЫХ — З НАДЗЕЯЙ

...Са мной так бывае: прачытаю артыкул — і не адпускаюць ад сябе нейкія вобразы, словы.

На гэты раз, апроч іншага, узрушыла здзіўленне, радасць, неабыякавасць маладых пасажыраў тралейбуса на зварот: «Спадарства, з вашага дазволу...»

Вось пра маладых я і хачу расказаць.

Усюды — і ў сталіцы, і ў далёкіх ад яе куточках — ёсць юнакі і дзяўчаты, якія лічаць і адчуваюць сябе беларусамі, адчуваюць глыбока, свядома, інтэлігентна. Не, яны не крычаць: «Далоў рускую!», яны яе вывучаюць і ведаюць. І тым не менш не ўяўляюць Беларусь без беларускай мовы — любяць яе, ганарацца мілагучнасцю. Гэта нармальная з'ява для грамадзяніна кожнай краіны.

Раскажу пра адзін выпадак. Да мяне як да класнага кіраўніка, звярнулася педагог-арганізатар з просьбай угаварыць вучня быць вядучым на святе. Я здзівілася, бо раней такога ніколі не было: хлопчык з пятага класа займаецца ў літаратурным гуртку, выразна чытае, на сцэне — як рыба ў вадзе...

Пагаварыла з ім. Куфэрак, як кажуць, проста адчыняўся: Саша заўсёды вёў праграмы на беларускай мове, а тут сцэнарый на рускай. Ну і няхай, кажу яму, у цябе ж па гэтым прадмеце «дзявятка»! Разумееце, ён мне адказвае, па-беларуску я гавару свабодна — упэўнена, лёгка. З беларускай моваю мне смяшей...

Вось такое бачанне, такое адчуванне. У Сашы. Яшчэ адзін наш хлопец збіраўся па-руску верш напісаць. А атрымалася — па-беларуску: на гэтай мове, сказаў, рыфмы лягчэй падбіраюцца.

Карацей, я з надзеяй гляджу на маладых. Ім толькі давяраць больш трэба, больш гаварыць аб гісторыі Беларусі, аб славутых імёнах Айчыны, ім толькі б давесці, што найноўшую гісторыю будуць пісаць яны.

Газеце ж (выпісваю тры асобнікі — сабе і дзвюм дочкам-настаўніцам) я шчыра жадаю новых цікавых артыкулаў і новых (у тым ліку старых, у «смутныя» часы забытых, закінутых) слоў! Наша задача, як я разумею, не даць ім загінуць (яшчэ мае бабулі казалі: «Што ўмееш — за плячыма не носіш», «Ведаць, умець — не насіць на сабе»)... А ўжо нашчадкі выберуць — у тым ліку словы для ўжытку. Якія — звыклыя для нас ці не вельмі — іх права.

І яшчэ. У канцы артыкула «Спадарыня... Дазвольце ёй застацца» быў сумнеў — «ці тое напісала, ці так». На яго я адкажу высновай, пазычанай у аўтаркі, хоць крыху і пераіначанай: «Калі адзін чалавек бярэцца за пяро для таго, каб згадзіцца, значыць, як мінімум сто далучаюцца. Ці не так?

Галіна АЛЯХНОВІЧ, *в. Вялічкавічы, Салігорскі раён.*

АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

...На пачатку артыкула — два лісты і адзін, як кажуць, «прыгажэйшы» за другі... Найперш, хочацца звярнуцца да аўтаркі першага — А. Ждановіч. Слова спадарыня вас крыўдзіць? Тады — «жэншчына»... Так вам падабаецца больш? А мне — не... Мне, калі на тое пайшло, «дазвольце застацца спадарыняй». Гэта слова мне прыгажэй, мілей, чым усе сіньёры, пані і мадам разам узятыя. Трэба толькі ўслухацца! І далібог, калі б звароту такога не было, яго трэба было б прыдумаць. Іменна такім — каб раўняў спінкі, каб распраўляў жаночыя прыгнутыя плечы...

Калі-нікалі я звяртаюся так да сваіх знаёмых. Ні разу не прыкмячала, каб хоць нехта пакрыўдзіўся. Наадварот!

Вы кажаце яшчэ, што не варта чапляцца за пэўныя словы, не варта цягнуць іх на старонкі газеты. А чаму? Вунь жа слова «господа» суседзі «прыцягнулі» і карыстаюцца, рады. А чым яно лепшае за спадароў?

Пішаце, што па-беларуску ўсё разумееце, чытаеце і слухаеце?.. Прабачце, а чаму ж тады не хочаце ўдасканаліць веданне, мусіць, сваёй жа роднай мовы, узбагаціць яе новымі словамі?

Не верыце, што будзе жыць?..

Хто мне скажа: чаму мы такія? Ну няма ж больш у свеце народа, які б вось гэтак змагаўся з роднаю мовай, які б вось гэтым сябе так зневажаў!

А паважаць тады хто будзе — нас і нашу мову? Пасол Швецыі спадар Эрыксан? Ды я яму — за яго беларускую — нават Палтаву прабачыла...

Што да спадара Шылы (ён не пісаў, што супраць такога звароту), то згаджуся: беларускасць у Беларусі трымаецца на энтузіястах. У тым ліку — на рэдакцыі любімай мною «Звязды». Падчас прэзентацыі яе ў нашым Забалацці я спыталася ў журналістаў, ці не марнае гэта змаганне, ці варта? Мне адказалі: мы — усё адно будзем.

Дык чаму яны? Жменька журналістаў? Чаму не кожны з нас, па магчымасці, чаму не ўсе мы?..

Што датычыцца аўтаркі артыкула, то на старонках газеты я заўсёды шукаю яе імя, яе няпростую «Простую мову».

Яшчэ і таму, што там, як, мусіць, нідзе, знаходзяцца нашы забытыя, але цёплыя і мілыя словы, словы, якія я і ведала (на тым самым генетычным узроўні), але забылася. Успрымаю іх, як нейкае прывітанне ад сваіх папярэднікаў, як лучнасць з імі і тымі, хто прыйдзе.

Да таго ж, многія з гэтых слоў я адразу пазнаю і прызнаю, бо чула ад маці, але з часам забылася. Ды і школа ў нас была (і засталася) руская....

Ад маці ж і першы ўрок. Я, на Яна, прынесла дадому зёлак, сказала, што во, назбірала зверабою. А яна мне: «Гэта — не зверабой. Гэта святаяннік».

Быў яшчэ баярышнік (ад баяр? Ці ад слова баяцца?)...

А па-нашаму ж будзе глог, па-мамінаму — і наогул — сардэчнік. Проста і ясна — для сэрца, ад сэрца, да сэрца.

Зрэшты, тады я на гэта, можна сказаць, не звярнула ўвагі. Цяпер — свята-янных (услухайцеся!) маміных траў насеяла ля двара.

Не, не падумайце, я не супраць зверабою і іншых слоў, не супраць рускай мовы. Але ж, на маю думку, па-нашаму ўсё гучаць намнога мілей, цяплей, бліжэй да душы. Мы абавязкова дойдзем да гэтага. Толькі б не позна было...

І яшчэ. Вось мы ў аўторак, на Радаўніцу, пайшлі на могілкі, пайшлі да продкаў — пакланіліся ім, засведчылі сваю пашану. І пры гэтым нават не задумаліся, што не шануючы галоўнае — мову, на якой яны гаварылі, мы зневажаем іх памяць.

Кажуць, Бог не чуе тых, хто звяртаецца да яго не на роднай мове. Не чуе, значыць, нас, не разумее. І нашы дзядулі-бабулі, якія дакладна гаварылі па-беларуску, відаць, не зразумеюць, калі мы прыйдзем да іх не з ізняй мовай.

...Што да чынавенства, — мне крыўдна, што наша эліта не гаворыць па-беларуску. Мне здаецца, што нашы міністры (найперш — культуры і адукацыі) павінны першыя загаварыць па-беларуску. Хто, калі не яны?

Але ж, як кажуць гумарысты, народ адно, чынавенства — іншае. Тады — хто, калі не мы?

Нас жа большасць.

Калі нам не ўсё роўна.

Соф'я КУСЯНКОВА, *в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

А ТРЭБА — ДАКАЗВАЦЬ

...Чытачы вам напісалі, што ім не падабаюцца асобныя словы — кшталту кіроўцы, крамшчыцы, спадары, што адсоткі трэба пакінуць украінцам... Я асабіста ўпэўнены, што ў любой мове ёсць свае, скажам так, кроўныя словы і ёсць запазычаныя. У нас — з рускай, польскай, украінскай, у мовах-суседках — з нашай. І не трэба іх «карчаваць», праганяць, хай будуць. Але ж трэба — як на мой погляд — трымацца свайго. Вітаю — у апошні час «Звязда» гэта робіць! Цалкам падзяляю і яшчэ адну думку з артыкула: мала цытаваць выказванні вядомых людзей, мала паўтараць, што беларуская мова адна з самых мілагучных у свеце. Гэта трэба пастаянна дэманстраваць, даказваць. Памятаю, якое ўражанне на краіну, без перабольшання (!), зрабіла песня «А я лягу, прылягу». Людзі неяк адразу прынялі яе, заспявалі, яна панеслася па ўсёй Беларусі і нават далёка за межы. Чаму? Таму, што ў аснове гэтай песні — сапраўдны верш нашага класіка Ніла Гілевіча. І вартая верша мелодыя. Дзе цяпер падобныя песні, ці народзяцца?

І яшчэ. Мне ў свой час не раз даводзілася наведваць нашу Уздзеншчыну. Школы там былі, мусіць, спрэс беларускія. Людзі выдатна ведалі сваю мову, размаўлялі на ёй. І што яшчэ здзіўляла — цудоўна дэкламавалі вершы ды байкі сваіх землякоў Кандрата Крапівы, Паўлюка Труса. На памяць ведалі творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, многіх іншых класікаў. Прычым, усюды — у клубе, у полі, на ферме — яны мелі ўдзячных слухачоў. Дзе цяпер гэтыя людзі? Дзе само беларускамоўнае асяроддзе?

Вось і думаю: а што калі «Звязда» хоць раз на тыдзень будзе друкаваць залатыя ўзоры прыгожага пісьменства, будзе прапаноўваць вывучыць іх на памяць? Роднае слова заўсёды было гаючым. Вось і будуць у людзей цудоўныя лекі ад склерозу, ад ціску. А галоўнае — ад бяспамяцтва.

Мікола ДУБОЎСКІ, *г. Мінск.*

P.S. Газету «Звязда» я пастаянна купляю, прычым, у адным і тым жа шапіку. Раней у продажы яна была нават надвячоркам. Цяпер усё часцей чую: «Няма. Раскупілі». Значыць, ёсць у жыхароў сталіцы цікавасць да газеты, да мовы. Мяне гэта радуе.

Лісты з удзячнасцю чытала і рыхтавала да друку Валянціна ДОЎНАР.

ВТБ

ЗАВЕРЕНО
Директором Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь Гальпериным А.Л. 23.04.2009

УТВЕРЖДЕНО
Решением Совета директоров Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) 30 марта 2009 года, протокол № 2

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций **первого выпуска** Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь)

1. Наименование эмитента
на русском языке:
полное: Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь);
сокращенное: ЗАО Банк ВТБ (Беларусь);
на белорусском языке:
полное: Закрытае акцыянернае таварыства Банк ВТБ (Беларусь);
сокращенное: ЗАТ Банк ВТБ (Беларусь).

2. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего
ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (именуемое в дальнейшем – эмитент, Банк) создано в соответствии с законодательством Республики Беларусь на основании Распоряжения Президента Республики Беларусь № 47рп от 04 марта 1996 года и Договора о совместной деятельности по созданию Славянского совместного акционерного коммерческого нефтяного банка «Славнефтебанк» от 03 февраля 1995 года. Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 07 октября 1996 года регистрационный № 57.

Решением Общего собрания акционеров от 14 декабря 2000 года, протокол № 2, Славянский совместный акционерный коммерческий нефтяной банк «Славнефтебанк» переименован в Закрытое акционерное общество «Славнефтебанк». Изменения в устав Банка, связанные с изменением наименования, зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 29 декабря 2000 года.

В соответствии с решением Общего собрания акционеров Банка от 17 сентября 2007 года, протокол № 6, Закрытое акционерное общество «Славнефтебанк» переименовано в Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь). Изменения в устав Банка, связанные с изменением наименования, зарегистрированы Национальным банком Республики Беларусь 27 ноября 2007 года.

3. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51, телефон: (017) 306-26-36, факс (017) 306-26-37, e-mail — info@vtb-bank.by.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда
Уставный фонд Банка по состоянию на 01.02.2009 составляет 84 432 000 000 (Восемьдесят четыре миллиарда четыреста тридцать два миллиона) белорусских рублей.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовой отчет эмитента (бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств) и сроки его публикации
Годовой отчет Банка публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

6. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии облигаций первого выпуска (далее – облигации) можно ознакомиться в Банке по адресу: г. Минск, ул. К. Цеткин, 51, а также в филиалах Банка, в течение рабочего времени (понедельник – четверг - с 8.30 до 17.30, пятница — с 8.30 до 16.15):
- Филиал № 1 в г. Мозыре ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 247760, Гомельская область, г. Мозырь, ул. Интернациональная, д. 48.
- Филиал № 2 в г. Могилеве ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, д. 54.
- Филиал № 3 в г. Полоцке ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 211413, Витебская область, г. Полоцк, ул. Евфросиньи Полоцкой, д. 27.
- Филиал № 4 в г. Гродно ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 230019, г. Гродно, ул. Антонова, д. 21.
- Филиал № 5 в г. Бресте ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 224016, г. Брест, ул. Пушкинская, д. 59.
- Филиал № 6 в г. Гомеле ЗАО Банк ВТБ (Беларусь).
Место нахождения: Республика Беларусь, 246050, г. Гомель, ул. Советская, д. 32а.

7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций
7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о выпуске облигаций принято Советом директоров Банка 30 марта 2009 года, протокол № 2.

7.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций:
Форма выпуска облигаций – именные, процентные (с купонным доходом), в бездокументарной форме (в виде записей на счетах), неконвертируемые.
Объем эмиссии облигаций составляет – 30 000 000 000 (Тридцать миллиардов) белорусских рублей.
Количество облигаций, предлагаемых к открытой продаже – 30 000 (Тридцать тысяч) облигаций, которым присвоена серия «ВТБО-1», номера «000001-030000».

7.3. Номинальная стоимость облигаций
Номинальная стоимость облигаций – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

7.4. Цель выпуска облигаций
Целью выпуска облигаций является привлечение временно свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы Банка.

7.5. Период проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций проводится с 11.05.2009 по 11.11.2009 включительно и прекращается в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

7.6. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций осуществляется на внебиржевом рынке и/или в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (г. Минск, ул. Сурганова, 48а) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Владельцами облигаций могут быть только юридические лица - резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Для приобретения облигаций юридические лица могут обращаться в Банк (г. Минск, ул. К. Цеткин, д. 51) и филиалы Банка (указанные в п.6 настоящей краткой информации), в течение рабочего времени (понедельник – четверг — с 8.30 до 17.30, пятница — с 8.30 до 16.15).
Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором купли-продажи (первичного размещения) облигаций.
Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

7.6.1. Цена продажи облигаций
В день начала открытой продажи облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.

Начиная с календарного дня, следующего за днем начала открытой продажи облигаций, а также с календарного дня, следующего за днем выплаты купонного дохода за предшествующий период, покупатель также уплачивает за одну облигацию номинальную стоимость плюс накопленный купонный доход за текущий купонный период со дня начала текущего купонного периода до дня фактической продажи, рассчитываемый по следующей формуле:

$$НКД = \frac{(Н \times П1 \times К1 + Н \times П2 \times К2 + \ldots + Н \times Пn \times Кn)}{365 \times 100}$$

где:
НКД – накопленный купонный доход (белорусских рублей);
Н – номинальная стоимость облигации;
П1,П2,Пn – процентная ставка по соответствующему купону за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которого ставка по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, была неизменной, равной действующей ставке по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, минус 4,0 (Четыре) процентных пункта;
К1, К2, Кn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, была неизменной. При этом сумма К1+К2+…. Кn должна быть равна количеству дней текущего купонного периода, истекших со дня начала текущего купонного периода.
Расчет накопленного купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году. Проценты начисляются за каждый календарный день года.
День начала открытой продажи облигаций или день выплаты последнего купонного дохода и день расчета накопленного купонного дохода считаются одним днем.

7.7. Срок обращения облигаций
Срок обращения облигаций составляет **365 календарных дней, с 11 мая 2009 по 11 мая 2010**. Для расчета срока обращения облигаций день начала открытой продажи и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

7.8. Дата начала погашения облигаций и порядок их погашения
Дата начала погашения облигаций — **11 мая 2010 года.**
Погашение облигаций производится владельцам облигаций, имеющим право приобретать облигации в соответствии с условиями выпуска облигаций, в день их погашения на основании реестра владельцев облигаций. Реестр владельцев облигаций формируется по состоянию на **04.05.2010.**
Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями с **04.05.2010.**
В случае, если день погашения облигаций приходится на нерабочий день, погашение облигаций осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Банк осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в день погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам владельцев облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций, а также выплачивается доход за последний купонный период (иные неполученные купонные доходы – при их наличии) в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.9. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Доход по облигациям установлен в виде купонного дохода в размере **ставки по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, минус 4 (Четыре) процентных пункта.**

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$КД = \frac{(Н \times П1 \times К1 + Н \times П2 \times К2 + \ldots + Н \times Пn \times Кn)}{365 \times 100}$$

где:
КД – купонный доход (белорусских рублей);
Н – номинальная стоимость облигации;
П1,П2,Пn – процентная ставка по соответствующему купону за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которого ставка по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, была неизменной, равной действующей ставке по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, минус 4 (Четыре) процентных пункта;
К1, К2, Кn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка по однодневному расчетному кредиту, предоставляемому Национальным банком Республики Беларусь под залог ценных бумаг, была неизменной. При этом сумма К1+К2+…. Кn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде.
Расчет купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году. Проценты начисляются за каждый календарный день года.
Купонный доход по облигациям за первый купонный период начисляется с календарного дня, следующего за днем выпуска облигаций, по день его выплаты включительно.
Купонный доход по облигациям по второму и последующим купонным периодам, включая последний, начисляется с календарного дня, следующего за днем выплаты дохода за предшествующий купонный период, по день выплаты дохода (день погашения) включительно за соответствующий период.
Количество дней в текущем купонном периоде исчисляется:
За первый купонный период – с календарного дня, следующего за днем начала открытой продажи облигаций, по день расчета купонного дохода включительно;
По остальным периодам- с календарного дня, следующего за днем выплаты дохода за предшествующий период, по день расчета купонного дохода включительно.
Выплата купонного дохода производится на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств, в валюте номинала на счета владельцев облигаций. Выплата части купонного дохода не производится.

При отсутствии в реестре владельцев облигаций реквизитов текущего (расчетного) счета для безналичного перечисления денежных средств, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями с даты закрытия реестра для целей выплаты текущего купонного дохода до даты выплаты текущего купонного дохода.
Выплата купонного дохода по облигациям производится владельцам облигаций, имеющим право приобретать облигации в соответствии с условиями выпуска облигаций, периодически в соответствии с графиком выплат купонного дохода:

Номер купонного периода	Начало купонного периода	Конец купонного периода	Количество дней купонного периода	Дата выплаты купонного дохода (погашение)	Дата закрытия реестра для целей выплаты купонного дохода (погашения)
1	11.05.2009	11.08.2009	92	11.08.2009	04.08.2009
2	12.08.2009	11.11.2009	92	11.11.2009	04.11.2009
3	12.11.2009	10.02.2010	91	10.02.2010	03.02.2010
4	11.02.2010	11.05.2010	90	11.05.2010	04.05.2010

В случае, если выплата купонного дохода выпадает на нерабочий день, доход выплачивается в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем.
Проценты за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Дата окончания последнего купонного периода по облигациям — **11 мая 2010 года.**

7.10. Условия и порядок приобретения эмитентом облигаций до даты их погашения
Банк осуществляет досрочный выкуп облигаций в порядке, определенном п. 7.14 настоящей краткой информации.
Банк имеет право совершать следующие операции с выкупленными облигациями:
- продавать на вторичном рынке по договорной цене;
- досрочно погасить облигации в случае выкупа всего объема эмиссии облигаций.
- иные действия с выкупленными облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.11. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
При запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь денежные средства, внесенные в их оплату, возвращаются инвесторам не позднее 30 дней со дня принятия соответствующего решения с уплатой процентов за фактический срок пользования денежными средствами с начислением процентов, рассчитанных по формуле расчета накопленного купонного дохода, указанной в п. 7.6. настоящей краткой информации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

7.12. Дата и номер регистрации облигаций в регистрирующем органе
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «23» апреля 2009 года, регистрационный номер выпуска: 5-200-02-0254.

7.13. Информация об обеспечении облигаций
Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».
Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка.
Нормативный капитал Банка по состоянию на 01.02.2009 г. составляет 264 646.4 млн. белорусских рублей.
Выпуск облигаций согласован с Национальным банком Республики Беларусь – постановление Совета директоров Национального банка Республики Беларусь № 97 от 07 апреля 2009 года.

7.14. Порядок досрочного выкупа облигаций в период их обращения
Банк обязуется произвести досрочный выкуп облигаций у любого их владельца, имеющего право приобретать облигации в соответствии с условиями выпуска облигаций: **11.08.2009, 11.11.2009, 10.02.2010.**
Досрочный выкуп облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на торгах ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Цена досрочного выкупа облигаций равна номинальной стоимости облигаций (с выплатой купонного дохода за истекший купонный период).
В случае если дата досрочного выкупа облигаций приходится на нерабочий день, то выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем.
Для осуществления досрочной продажи владелец облигаций должен подать заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
- полное наименование владельца облигаций;
- номер выпуска и количество облигаций, предъявляемых к выкупу до даты начала их погашения;
- банковские реквизиты владельца облигаций для безналичного зачисления денежных средств от продажи облигаций;
- наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, при посредничестве которого будет осуществляться продажа облигаций через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (если досрочный выкуп осуществляется на биржевом рынке);
- согласие с условиями и порядком приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения, изложенными в зарегистрированном Проспекте эмиссии;
- место нахождения и контактные телефоны владельца облигаций;
- подпись владельца облигаций (уполномоченного лица владельца облигаций).

Заявление о досрочном выкупе облигаций должно быть предоставлено в Банк в следующие сроки:

Дата досрочного выкупа	Срок предоставления заявления о досрочном выкупе
11.08.2009	не позднее 04.08.2009
11.11.2009	не позднее 04.11.2009
10.02.2010	не позднее 03.02.2010

Заявления, предоставленные после указанных дат, Банк вправе не принимать к исполнению.
Заявление может быть передано по факсу (017) 216-23-88 с обязательным представлением оригинала в течение 3 (Трех) дней по адресу: 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51.

Банк имеет право выкупать облигации в течение всего срока обращения облигаций по цене, определяемой Банком.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 23 от 27.11.2007 г. УНП101165625.

У суд Савецкага раёна г. Гомеля паступіла заява аб аб'яўленні памерлай **КАМЕНІКОВАЙ Тамары Яўгеньеўны,** 2 жніўня 1979 года нараджэння, ураджэнкі г. Гомеля, апошняе вядомае месца знаходжання — г. Гомель.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Каменікову Т.Я., паведаміць іх суду Савецкага раёна г. Гомеля па адрасе: г. Гомель, Рэчыцкае шасэ, 45, пак. 2-11, тэл. 45 92 00 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 МАЯ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.30, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 00.10 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 «Зорныя танцы».
11.00 Off Stade Life.
11.05 Уласнай персонай.
12.10 Камедыя «Як разабрацца са справамі».
14.05 «Жыццё як жыццё». «Для каго я працую на дачы».
15.15, 19.40 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 «Інтуіцыя».
17.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Кваліфікацыйны раунд. У перапынку: «Зона Х».
19.55 «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Баявік «Мы з будучыні».
0.20 Дзень спорту.
0.30 Хакей для ўсіх.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 0.40 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40 Мультфільм.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 0.55 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
11.40 «Ералаш».
12.05 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 «Серыял «Гарачы лёд».
16.15 «Песні маёй краіны».
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
19.05 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.05 Серыял «Застава Жыліна».
23.25 «Адваротны адлік». «Рублёвыя метамарфозы».
23.55 Серыял «Місія празорлівасці».

6.55 «ЛАДная раніца».
7.55, 17.05 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Тэлебарометр.
8.35 Усё пра бяспеку.
9.05 У гэты дзень.
9.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05, 17.05 Серыял «Спадчынніца».
11.00 Маст. фільм «Шлях у спартзалу».
12.30 Слова пісьменніка.
13.00 Меладрама «Жанчына жадае ведаць».
13.50 Бухта капітанаў.
14.30 Мультсерыял «Галактычны футбол».
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Тайны смак.
15.40 Экспедыцыя.
16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Тэрмінова ў нумар!».
19.50 Беларуская часінка.
20.50 Калыханка.
21.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Кваліфікацыйны раунд.
23.30 Экспедыцыя.
23.35 Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае сненданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.55 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.30 Серыял «Сіла прыцягнення».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 Маст. фільм «Быць Стэнлі Кубрыкам».
15.30 «Я — падарожнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Вышыня 89».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 Серыял «Змагар»
0.25 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.05 «Лёгкае жыццё».
7.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.30 «Жывая гісторыя».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Касцяніцы. Пара лета».
12.05, 23.45 Маст. фільм «Атрад спецыяльнага прызначэння».
14.05 Дак. фільм «Вялікая перамога. Народная памяць».
15.20 «Саюзнікі».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Варыянт «Амега».
20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 3.00 Серыял «Паляўнічыя за абразамі».
22.20 «Свет спорту».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25 «Метэапрагноз».
7.30 Драма «Вертыкаль».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Камедыя «Бандыты».
12.45 «Праз 30 гадоў».
13.00 Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
16.50 «Ін-фармацыя».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10, 23.35 Астра-, метэапрагноз.
21.15 Трылер «Карабельздань».
23.15 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
8.50, 19.30 Серыял «Кармеліта».
9.40 Серыял «Не адрокаюцца любя...».
10.30 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 Дак. фільм «Аляксей Марэсьеў. Лёс сапраўднага чалавека».
12.20, 17.55 Серыял «Лэдзі Мэр».
13.20, 22.55 «Кулагін і партнёры».
13.50, 16.50, 18.50, 23.30 Навіны—Беларусь.
14.20 Серыял «Трое супраць усіх-2».
15.15 Маст. фільм «Наклюрн».
17.25 «Сумленны дэтэктыў».
20.30 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны». Каляровая версія.
22.40 «Нічога асабістага».
23.40 «Весткі+».
0.00 Дак. фільм «Масква. Пачатак перамогі».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Галоўны герой».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
16.30 Серыял «Адвакат».
18.10 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Серыял «Каця».
21.40, 23.20 Серыял «Апладысменты».
23.55 Серыял «Не свары-цеся, дзяўчаты».
0.45 Серыял «Як у старым дэтэктыве».

5.00, 15.10, 18.40, 3.00 Энцыклапедыя памылак.
5.15, 15.25, 3.15 Смак да жыцця.
5.55, 12.50, 16.05, 0.40, 3.55 Пазнай сябе.
6.25, 11.25, 16.35, 23.15, 4.25 Я чакаю дзіця.
6.55, 17.05 Хуткая дапамога.
7.25, 17.35 Здароўе з Малышавай.
8.00, 18.10 Нетрадыцыйная медыцына.
8.30, 20.20 Школа розуму.
9.00, 20.50 Увага, ежа!
9.30, 21.20 Панацэя.
10.00, 21.50 Колькі вам гадоў?
10.30, 22.20 Я.
10.55, 22.45 Выкрыццё прадуктаў.
11.55, 13.20, 14.45, 19.55, 23.45, 1.10, 2.35 Дзевяць месяцаў.
12.20, 0.10 Як не згубіць здароўе?
13.45, 18.55, 1.35 Клінічны прагноз.
14.15, 19.25, 2.05 Партрэт доктара.

6.00, 9.50, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Музыка на канале.
7.05, 14.00 Усё лепшае для вас.
7.35, 10.00, 17.00 Прыгажуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 16.00, 4.00 Гісторыі поспеху.
11.00, 3.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 5.00 Твой дом.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Грошы на провадзе».

7.00, 9.00, 16.00 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.00 Паляўнічы на крокадзілаў.
10.00, 18.00, 23.00, 4.45 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
11.00 Аддзел па абароне жывёл: паліцыя Маямі.
12.00, 19.00, 1.00, 6.35 «SOS дзікай прыроды».
12.30, 19.30, 1.30 Разбуральнікі стэрэатыпаў.
13.00 Вярблюджыя скачкі.
13.30 Гонкі з аленем.
14.00 Тэрыторыя жывёл.
15.00 Рууд і яго жукі.
17.00 Ветэрынары-стажоры.
17.30 «Запаведнік у нетрах Афрыкі».
20.00, 2.00 Памесце сурыкат.
20.30, 2.30 «Жыццё малпаў».
21.00, 2.55 Дзікая Еўропа.

9.30 Мотаспорт па выхадных.
9.45 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
10.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат свету.
14.45, 21.15 Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
19.00, 1.00 Футбол. Еўрагалы.
19.45 Футбол. Еўрагалы. Франк Рыберы.
20.00 Вось гэта дзіва!!!
20.15 Боўлінг. Кубак свету.
1.45 Мотаспорт па выхадных.
2.00 Армрэстлінг.

21.50 ФІЛЬМ ДНЯ

«МЫ З БУДУЧЫНІ» (РАСІЯ, 2008 г.)

Чацвёра «чорных следапытаў» вядуць раскопкі ў тых месцах, дзе калісьці ішлі баі. Вечарам на месцы раскопак пачынае адбывацца нешта дзіўнае, а ў знойдзеных салдацкіх кніжках раптам выяўляюцца фотаздымкі самі́х «следапытаў». Прыняўшы супадзенне за калектыўны глюк ад паленай гарэлкі, усе чацвёра бягуць асвяжыцца ў возеры, з якога вынырваюць прама на перадавую ў 1942-гі.

Рэжысёр — Андрэй Малюкоў. **У ролях:** Даніла Казлоўскі, Андрэй Цярэнцьеў, Уладзімір Яглыч, Дзмітрый Ваўкастрэлаў.

АЎТОРАК, 5 МАЯ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 1.35 Дзень спорту.
6.10, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.25 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 «Арэна».
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Галоўны калібр».
10.00 Маст. фільм «Выпадак з Палыніным».
11.40 «Зямля беларуская». «Святло Міёрскіх зорак».
12.10, 15.25, 16.45, 17.45 «Еўрабачанне. Масква-2009».
12.15 Серыял «Чатыры таксісты і сабака». 1-я серыя.
13.10 Серыял «Монк».
14.05 «Ход у адказ».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Здароўе.
15.55 Серыял «Тайна Святога Патрыка». 1-я серыя.
16.50 Серыял «Гарачы лёд».
17.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Арсенал — Манчэстэр Юнайтэд.
23.45 Трылер «Неспакойны сведка».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 1.15 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Чакай мяне».
10.05 «Генрых Гімлер. Пагоня за зданню».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 1.30 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 Серыял «Гарачы лёд».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Шалёны анёл».
22.10 Серыял «Застава Жыліна».
23.30 «Крэмль-9. Спецсувязь».
0.30 Серыял «Місія празорлівасці».

6.55 «ЛАДная раніца».
7.55, 16.55 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20, 18.50 Серыял «Тэрмінова ў нумар!».
9.05 У гэты дзень.
9.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.05, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
11.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
11.50 Дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы». 1-я серыя.
12.40 Меладрама «Жанчына жадае ведаць».
13.25 Дак. фільм «Добры дзень, мае дарагія...».
13.55 Мультфільм.
14.05 Мультсерыял «Галактычны футбол».
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Бітва экстрасэнсаў.
16.00 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
19.55 Беларуская часінка.
20.55 Калыханка.
21.15 Экспедыцыя.
21.20 Спорт-кадр.
21.50 Дэтэктыў «Шчоўкні пальцам толькі раз...».
23.50 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.40 Маст. фільм «Вышыня-89».
10.40 «Дарагая перадача».
10.55 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.30 Серыял «Сіла прыцягнення».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
14.20 «Далёкія сваякі».
14.40 Серыял «Брыдкае качаня».
15.30, 23.00 Серыял «Змагар».
16.50 «Сталічны футбол».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Серыял «Смерць шпіёнам-2». Заключная серыя.
21.40 «Аўтапанарама».
22.00 «Вайна. Вядомая і невядомая». «На полі «брані».
23.55 «Надзвычайныя гісторыі».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 2.30 Садружнасць Live.
5.30 «Саюзнікі».
6.05 «Свет спорту».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.05 «Лёгкае жыццё».
7.30 «Каму на Русі жыць добра...».
8.05, 1.30 «Жывая гісторыя».
9.05, 20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
10.05 Серыял «Скрыжаванне».
11.05 «Тайны забытых перамог» — «Зброя перамогі. Іл-2. Т-34».
12.05, 23.45 Маст. фільм «Атрад спецыяльнага прызначэння».
14.05 Дак. фільм «Вялікая перамога. Народная памяць».
15.20 «Дыялог з усім светам».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Маст. фільм «Варыянт «Амега».
21.20, 3.00 Серыял «Паляўнічыя за іконамі».
22.20 «Тэатр пачынаецца».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00 «К-гульні».
7.10 «Метэапрагноз».
7.15 Дэтэктыў «Кантракт».
8.50 «8 самых».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «Кіно—кліп—парад».
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
10.40 «Навіны кіно».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
10.55, 23.30 «Астра-, метэапрагноз».
11.00 Трылер «Карабельздань».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Маскоўская сага».
17.50 «Ін-фармацыя».
18.00 Серыял «Астанкі, якія гавораць».
18.50 «Стары магнітафон».
19.15 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
19.30 «Праз 30 гадоў».
20.35 «Глянец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-гульні — «Лайт».
21.05 Драма «Вадзіцель для Веры».
23.05 Вячэрні канцэрт тэлечата.

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10, 19.30 Серыял «Кармеліта».
10.00, 11.25, 20.30 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
12.20, 17.55 Серыял «Лэдзі Мэр».
13.20, 22.40 «Кулагін і партнёры».
13.50, 16.50, 18.50, 23.10 Навіны — Беларусь.
14.20 Дак. фільм «Выратаваць ад Асвенціма. Подзвіг палітрука Кісялёва».
15.15 Маст. фільм «Сакрэтны фарватэр». 1-я серыя.
17.25 «Вандроўкі музыканта».
23.20 «Весткі+».
23.40 Дак. фільм «Пост № 1. Невядомы салдат».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 Канал «Сёння раніцай».
9.00 «Праграма Максімум».
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Жаночы погляд». Аксана Робскі.
11.20 Серыял «Залатыя хлопцы».
12.10, 0.45 Серыял «Як у старым дэтэктыве».
13.20 Серыял «Свой—чужы».
16.30 Серыял «Адвакат».
18.15 «Ты не паверыш! Ньюс».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Серыял «Каця».
21.40, 23.20 Серыял «Апладысменты».
23.55 Серыял «Не свары-цеся, дзяўчаты».

5.00, 15.10, 2.50 Клінічны гіпноз.
5.30, 15.40, 3.20 Партрэт доктара.
6.00, 13.20, 14.45, 16.40, 19.35, 1.00, 2.25, 3.50 Дзевяць месяцаў.
6.25, 16.35, 4.15 Энцыклапедыя памылак.
6.40, 16.50 Смак да жыцця.
7.20, 14.15, 17.30, 20.00, 1.55 Пазнай сябе.
7.50, 12.50, 18.00, 0.30 Я чакаю дзіця.
8.20, 18.30 Хуткая дапамога.
8.50, 20.30 Здароўе з Малышавай.
9.25, 21.05 Нетрадыцыйная медыцына.
9.55, 21.35, 4.30 Школа розуму.
10.25, 22.05 Увага, ежа!
10.55, 22.35 Панацэя.
11.25, 23.05 Колькі вам гадоў?
11.55, 23.35 Я.
12.20, 0.00 Выкрыццё прадуктаў.
13.45, 19.00, 1.25 Як не згубіць здароўе?

6.00, 9.50, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Музыка на канале.
7.05, 14.00 Усё лепшае для вас.
7.35, 10.00, 17.00 Прыгажуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 16.00, 4.00 Гісторыі поспеху.
11.00, 3.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 5.00 Маю права.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Грошы на провадзе».

7.00, 9.00 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.00 Паляўнічы на крокадзілаў.
10.00, 18.00, 22.00, 3.50 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
11.00 Аддзел па абароне жывёл: паліцыя Маямі.
12.00, 19.00, 1.00, 6.35 «SOS дзікай прыроды».
12.30, 19.30, 1.30 Разбуральнікі стэрэатыпаў.
13.00 Моцны ўкус.
14.00 Тэрыторыя жывёл.
15.00 Рууд і яго жукі.
16.00 Моц прыроды.
17.00 Ветэрынары-стажоры.
17.30 «Запаведнік у нетрах Афрыкі».
20.00, 2.00 Памесце сурыкат.
20.30, 2.30 «Жыццё малпаў».
21.00, 2.55 Дзікая Еўропа.

9.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат свету. Фінал.
11.00, 12.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал.
12.00 Футбол. Еўрагалы. Андрэа Пірло.
14.00 Тэніс. Турнір WTA.
19.00, 21.15 Футбол. Еўрагалы.
19.15, 1.00 Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
22.00 Бокс. Т. Адамек (Польшча) — Дж. Бэнкс (ЗША).
0.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
0.30 Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.

21.50 ФІЛЬМ ДНЯ

«ПСТРЫКНІ ПАЛЬЦАМ ТОЛЬКІ РАЗ...» (ФРАНЦЫЯ, 2005 г.)

Яшчэ нядаўна яны наведвалі сваю цётку, якая запэўнівала іх, што ў яе доме для састарэлых хтосьці забівае пастаяльцаў, а цяпер яна мёртвая. У дадатак кудысьці падзявалася старая дама, якая запэўнівала, што за старадаўнім камінам схаванае дзіця. Яны ўпэўненыя — у райскім прытулку сапраўды робяцца чорныя справы, а ўсмешлівыя твары мясцовых жыхароў — усяго толькі маскі.

Рэжысёр — Паскаль Тома. **У ролях:** Катрын Фро, Андрэ Дзюсальe, Жэнеўеў Бюжо, Ларан Тэрзіеф, Валеры Капрыскі.

Кошт цыгарэт «пацяжэў» у сярэднім на 8,4 %

Сёлета ўжо ў трэці раз павышаныя цэны на цыгарэты: рознічныя цэны на цыгарэты вытворчасці ТАА «Тытунь-інвест» у сярэднім узраслі на 8,4 %.

Як адзначылі ў Мінэканомікі, цэны павышаныя з мэтай кампенсаваць падаражанне затрат на вытворчасць тытунёвай прадукцыі. Рознічныя цэны на ўвесь асартымент цыгарэт, што выпускаюцца прадпрыемствам, «пацяжэлі» на 2,4-14,3 %, ці ў сярэднім на 8,4 %. Напрыклад, кошт «Winstana» павялічаны да 2490 рублёў, «Monte Carlo» — да 2000. Раней сёлета цыгарэты даражэлі напрыканцы студзеня і сакавіка ў сярэднім на 10 %.

Ігар ГРЫШЫН.

Еўрабачанне-2009

ЛЯЦІ, ПЕСНЯ!

Да пачатку чарговага еўрапейскага песеннага форуму засталіся лічаныя дні. Раніцай у суботу, 2 мая, беларуская дэлегацыя вылятае ў Маскву, а ўжо 3 мая адбудзецца першая рэпетыцыя і прэс-канферэнцыя нашага ўдзельніка — Пятра Елфімава. Другая рэпетыцыя і прэс-канферэнцыя запланаваныя на 7 мая.

Нягледзячы на папярэднія творчыя рознагалоссі паміж камандай выканаўцы і прадстаўнікамі Белтэлерадыёкампаніі, пункт раўнавагі, відавочна, знойдзены, і дасягнутыя дамоўленасці, якія больш-менш задавальняюць усе бакі. Напрыклад, канчаткова зацверджана, што сцэнічны касцюм, абраны выканаўцам (камплект з курткі і штаноў з белай скуры), мяняцца не будзе, а над пастаноўкай нумара ўсё-ткі працягне працаваць вядомы польскі рэжысёр Януш Юзефовіч. Што да непасрэдна конкурснага выступлення, то раскрываць загадзя ўсе яго сакрэты і іскрынкі члены дэлегацыі адмовіліся — «Самі ўсё ўбачыце». Зрэшты, вядома, што ў нумары будуць выкарыстаны камп'ютарныя спецэфекты.

— Усё, што залежыць ад мяне як выканаўцы, я пастараюся зрабіць. У мяне добры, баявы настрой, — расказаў напярэдадні ад'езду Пётр Елфімаў. — Я еду дастойна прадставіць сваю краіну — гэта найпершае і самае галоўнае. Цяпер я спакойны: выйду на сцэну — тады будзе кураж і самаддача на ўсе сто, дзвесце працэнтаў.

На роспыты, ці ёсць нейкія сакрэты і рытуалы для таго, каб настроіцца на паспяховае выступленне, спявак аджартаваўся: «Шматочак сала...». Але потым сур'ёзна дадаў — пэўны рытуал ёсць, але няхай ён застанецца ў сакрэце: «Давайце спачатку даедзем, а там паглядзім».

Што даўно не сакрэт — гэта конкурсная песня Пятра «Eyes that never lie». Яе пачулі ўжо падчас прома-туру беларускага выканаўцы ў Фінляндыі, Малдове, Балгарыі, Грэцыі, Македоніі, ва Украіне, у Турцыі, Расіі. Ад паездак у Вялікабрытанію, Бельгію і Галандыю давялося адмовіцца, каб дапрацаваць нумар. Затое гледачы гэтых краін, зрэшты як і ўвогуле ўсе ахвотныя, нядаўна пазнаёміліся з відэаверсіяй песні беларуса — кліпам, які зняў украінскі рэжысёр Сямён Гораў (ён жа рабіў відэа для Руслана Аляхно, Веркі Сярдзючкі, прадстаўнікоў Азербайджана Эльнура і Саміра). І хоць самому Пятру Елфімаву кліп не даспадобы, інтэрнэт-суполка прыняла яго на ўра — дастаткова сказаць, што пасля выкладвання відэа ў інтэрнэце букмекерскія канторы пачалі рабіць стаўкі на выхад Беларусі ў фінал конкурсу.

Па традыцыі, беларуская дэлегацыя прадэманструе на «Еўрабачанні» адмысловую прома-прадукцыю, якая штогод распрацоўваецца для кожнага канкурсанта. Сёлета ў прома-пакеце — як традыцыйныя паштоўкі, постары, кампакт-дыскі, партфоліо, так, напрыклад, і буклет з маляўнічымі беларускімі краявідамі, 8 разнавіднасцяў маек, фірмовыя запальнічкі, візітніцы, аксесуары для мабільных тэлефонаў і нават імянная пячатка Пятра Елфімава. Акрамя таго, не абыдзецца без ласункаў — 900-грамовая каробка адмыслова падабраных цукерак, алкагольныя вырабы, марожанае... Апошнім беларуская дэлегацыя збіраецца частаваць гасцей на нацыянальнай вечарынцы, якая адбудзецца ў Еўраклубе 7 мая. У госці ж чакаюцца як беларускія ўдзельнікі «Еўрабачання» мінулых гадоў — Руслан Аляхно, Дзмітрый Калдун, Паліна Смолава, Анжэліка Агурбаш, — так і канкурсанты з Расіі і Украіны, нарвежац з беларускімі каранямі Аляксандр Рыбак; атрымалі запрашэнні таксама Патрысія Каас, Дзіма Білан, Філіп Кіркораў... «Гэта не значыць, што ўсе запрошаныя абавязкова прыйдуць, але мы будзем рады ўсіх бачыць», — адзначыла выканаўчы прадзюсар дырэкцыі музычных і забаўляльных праграм БТРК Анастасія Ціхановіч.

«Прома, кліп, касцюм — гэта ўсё добра, але галоўны паказчык — сам канцэрт, — настройвае ўсіх удзельнікаў на працоўны лад кіраўнік дэлегацыі, намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка. — Калі не толькі нашы суседзі, але і далёкія замежнікі будуць аддаваць галасы за Беларусь, тады будзе зразумела, што нумар удаўся і артыст запомніўся».

Нагадаем, Пятру Елфімаву выпала выйсці на сцэну «Еўрабачання-2009» у першым паўфінале, 12 мая, пад нумарам 4. У гэтым жа паўфінале ўдзельнічаюць Арменія, Андора, Балгарыя, Бельгія, Босніі і Герцагавіна, Ізраіль, Ісландыя, Мальта, Македонія, Партугалія, Румынія, Турцыя, Фінляндыя, Чарнагорыя, Чэхія, Швецыя, Швейцарыя, транслююць і галасуюць Вялікабрытанія і Германія. Другі паўфінал адбудзецца 14 мая — у ім удзельнічаюць, у прыватнасці, амаль усе нашы суседзі — Польшча, Украіна, Літва, Латвія, а Расія, Францыя і Іспанія трансляцыю і галасуюць. Фінал конкурсу адбудзецца 16 мая. Ці давядзецца нам падтрымаць Пятра і там — пакуль рана прадказваць. Хіба што пажадаць удачы — і глядзець.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ГОДОВОЙ БАЛАНС
общества с ограниченной ответственностью «Альфа-Брокер» за 2008 год

220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, д. 16, тел. 200 42 08

млн. руб.

АКТИВ	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
Основные средства	110	—	—
Нематериальные активы	120	—	—
Запасы и затраты	210	—	8
Дебиторская задолженность	230	—	3
Денежные средства	250	—	5
Финансовые вложения	260	—	—
БАЛАНС	300	—	16
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало отчетного года**	**На конец отчетного года**
1	2	3	4
Уставный фонд	410	—	3
Добавочный фонд	430	—	—
Нераспределенная прибыль	450	—	-1
Краткосрочные займы и кредиты	510	—	8
Кредиторская задолжность	530	—	6
БАЛАНС	700	—	16

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
общества с ограниченной ответственностью «Альфа-Брокер» за 2008 год

млн. руб.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код строки	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	18	—
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	3	—
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	15	—
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	15	—
Прибыль от реализации	060	—	—
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	—	—
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	—	—
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	—	—
в том числе, прочие операционные доходы	083	—	—
Операционные расходы	090	—	—
в том числе, прочие операционные расходы	093	—	—
Прибыль от операционных доходов и расходов	120	—	—
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	—	—
Внереализационные расходы	150	1	—
в том числе: курсовые и суммовые разницы	152	—	—
прочие внереализационные расходы	154	—	—
Убыток от внереализационных доходов и расходов	160	-1	—
ИТОГО прибыль за отчетный период	200	—	—
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	—	—
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	1	—
Чистая прибыль (Убыток)	240	-1	—

В 2008 году компания сотрудничала с аудитором индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной. Юридический адрес: 220022, г. Минск, ул. Чайлытко д. 20, кв. 64. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495395 от 05.01.2009 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2014 г. УНП 100990426 Свидетельство о государственной регистрации от 24.08.2000 г. № 955 выдано Минским горисполкомом.

Аудиторское заключение: бухгалтерская (финансовая) отчетность

ООО «Альфа-Брокер», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Альфа-Брокер» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год, при этом совершенные ООО «Альфа-Брокер» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

УНП 806000258

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 мая
3.00, 20.30 Трылер «Ван Хельсінг».
5.30 Камедыя «Проста сябры».
7.00 Драма «Наэль».
9.00 Камедыя «У шоу толькі дзяўчаты».
11.00 Камедыя «Еўратрып».
13.00 Камедыя «Дабіся

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Сталічныя кватэры ўпэўнена таннеюць — прыкладна на 4 долары штодзень за 1 м²

Жыллёвая нерухомасць на другасным рынку Мінска пачала плаўна таннець яшчэ восенню мінулага года. З другой паловы студзеня другасны рынак жылля трапіў у зону нулявога попыту і максімальнай прапановы. Паводле інфармацыі інтэрнэт-парталаў, тады колькасць прапаноў жыллёвых аб'ектаў на продаж у Мінску павялічылася да 9,5 тысячы кватэр.

Паводле інфармацыі экспертаў рынку нерухомасці, за два першыя месяцы года сярэднія цэны на другасныя кватэры сталіцы знізіліся прыкладна на 12—13 працэнтаў, а вось за сакавік жыллё на другасным рынку патаннела адразу на 8,5 працэнта. У красавіку тэндэнцыя на патанненне кватэр працягваецца. Згодна са статыстыкай інфармацыйнага каталога, хуткасць патаннення кватэр складае цяпер ад 25 да 30 долараў за квадратны метр жылых памяшканняў штотыднёва. Сёння сярэдні кошт квадратнага метра прапануемых на продаж адна- і двухпакаёвых кватэр складае 1500—1550 долараў. Між іншым, па такім ужо завышаным кошце кватэры пакупнікі ўжо не бяруць. Пры рэальным продажы жыллё набываецца толькі тады, калі квадратны метр агульнай плошчы кватэр прадаўцы зніжаюць да 1300—1400 долараў. Сёння ў сталіцы з'явіліся не вельмі якасныя аднапакаёўкі ў Заводскім раёне і Шабанах па стартавым кошце 38—39 тысяч долараў. Галоўным чынам, гаворка ідзе аб кватэрах на першых ці апошніх паверхах з агульнай плошчай 31—33 квадратныя метры. Без вялікіх праблем цяпер можна адшукаць стандартныя аднапакаёўкі і ў дзевяціпавярховых дамах коштам да 45 тысяч долараў. У агенцтвах нерухомасці з'явілася шмат прапаноў і па танных двухпакаёвых кватэрах. Невялікія «хрушчоўкі» ў старых пяціпавярховых дамах агульнай плошчай да 44—46 квадратных метраў прапануюцца цяпер ад 50 да 55 тысяч долараў.

Найбольш смелыя аналітыкі Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» упэўненыя, што наступствы сусветнага фінансавага крызісу і дарагія жыллёвыя крэдыты будуць спрыяць далейшаму патанненню сталічнага жылля. Паводле іх прагнозаў, ужо ў ліпені-жніўні квадратны метр старых двухпакаёвых і трохпакаёвых «хрушчовак» будзе каштаваць не больш за тысячу долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Ні даляраў, ні тавараў
Не збіраю ў хаце:
Ураджайныя абшары —
Вось маё багацце.
Ураджайную зямлю —
Дзе знайсці такую:
Кінеш слова у раллю —
Песняй каласуе.
Тут пасля дажджоў вясёлых
Ручаін суполка,
Упадзе праменьчык долу —
Прарасце вясёлка.
Не пакіне у бядзе
Той абшар бясконцы —
Як слязіна упадзе —
Ўстануць абаронцы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.36	20.39	15.03
Віцебск —	5.21	20.33	15.12
Магілёў —	5.26	20.29	15.03
Гомель —	5.28	20.20	14.52
Брэст —	5.52	20.53	15.01
Гродна —	5.57	20.49	14.52

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Засімы, Івана, Сямёна, Фёдара.*
К. *Лілії, Барталамея, Ігара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў МАІ

3, нядзеля, *0.00—3.30*
5, аўторак, *0.30—9.00*
7, чацвер, *9.00—16.00*
9, субота, *18.00—23.00*
10, нядзеля, *0.00—2.00*
12, аўторак, *5.00—12.00*
14, чацвер, *15.30—23.00*
15, пятніца, *0.00—3.00*
17, нядзеля, *9.30—13.30*
19, аўторак, *20.30—23.00*
22, пятніца, *0.00—3.30*
24, нядзеля, *0.30—5.30*
26, аўторак, *0.30—6.00*
28, чацвер, *2.00—7.00*
30, субота, *7.30—9.30*

Бяседныя песні — Sto lat! Сто гадоў!

Бяседа тады набывае эмацыйную прыўкрасу, калі ўсталюецца вясёлы рытм застольнага рэю і прагучаць вітальныя песні. Яны адрасуюцца гаспадарам, уганароўваюць юбіляраў, вітаюць доўгачаканых гасцей, услаўляюць добрыя справы.

На Беларусі бытуе шэраг такіх твораў. Сярод іх — «Віншавальная» і «Сто гадоў», якія з'явіліся ў апошні час, рускамоўнае «Вечные лета!», польскамоўнае «Sto lat!».

Песню «Sto lat!» спяваюць на застоллях ужо не адно стагоддзе (упершыню згадваецца ў дакументальных матэрыялах у XVIII стагоддзі). Пашырана яна і на беларускіх землях. Існуе ў варыянтах (у кожным рэгіёне тэкст дапаўняецца мясцовымі пажаданнямі, вітальнымі словамі). У газеце падаецца тэкст паводле польскіх спеўнікаў.

Народная песня

Сто лят!
Сто лят, сто лят, нех жые, жые нам!
Сто лят, сто лят, нех жые, жые нам!
Ешчэ раз, ешчэ раз
Нех жые, жые нам!
Нех жые, жые нам!

Транскрыпцыя з польскай мовы.

Сто гадоў!
Сто гадоў,
сто гадоў няхай жывецца,
Сто гадоў, сто гадоў
няхай жывецца, жывецца нам!
Яшчэ раз, яшчэ раз
Няхай жывецца, жывецца нам!
Няхай жывецца нам!

Пераклад на беларускую мову.

Песня-віншаванне «Sto lat!» змяшчаецца па просьбе М.М. Гарэвіча з пасёлка Ударны Нясвіжскага раёна.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Дваццаць пяць гадоў таму такімі ж веснавымі днямі пачаў сваю працу ў «ЗВЯЗДЗЕ» наш уласны карэспандэнт па Гомельскай вобласці **Уладзімір ПЕРНІКАЎ**. Сёння наш калега сярод самых вядомых, вопытных журналістаў беларускай прэсы, якія плённа працуюць. Мы зычым яму і надалей годна несці імя звяздоўца.

ДВАЦЦАЦЬ ПЯЦЬ гадоў — юнацкі крок,
Удосталь сілы, планаў і натхнення,
Для звяздоўцаў свой дзень нараджэння —
У працоўнай біяграфіі радок.

Калектыў рэдакцыі газеты «ЗВЯЗДА».

Шчыра віншуем **з 55-годдзем Зінаіду Іосіфаўну ШЫМАНСКУЮ** з в. Крывое Сяло Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Ад душы жадаем не хварэць,
Шчасце поўнае мець,
Ніколі не хвалявацца,
У жыцці часцей усміхацца.
Каб старасць не падкралася,
Каб маладосць засталася.
Каб людзі паважалі,
Часцей у госці запрашалі.

Родныя.

Любую цешчу і маці **СТАЛЬЧЫНСКУЮ Марыю Васільеўну** віншуем **з юбілеем**. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою, шчасця і дабрабыту. Будзьце заўжды такой жа энергічнай і прывабнай.

Зяць і дачка.

Дарагога тату і любага дзядулю **Яўгенія Георгіевіча ШЫШКО** з в. Відзейкі віншуем **з 60-годдзем** і з гэтай нагоды шчыра жадаем:

Здароўе мець, са шчасцем жыць,
Не знаць бяды. Жадаем згоды,
Да ста гадоў вам зычым жыць.

Жонка, дзеці, унукі, *г. Мінск.*

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу:
220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 8 МАЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 6 мая), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 8 мая) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – до 6 мая 2009 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.

УНП 100325912.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 **№ 13 (302)**

Расліны падкажуць

Як толькі надыходзіць пара сеяць і саджаць, агароднікі думаюць-варажаць, калі пачынаць. Пасееш вельмі рана — «прыхопець» замаразкі, спознішся — расліна не выспее. Тэрміны сяўбы, якія прыводзяцца ў артыкулах, кнігах, даволі прыблізныя, а трэба думаць і пра кліматычныя ўмовы. І тут на дапамогу прыходзяць расліны, якія растуць у садзе ці крыху паводдаль.

Дапусцім, **ляшчына**. Як толькі яна пакрыецца пушыстымі суквеццямі, можна высяваць шпінат, а на ўцепленую градку — радыску.

У садзе зацвілі **крокусы** — смела высявайце цыбулю парэй, а праз некалькі дзён — моркву і пятрушку.

Калі з'явіліся **кветкі нарцысаў**, можна высяваць салату, ранюю рэдзьку, высаджвайце расаду кальрабі і савойскай капусты. Праз некалькі дзён на падыходзе сяўба гароху, бураку, высаджвайце белакачанную капусту.

Як толькі зацвіце вішня, высяваюць кроп, зацвіце **каштан** — фасолю і летнія гатункі радыскі і рэдзькі, зацвіце **бэз** — летнюю і качанную салату і крыху пазней — раннія агуркі.

Не забудзьцеся ў маі...

- Пакуль не настала фаза цвіцення ў пладовых дрэў, завяршыць фарміраванне кроны і абрэзку.
- Знішчыць шкоднікаў на дрэвах (яблыневы кветаед, вусені шаўкапрада і інш.)
- У першай дэкадзе мая падняць і прывязаць да шпалеры маліну, ажыну, лімоннік.
- Прапалоць суніцы, глебу замульчыраваць рэзанай саломай, імхом, сасновымі ці яловымі іголкамі.
- За некалькі дзён да высадкі расады патрымаць яе пры нізкай тэмпературы і вільготнасці, вынесці на адкрытае паветра, шчодра паліць перад пасадкай у грунт.
- Рыхліць глебу на градках на наступны дзень пасля дажджу.
- Для раслін, якія ўюцца, пасля акучвання і праполкі ставіць апоры.
- Пры пагрозе замаразкаў усходы бульбы і агароднінных культур прыкрыць плёнкай, мешкавінай, саломай, а ў бульбы поўнасцю засыпаць усходы зямлёй і толькі праз 2—3 дні вызваліць іх верхнюю частку).

«Паршывая» хвароба

Неба пахмурнае з самай вясны, рэдка калі прагляне сонейка, а дождж імжыць і імжыць, часам ліе як з вядра, і так усё лета, і мы кажам «паршывае надвор'е». Паршывае таму, што пры такім надвор'і ў садах яблыні і грушы пачынаюць хварэць на небяспечнае грыбковае захворванне — парашу. Спачатку на лістах утвараюцца масляністыя плямы, паступова яны робяцца шэрымі, а потым пакрываюцца зеленавата-бурым налётам. Лісты засыхаюць і ападаюць задоўга да восені. На пладах, якія завязаліся, таксама выяўляюцца шэра-бурыя плямы. Плады ў гэтым выпадку растрэскваюцца і ападаюць.

Узбуджальнікі хваробы — грыбы — зімуюць на апалых лістах, а ў грушы яшчэ і на маладых парастках. У цёплае дажджлівае надвор'е пры загушчанай насадцы пладовых дрэў, калі яны да таго ж у салідным узросце ці аслабленыя, хвароба распаўсюджваецца хутка. Парша шкодная не толькі тым, што зніжае ўраджай і псуе знешні выгляд. Пашкоджаныя паршой дрэвы хутка слабеюць і ў выніку моцна пакутуюць ад неспрыяльных фактараў асяроддзя, асабліва ад маразоў.

Для таго, каб сад не запаршывеў, яшчэ з восені трэба сабраць апалае лісце і спаліць ці закапаставаць, старанна прысыпаючы зямлёй, бо без доступу паветра грыбковыя споры не ўтвараюцца. Загушчаныя кроны яблынь і груш абавязкова прарэдзіць, гэта мае дачыненне і да прафілактычных мераў. Першую апрацоўку дрэў супраць гэтай хваробы робяць у стадыі «адасаблення бутонаў», гэта значыць калі кветкавая пупышка ўжо праклюнулася, але бутоны яшчэ не раскрыліся. Трэба сказаць, што ў гэты час самкі яблыневага кветаеда пачынаюць адкладваць у бутоны яйкі. Для барацьбы выкарыстоўваюць сумесь полікарбацыну і, напрыклад, дэцісу ці каратэ, арыво, шэрпы. Полікарбацыну на 10 л вады бяруць 40 г, а для кожнага з пералічаных інсектыцыдаў патрабуецца свая канцэнтрацыя (звычайна пазначаная на ўпакоўцы ці інструкцыі, якая прыкладаецца).

Апрацоўку праводзяць раніцай, пакуль не прыгравае сонца, у бязветранае надвор'е. Апырскваюць не толькі галінкі пладовых дрэў, але таксама і ствалы, і прыствольныя кругі. Пасля заканчэння цвіцення апрацоўку неабходна паўтарыць. Тыдні праз тры пасля цвіцення яшчэ раз апрацаваць дрэвы ў садзе. Гарантыя, магчыма, не стопрацэнтная, але хваробаў і шкоднікаў будзе менш.

Замест полікарбацыну можна выкарыстаць хлорвокіс медзі, калоідную серу, аксіхом, а таксама актэлік, які лічыцца даволі эфектыўным інсектыцыдам.

У агародзе бузіна...

Калі мы ўзгадваем народную прыказку пра «дзядзьку ў Кіеве», бузіна ўспрымаецца намі не інакш як пустазелле, якое расце не дзе-небудзь у лесе, а менавіта ў агародзе. З'яўленне яе там не выпадковае (маецца на ўвазе толькі чорная бузіна), вядома яна спакон веку і заўсёды карысталася заслужанай папулярнасцю.

У народнай медыцыне здаўна прымянялі маладыя лісты, кветкі і плады як вяжучы, патагонны, мачагонны і слабіцельны сродак. Адвар з яе кветак прымянялі пры рэўматызме, падагры і артрытах. Маладымі лістамі, якія адварвалі ў мёдзе, лячылі хранічныя запоры, а свежымі ягадамі — рэўматызмы і неўралгіі. Ды і цяпер, у нашы дні, адвары з бузіны ў выглядзе інгаляцый прымаюць пры грыпе і прастудных захворваннях, цукровым дыябеце, гепатыце і язвеннай хваробе страўніка. Прымочкі, вільготныя павязкі, намочаныя ў настоі ягад чорнай бузіны, паскараюць зажыўленне ран, апёкаў, фурункулаў.

Ягады **чорнай бузіны** змяшчаюць даволі многа аскарбінавай кіслаты, з іх можна рабіць варэнне, мармелад, кісель, віно, воцат, начынку для цукерак, а таксама выкарыстоўваць для падфарбавання пладовых і ягадных сокаў. Для надання мускатнага паху шампанскім вінам выкарыстоўваюць кветкі чорнай бузіны. Калі суквецці чорнай бузіны дабавіць у цеста, печыва набывае міндальны смак. Англічане, напрыклад, абмочваюць іх ва ўзбіты да стойкай пены бялок, пасыпаюць цукровай пудрай і запякаюць у духоўцы, атрымліваецца незвычайнае паветранае пірожнае, якое трэба падаваць з малінавым сіропам. Вось такі далікатэс!

Ягады чырвонай бузіны для ежы не прыдатныя, нават ядавітыя! У былыя часы з пладоў чырвонай бузіны выраблялі чарніла, выціскалі алей і выкарыстоўвалі замест мыла. Па знешнім выглядзе чорную бузіну ад «сястрыцы» можна адрозніць нават у час цвіцення: у чорнай — кветкі белыя і пахнуць мінда лем, у чырвонай — зеленаватыя і з непрыемным пахам.

Бузіну, як чорную, так і чырвоную, спецыяльна высаджвалі каля свірнаў і клецяў, дзе захоўвалі збожжа, бо яе не выносяць мышы і пацукі. Мухі з тараканамі таксама не любяць яе паху. Некалі ў хатах у кутах стаялі бузіновыя венікі ў якасці надзейнага сродку ад гэтых надакучлівых насякомых. Заўважана, што расліны бузіны дапамагаюць і ў садзе, адпуджваючы некаторых шкоднікаў. Так, напрыклад, на кусце агрэсту, які расце непадалёк ад бузіны, ніколі не бывае агнёўкі, а тлю ў асобныя гады быццам магнітам прыцягвае з усяго агарода куст бузіны. А вось быццам бяскрыўдны выраз «бузіць», калі ведаць яго паходжанне, набывае грознае значэнне. Рыхлы асяродак драўніны бузіны можа быць выкарыстаны як кампанент для прыгатавання пораху.

Бузіна вельмі непатрабавальная, пераносіць засуху, цень, вылучаецца хуткім ростам, добра пераносіць абрэзку і хутка пасля яе адрастае, не патрабуе мінеральных падкормак, не баіцца маразоў і ядавітых выкідаў прамысловых прадпрыемстваў.

Чорную бузіну можна аднесці і да дэкаратыўных раслін. Для падтрымання пастаяннай высокай дэкаратыўнасці кустоў бузіны рэкамендуецца частая і моцная амаладжальная абрэзка.

Размнажаецца бузіна вельмі лёгка — насеннем, зялёнымі і адзеравянелымі чаранкамі, каранёвымі атожылкамі, прычым дэкаратыўныя формы трэба размнажаць толькі вегетатыўным спосабам. Пры насенным спосабе размнажэння неабходны чатырохмесячная стратыфікацыя і выкарыстанне толькі свежасабранага насення, таму што яно хутка губляе ўсходжасць.

30 красавіка

1945 год — у Берліне над захопленым рэйхстагам узняты Сцяг Перамогі. Разам са стралковымі падраздзяленнямі рэйхстаг штурмавалі танкісты 23-й танкавай брыгады. Штурмавыя падраздзяленні метр за метрам ачышчалі будынак ад фашыстаў. Вечарам рэйхстаг быў цалкам захоплены. На яго франтоне разведчыкі 756-га стралковага палка 150-й дывізіі М.А. Ягораў і М.В. Кантарыя на чале з намеснікам камандзіра батальёна лейтэнантам А.П. Берастам устанавілі чырвоны сцяг. Міхаіл Аляксеевіч Ягораў, беларускі партызан, пачынаў вайну камандзірам разведкі Смаленскага партызанскага палка Садчыкава, які дзейнічаў у Багушэўскім, Ветрынскім, Чашніцкім, Аршанскім, Сенненскім і іншым раёнах трохвугольніка Смаленск—Віцебск—Орша. За праяўлены гераізм М. Ягораў і М. Кантарыя ўганараваны званнем Героя Савецкага Саюза.

1940 год — група жыхароў Піцбурга (ЗША) аб'явіла прэмію ў 1 млн долараў таму, хто захопіць Гітлера жывым.

Цытата дня:

«Метафізіка — гэта калі той, хто слухае, нічога не разумее і той, хто гаворыць, разумее не больш».

Вальтэр (1694—1778), французскі пісьменнік і філосаф.

соль

Соль — даволі незвычайны прадукт у жыцці чалавека. Акрамя таго, што соль надае ежы пэўны смак, яна з'яўляецца абавязковым атрыбутам шматлікіх сямейна-родавых абрадаў і святаў, выкарыстоўваецца знахарамі. Паўсюдна лічыцца, што нячыстая сіла баіцца солі. У народнай культуры славян соль таксама выконвала ролю надзейнага абярэга.

- Перад пагорам хаты бацькі сустракалі маладых хлебам-соллю.
- Рытуальна прыгатаваная соль захоўвала хату ад няшчасцяў. Для дзіцяці шылі невялікі мяшэчак з чырвонай тканіны і засыпалі ў яго некалькі драбінак чацвярговай солі. Насіць такі абярэг неабходна было на грудзях.
- Хлеб-соль сімвалізавалі сяброўскія адносіны паміж людзьмі.
- Надзейным сродкам лячэння хатняй жывёлы лічылі невялікія жытнёвыя «калабкі», у якія абавязкова замешвалі чацвярговую соль.
- Прасыпаць соль — значыць нанесці сям'і пэўную страту, якая не можа не прывесці да сваркі.
- Каб «адвесці» бяду, трэба было некалькі драбінак солі кінуць праз левае плячо ці папрасіць кагосьці стукнуць вас па ілбе.

Было некалькі дзён, калі можна прыгатаваць рытуальную соль:

- Чысты чацвер (чацвер перад Вялікаднем). У гэты дзень соль асвячалі ў царкве ці «перапальвалі» ў печы.
- У дзень ушанавання святой Агаф'і ў цэрквах асвячалі хлеб з соллю, якія потым захоўвалі ў хаце як надзейны сродак ад пажару.

У пэўных сітуацыях неабходна было гатаваць ежу без солі:

- Не салілі хлеб, які гатавалі на жалобны стол ці ў дні ўшанавання продкаў на Дзяды.
- З надзеяй на дапамогу продкаў пяклі «праснакі» для хатняй жывёлы. На Раство разам з блінамі таксама пяклі «праснакі» і захоўвалі іх да Вадохрышча. Пасля таго, як «праснакі» асвячалі вадой, іх давалі з'есці хатняй жывёле.
- У тыя дні, калі «задобрывалі» дамавіка, яму рыхтавалі кашу без солі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Няма ніякіх сумненняў! Вас атруцілі!

— Божухна! Доктар! Як? Чым?

— Калі ласка, не хвалюйцеся! Мы ўсё высветлім на ўскрыцці!

☺

Самая бяспечная жывёліна на зямлі — гэта мужчына ў першыя пяць хвілін пасля добрага сэксу.

☺

Урок англійскай мовы. Настаўніца:

— Сідарэвіч, як будзе па-англійску «дзверы»?

— Dweary!

— Whas geta da!!!

☺

Анжаліна Джалі наадрэз адмовілася здымацца аголенай для «Экспрэс-газеты», што, у прынцыпе, ніяк не паўплывала на з'яўленне такіх яе фатаграфій у гэтым выданні.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2301. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12